№ 9 (415) 4 сакавіка 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



## На пытаньні «НН» адказваюць Уладзімер Колас і Алесь Мілінкевіч

«Беларусы павінны навучыцца мецьсваю ўладу».

старонка 12

## Нас Буш бачыў

Амэрыканскі прэзыдэнт прайшоўся па Беларусі.

старонка 2

З УСІХ СТАРОН

**Двайная гульня**

Чэскі афіцэр працаваў на беларускую разьведку. **Старонка 6.**

ПАЛІТЫКА

**Паход дзьвюма калёнамі азначае паразу**

Гутарка з палітолягам Аляксандрам Класкоўскім. **Старонка 2.**

З УСЁЙ КРАІНЫ

**Легендарная лазьня**

выстаўленая на продаж. **Старонка 8.**

МАСТАЦТВА

**Вэнэцыянскае люстэрка**

Яго называлі беларускім Сэзанам. Валянцін Калнін пра Міхала Сеўрука. **Старонка 18.**

ЛІТАРАТУРА

**Мабільныя вершы**

Андруся Храпавіцкага. **Старонка 20.**

**Запасайся на квартал**

Падпісныя індэксы «Нашай Нівы» 63125, часопісу «Arche» 00345, часопісу «Дзеяслоў» 74813. Прадукт сьвежы, беларускі. Дык падпісвайся на другі квартал!

**Пабачымся ў Воршы...**

**10 сакавіка** аршанскіх чытачоў і прыяцеляў «НН» чакаем а 19-й на вул.Савецкай, 23–39. Абяцаем песьні, скокі і брыкі. Прыедуць рэдактары «НН» і «Arche» Андрэй Дынько, Валер Булгакаў, паэт і бард Андрэй Хадановіч.

**...і Віцебску**

**11 сакавіка** гэтая хеўра пераедзе ў Віцебск, дзеля новых сьпеваў і адказаў на злабадзённыя пытаньні. Сустрэча а 19-й. Вул.Чарняхоўскага 12–17. У калячасьсі нас можна будзе спаткаць у розных пунктах паўночнага ўсходу краіны. Сачыце за абвесткамі на мясцовых стаўпах.

# Гусьлям, княжа, ня пішуць ліцэнзій

Разьвітальны канцэрт ліцэнзійнага «N.R.M.». **Старонка 4.**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Гуканьне Лукашэнкі

1 сакавіка 10 тысячаў мітынгоўцаў на вуліцах краіны. У выпадку невыкананьня вымог прадпрымальніцкія лідэры абяцаюць страйк і масавы мітынг на 25 Сакавіка. Арыштаваны Шумчанка, аштрафаваная Багдановіч, але пратэст не набыў палітычнага характару.

Як і абяцалася, прадпрымальнікі пачалі страйк 1 сакавіка. На Кастрычніцкай плошчы Менску сабралася каля шасьці тысяч прадстаўнікоў дробнага бізнэсу з рынкаў сталіцы і іншых беларускіх гарадоў. Прадпрымальнікі, што прыпынілі дзейнасьць і з гэтага дня перасталі выплачваць падаткі, патрабавалі сустрэчы з Лукашэнкам у ягонай рэзыдэнцыі.

Людзі выйшлі зь лёзунгамі «Далоў ПДВ!», «18% ПДВ. Можа, вам аддаць 100%?», «Не перашкаджайце спакойна працаваць!». Да Менску дабраліся прадстаўнікі Бабруйску, Барысава, Лепелю, Наваполацку, Полацку, Рагачова, Салігорску, Слуцку, Сьветлагорску. Натоўп выглядаў унушальна.

«Лукашэнка пасьлядоўна ажыцьцяўляе заяўленую раней палітыку: ён абяцаў, што пацісьне руку апошняму беларускаму прадпрымальніку, і ён да гэтага вядзе, — сказаў адзін з прадпрымальнікаў Юры. — Праблема ў нас ня столькі нават у тым, каб заплаціць грошы, колькі з тымі цяжкасьцямі, якімі абстаўляе працу індывідуальнага прадпрымальніка дзяржава.

ПДВ стаў апошняй кропляй. Дый увогуле, пры ўвядзеньні такога варыянту ПДВ страчваецца сэнс адзінага падатку, пры якім улік вядзецца ў адвольнай форме — хоць у «Excel», хоць на паперы. Цяпер жа дзейнасьць індывідуальнага прадпрымальніка фактычна прыраўноўваюць да дзейнасьці фірмы.

Працяг на старонцы 5.

## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

РАСЕЯ ЗГАДАЛА АБ ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА. З Масквы прыйшла вестка, якая можа азначаць перамену расейскай стратэгіі ў Беларусі. Упаўнаважаны ў правох чалавека Расеі Ўладзімер Лукін 24 лютага выказаўся за стварэньне пры ім Экспэртнае рады з удзелам прадстаўнікоў Расеі й Беларусі — паведамілі беларускія праваабаронцы. Яна разгледзела б магчымасьць узбуджэньня крымінальных справаў аб палітычна матываваных зьнікненьнях у Беларусі адпаведна з падставамі, якія даюць міждзяржаўныя пагадненьні Беларусі і Расеі. Стварыўшы такую экспэртную раду, Расея заявіць пра сваю юрысдыкцыю ў Беларусі. Трэба дачакаць разьвіцьця падзей, каб рабіць высновы наконт выпадковасьці гэтай заявы ці яе сувязі з сустрэчай у Брацілаве, вылучэньнем А.Казуліна і, шырэй, зьмены міжнароднага кантэксту вакол Беларусі.

ЗДРАДНІКІ РАДЗІМЫ. У ЗША свае інтарэсы, у Беларусі свае. Іншы раз яны разыходзяцца, іншы раз супадаюць. Чарговы раз пра гэта нагадала Брацілава. Выклікаюць іронію наіўныя падзякі амэрыканскаму народу за прыняцьце Акту пра дэмакратыю з вуснаў кагосьці з апазыцыі. Робіцца не да сьмеху, калі слухаеш цынічных апаратчыкаў, якія ператварылі бязглуздае баданьне з ЗША ў сэнс існаваньня беларускае дзяржавы і прыкрываюць ім прыватызацыю дзяржаўнай улады. Дзеяньні ЗША яны разглядаюць як неаб’яўленую вайну. Адпаведна, хто супраць Лукашэнкі — той здраднік радзімы. Інакш думаюць беларусы, якія віталі Бушавы пажаданьні свабоды Беларусі на плошчы Гвездаслава ў Брацілаве: наша змаганьне за мову і дэмакратыю не забытае найбуйнейшай дэмакратыяй плянэты. **Старонкі 2 і 9**.

СВОЙ СВАЙМУ. Талковыя парады па выбары дзіцячай мэблі прыдадуцца кожнай маладой сям’і. **Старонка 22**. Даслаў іх невядомы нам чытач. Дзякуй усім, хто піша ў сваю газэту.

# Камсамол падвядзе вынікі 25 Сакавіка

Моладзь выступіла зь дзьвюма канкрэтнымі ініцыятывамі па грамадзка значных пытаньнях.

Моладзевая ініцыятыва «Вока» распачала збор подпісаў з патрабаваньнем да ўладаў, каб на беларускіх тэлеканалах вяшчаньне вялося на 50% па-беларуску. Г.зн. каб улады выконвалі хаця б тыя законы, што самі напісвалі. Хоць і лічба ў 50% для Беларусі несправядлівая, бо ў нашых «блакітных экранах» расейскіх каналаў удвая болей, чым беларускіх. Але моладзь патрабуе рэальнага.

Каардынатар «Вока» Віталь Дабранач тлумачыць: каб далучыцца да іх, варта альбо самому запоўніць адпаведны блянк і паставіць подпіс, альбо зайсьці на іхні сайт tv.iatp.by і пераслаць электронны варыянт ліста, альбо накіраваць звычайны ліст у адвольнай форме непасрэдна на імя міністра інфармацыі Ўладзімера Русакевіча. Копіі сабраных лістоў будуць скіраваныя й на адрас старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Ўладзімера Мацьвейчука. На сёньня гэтакіх лістоў назьбіралася пад тысячу.

З размахам праводзіць сваю новую кампанію беларускі камсамол. Яна скіраваная супраць абавязковага разьмеркаваньня студэнтаў. Камсамольцы супольна зь іншымі арганізацыямі ўжо сабралі 10 тысяч подпісаў. На думку лідэра камсамольцаў Зьмітра Яненкі, гвалтоўнае разьмеркаваньне — перажытак рабства. Ён падкрэсьлівае, што такая практыка непасрэдна супярэчыць Канстытуцыі, дзе ўсім гарантаваная бясплатная адукацыя.

Падвядзеньне вынікаў кампаніі камсамольцы прызначылі на 25 Сакавіка.

Ініцыятывы моладзі маюць канкрэтную, адрасную скіраванасьць, а таму й чапляюць. Гэтая маладая генэрацыя і ёсьць праваобразам будучае грамадзянскае супольнасьці, якая ведае свае правы і можа бараніць іх.

**ГК**

Міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусі
Русакевічу Ўладзімеру Васілевічу
220004, г.Менск, пр.Машэрава, 11

Копія: Старшыню Нацыянальнай дзяржаўнай
тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусі
Мацьвейчуку Ўладзімеру Фёдаравічу,
220087, г.Менск, вул.Макаёнка, 9

Мы, грамадзяне Рэспублікі Беларусі, выказваем заклапочанасьць з нагоды скарачэньня тэлевізійнага вяшчаньня на дзяржаўнай беларускай мове. Зьвяртаемся з прапановай устанавіць для ўсіх беларускіх тэлеканалаў квоту на беларускамоўнае тэлевяшчаньне ў памеры ня менш за 50% ад агульнага часу вяшчаньня.

| № | Прозьвішча, імя | Адрас пражываньня | Дата | Подпіс |
|---|---|---|---|---|
| 1 | | | | |
| 2 | | | | |
| 3 | | | | |
| 5 | | | | |
| 6 | | | | |



AP

# Нас Буш бачыў

Дзень 24 лютага выдаўся халодны, ветраны, мокры сьнег сыпаўся на шапкі, каўняры ды валасы тых, хто неабачліва выйшаў з дому зь непакрытай галавой. Мы — невялікая купка беларусаў — ішлі ранішнімі брацілаўскімі вулачкамі паглядзець на выступ амэрыканскага прэзыдэнта, зь цікавасьцю назіраючы за славацкімі паліцыянтамі ў плястыкавых шлемах з паднятымі забраламі і празрыстымі шчытамі.

Першы шчыльны кардон паліцыянтаў аддзяляе шчасьлівых уладальнікаў «квіткоў на Буша» ад тых, у каго такіх няма, з боку Новага мосту, пры ўваходзе на бульвар перад Рэдутай — будынкам, дзе месьціцца філярмонія і дзе мае адбыцца сустрэча славакаў з амэрыканскім прэзыдэнтам. Мы маем такія квіткі і безь перашкод праходзім кардон №1. Кардон №2 — празь якія 20—30 мэтраў — **быў ужо справай больш сур’ёзнай: тузін**

Працяг на старонцы 10.

# Паход дзьвюма калёнамі азначае паразу

Трэба адрозьніваць дзьве рэчы: у дэмакратычнай апазыцыі ёсьць тактычная задача замяшчэньня ўлады і стратэгічная задача пабудовы незалежнай Беларусі. Дэмакратычны кандыдат мае найперш заваяваць электаральнае балота, мяркуе палітоляг **Аляксандар Класкоўскі**.

**«НН»: Мы сталі сьведкамі выяўленьня актыўнасьці такой арганізаванай супольнасьці, як прадпрымальнікі. Наколькі імавернае яе ператварэньне ў палітычную сілу?**

**Аляксандар Класкоўскі:** Пакуль у мяне ўражаньне, што ў палітычным сэнсе прадпрымальнікі яшчэ ня высьпелі. Выглядае на тое, што страйк можа захлынуцца. Ужо сёньня ёсьць сымптомы, што ўлада раскалола і прыдушыла гэты пратэст. Збольшага лідэры прадпрымальнікаў заўжды дыстанцыяваліся ад «чыстай палітыкі». Яны думалі, што робяць вельмі абачліва, але цяпер апынуліся ў пэўнай ізаляцыі. На гэты цягнік яны не пасьпелі і могуць быць раздушаны як кляса. Увогуле ж прадпрымальнікі ня могуць існаваць ва ўмовах сёньняшняй эканамічнай ідэалёгіі. Калі складзецца рэвалюцыйная сытуацыя, усе схаваныя, раздробненыя, запалоханыя сілы, якія па сваёй унутранай сутнасьці ня могуць усприймаць сёньняшнюю ўладу, здольныя стрэліць аднначасова, што можа мець моцны кумулятыўны эфэкт.

**«НН»: І гэта зробіць магчымай зьмену ўлады цывілізаваным шляхам?**

**АК:** Самае горшае, што выбарчая машына, створаная у Беларусі, здольная даць такі вынік, які патрэбны ўладзе. У кантэксьце шанцаў на выйгрыш апазыцыйнага кандыдата трэба казаць пра спалучэньне электаральных і вулічных мэтадаў барацьбы, як гэта было ва Ўкраіне.

Працяг на старонцы 4.

# Вэнэцыянскае люстэрка

Яго называлі беларускім Сэзанам. Ён быў самым заходнім зь беларускіх мастакоў. Ён да скону жыў у Нясьвіжы, так і не пераехаўшы ў Менск. «Калі адбылася рэвалюцыя, — расказваў Сеўрук, — моладзь у мастацкіх вучэльнях пачала скідаць алебастравыя фігуры антычных і клясычных узораў у шырокі пралёт лесьвіц. Ляціць такая бялюткая Вэнэра — бум! — і выкрыкі: «Канец старому мастацтву!» Сьведка стагодзьдзя войнаў і падзелаў. Мастак-канфарміст і мастак-рамантык. Клясык беларускага мастацтва. Эсэ **Валянціна Калніна** з нагоды 100-годзьдзя **Міхала Сеўрука**.

Неяк у майстэрні М.Сеўрука мы зладзілі экспэрымэнт — разгарнулі яго працы за шмат гадоў і я пачаў на вока вызначаць даты іх стварэньня. З дакладнасьцю ±5 гадоў памылак не было, чым я моцна зьдзівіў аўтара.

Пазьней я спрабаваў асэнсаваць вынікі экспэрымэнту. З аднаго боку выходзіла, што мастак ня здолеў адшукаць уласнае манеры, паглыбляючыся ў модныя на той ці іншы час плыні. Узьнікала нават крамольная думка пра канфармізм мастака. З другога боку, экспэрымэнт мог даводзіць, што творца не спыняўся на дасягнутым, а быў у сталым пошуку.

Дайшоўшы да гэтакіх разваг, я вырашыў, што ня варта адбіраць хлеб у мастацтвазнаўцаў, а лепш казаць толькі пра тое, што сам чуў і бачыў. Пра мастацтва мы зь Сеўрукам размаўлялі мала. Мяне, як пачынаючага архітэктара-рэстаўратара, цікавілі маладыя гады мастака, пражытыя ў Вільні, атмасфэра старога места і перадваеннага часу.

## На захад, усьлед за чырвонымі

Пра дзіцячыя гады мастак гаварыў няшмат. Нарадзіўся 27 лютага 1905 г. у Варшаве ў сям’і чыгуначніка, потым было Берасьце. Род Сеўрукаў паходзіць зь вёскі Мірацічы, што над Сьвіцязьзю. Гэта ад Баранавіч 45 км.

У 1915 г. перад наступам немцаў сям’я эвакуявалася зь Берасьця ў Маскву. Тут і адбыліся першыя сьвядомыя крокі хлопца ў мастацтве.

Сп.Міхал паказвае мэталічныя тронкі ў выглядзе трубачкі з падоўжанымі прарэзамі і перасоўным колцам.

Працяг на старонцы 18.

# Беларусізацыя «Euronews»

Найбуйнейшы эўрапейскі тэлеканал навін плянуе экспансію на ўсход. Намер «Euronews» распачаць вяшчаньне па-беларуску — самы рэалістычны праект з усіх, якія дагэтуль прапаноўвалі беларусам.


ЮЛЯ ДАРАШКЕВІЧ

Украінская рэвалюцыя паказала: для таго каб дамагчыся зьмен, кроў з носу патрэбны незалежныя электронныя мэдыі. У кіраўнічых структурах ЭЗ ды заходніх фондах распачалася дыскусія на тэму адкрыцьця замежнага вяшчаньня на Беларусь.

Чаго толькі ні прапануюць: і вэб-парталы, і новыя радыёстанцыі, і нават спадарожнікавы тэлеканал накшталт такога, які маюць курды. Аднак дагэтуль усе пляны загразаюць у абмеркаваньні каштарысу, нібы воз у балоце. Таму намер «Euronews» распачаць вяшчаньне па-беларуску — сапраўдная сэнсацыя. Гэта самы рэалістычны праект з тых, якія дагэтуль прапаноўвалі беларусам.

Калі ЭЗ паставіў задачу наладзіць вяшчаньне на Беларусь, першае, што прыйшло ў галаву эўрачыноўнікам, — стварэньне новай караткахвалевай радыёстанцыі, клону радыё «Свабода» з праэўрапейскім ухілам у рэдакцыйнай палітыцы. Але людзі, якія стала ловяць перадачы на кароткіх хвалях, займелі гэтую звычку яшчэ за савецкім часам, слухаючы «галасы». Ствараць для іх новую радыёстанцыю — што дасылаць каталіцкага прапаведніка ў Ватыкан. Таму размовы пра караткахвалевую радыёстанцыю папрыціхлі, а найбольш акрэсьленую форму набылі пляны стварэньня на тэрыторыі Польшчы беларускамоўнай FM-станцыі «Пагоня». Гэты праект ужо праходзіць фінансавае абгрунтаваньне ў Эўракамісіі.

## Грошы за беларускасьць

Усё часьцей чуваць і такое меркаваньне: а ці варта выдумляць нанава ровар, калі можна выкарыстаць наяўныя мэдыйныя магчымасьці? Тыдзень таму нямецкі фонд К.Адэнаўэра заявіў, што неабходна пачаць беларускае вяшчаньне на радыёстанцыі «Deutsche Welle». Адпаведны праект ужо падрыхтаваны і будзе вынесены на разгляд улетку. І праўда: чым укладаць мільёны эўра ў новае абсталяваньне, набыцьцё ліцэнзіі на частату, ці не прасьцей стварыць беларускія аддзелы ў добра «раскручаных» міжнародных мас-мэдыя? Дзівіць толькі, чаму гэтага не зрабілі раней.

Намер беларусізаваць «Euronews» грунтуецца ня толькі на гэткіх самых разважаньнях. Унікальнасьць сытуацыі ў тым, што беларуская мова разглядаецца тэлеканалам як важны бізнэс-рэсурс, сродак больш дакладнага пазыцыяваньня «Euronews» у рэгіёне.

У сваім інтэрвію інтэрнэт-парталу «Expatica» дырэктар «Euronews» Філіп Кайля пахваліўся тым, што справы ў тэлеканалу ідуць няблага. «2005 год будзе годам прыходу новых акцыянэраў, пашырэньня сэрвісаў на ўсход і на новыя сэгмэнты мэдыя-рынку», — заявіў спадар Кайля. Праграмы «Euronews» можна глядзець на сямі мовах — ангельскай, гішпанскай, італьянскай, нямецкай, партугальскай, расейскай ды францускай. Цяпер кіраўніцтва тэлеканалу актыўна абмяркоўвае пляны распачаць вяшчаньне на баўгарскай, беларускай, турэцкай ды украінскай мовах. «Euronews» ужо вядзе адпаведныя перамовы з Эўразьвязам і Эўрапейскім касьмічным агенцтвам, адказным за спадарожнікі сувязі.

Як дасьведчаны топ-мэнэджэр, Філіп Кайля ня можа не адчуваць, што ў ЭЗ складваецца прабеларуская каньюнктура. Эўразьвяз гатовы ўкласьці ў вяшчаньне на Беларусь немалыя грошы, але атрымае іх той, хто зробіць найлепшую прапанову. Цягацца з «Euronews» тут будзе цяжка. Тэлеканал здольны прапанаваць цалкам рэальны бізнэс-плян, які прыйдзецца эўрачыноўнікам нашмат больш даспадобы за напаўфантастычныя пражэкты па адкрыцьці новага тэлеканалу.

Але «Euronews» здужае беларускамоўнае вяшчаньне і без дадатковых інвэстыцый. Заснаваны 12 гадоў таму, ён ужо зрабіўся самым папулярным эўрапейскім тэлеканалам навін. Штодзень яго глядзяць больш за восем мільёнаў чалавек у 82 краінах. Пасьля чатырохгадовага крызісу летась «Euronews» упершыню прынёс прыбытак.

## За два крокі ад тэлеканалу

Для таго каб наладзіць беларускамоўнае вяшчаньне на «Euronews», спатрэбіцца запрасіць у францускі Ліён, дзе месьціцца штаб-кватэра тэлеканалу, ня больш за тузін журналістаў. Яны будуць ствараць беларускамоўныя выпускі навін — пісаць тэксты, начытваць іх і рабіць адпаведны мантаж тэлевідарысу, карыстаючыся «сырымі» відэаматэрыяламі, атрыманымі са спадарожніка праз сыстэму «Эўрабачаньня» ад тэлекарэспандэнтаў па ўсім сьвеце (так, дарэчы, ствараюцца міжнародныя тэленавіны на БТ). У выніку мы будзем мець беларускамоўны варыянт «Euronews»: войны-катаклізмы-катастрофы плюс навіны ЭЗ.

На другім этапе ў нашай краіне можа распачаць працу тэлеапэратар «Euronews», які будзе дасылаць свае відэаматэрыялы ў Ліён, дзе яны будуць апрацоўвацца ды выкарыстоўвацца для стварэньня мясцовых навін і тэлеперадач, цікавых, найперш, беларускаму гледачу.

Зьяўленьне незалежнага беларускамоўнага тэлеканалу можа зрабіцца тым электрашокам, які дапаможа вывесьці з комы беларускае грамадзтва. Цяжка ўявіць, што сучасныя беларусы зьбяруцца на кватэры паслухаць далёкія «галасы» зь сіпячага радыёпрыёмніка. А вось паглядзець цікавую ды праўдзівую тэлепраграму пра наша жыцьцё-быцьцё па тэлевізары ў сябра, у якога «ловіцца» «Euronews», — гэта можна. Хто-ніхто яшчэ і папросіць запісаць перадачу на «відзік», возьме паглядзець касэту ды знаёмым перадасьць.

Летась «Euronews» быў атакаваны лістамі зь Беларусі з патрабаваньнем прыбраць з мапы надвор’я кірылічную транскрыпцыю назвы Менск — у адрозьненьне ад Кіева ці Вільні, назва сталіцы Беларусі падавалася ў ангельскай і расейскай транскрыпцыях, гэтак жа як і Масква. Неўзабаве ўсе надпісы на мэтэаралягічнай мапе замянілі на паліткарэктна-лацінкавыя. Намер «Euronews» распачаць вяшчаньне на беларускай мове варты яшчэ адной народнай кампаніі, праўда, ня крытыкі — а падтрымкі.

**Алесь Кудрыцкі**

Пажаданьні і меркаваньні адносна адкрыцьця беларускамоўнага вяшчаньня на «Euronews» можна дасылаць па наступным адрасе (пішэце па-ангельску і па-француску):

EuroNews Press Office
60, chemin des Mouilles, BP 131,
F-69131 Lyon-Ecully, France
Lydie Bonvallet, tel.: +33 4 7218 8056
bonvallet@euronews.net

СЬЦІСЛА

### Вясна з халадамі

Вясна прыйшла з халадамі: маразы на францускай Рыўеры, у Барсэлёне ўпершыню за 20 гадоў выпаў сьнег. Мерзнуць нават беларусы ў Таронта, уначы там мінус 12. У Беларусі — халадней. У ноч на 2 сакавіка месцамі слупок тэрмомэтра сягаў 25 градусаў, удзень у сераду ў Менску было –9. Год таму ў сталіцы было мінус адзін. Паводле назіраньняў мэтэаролягаў, гэта самы халодны пачатак вясны за 20 гадоў, з 1987-га. Мэдыкі з наступленьнем вясны большую небясьпеку бачаць у зьмене пораў году, калі арганізм падвяргаецца стрэсу, а чалавек адчувае апатыю і становіцца больш раздражняльным. Таму, нягледзячы на надвор’е за акном, трэба штучна ствараць сабе вясновы настрой.

### Затрыманыя забойцы Гангадзэ

Генэральны пракурор Украіны Сьвятаслаў Піскун абвесьціў у сераду пра затрыманьне двух непасрэдных выканаўцаў забойства журналіста Георгія Гангадзэ. Сьледзтва мае пэўнасьць, што яны дзейнічалі сьвядома. Трэці абвінавачаны, былы кіраўнік Службы замежнае выведкі, абвешчаны ў міжнародны вышук. Тым часам не пацьвердзілася аўторкавая інфармацыя пра тое, што была знойдзена галава журналіста. Назіральнікі выказваюць меркаваньні, што па гэтай справе можа быць арыштаваны экс-прэзыдэнт краіны Леанід Кучма.

### Фарс у Горадні

Вярхоўны суд не задаволіў скаргі незарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты палаты прадстаўнікоў па Гарадзенскай Цэнтральнай выбарчай акрузе №52 Яраслава Раманчука і Сяргея Скрабца. «Гродзенская праўда» адмовілася друкаваць перадвыбарчую праграму генэрала Валера Фралова. Прадстаўнікі спэцслужбаў сканфіскавалі тыраж постэраў Сяргея Антусевіча. У такой атмасфэры ўлады прапіхваюць угоднага сабе кандыдата.

### Ад Паганяйлы адчапіліся

Крымінальная справа супраць намесьніка старшыні БХК Гары Паганяйлы за паклёп на прэзыдэнта спыненая 28 лютага за адсутнасьцю складу злачынства.

### Мінінфармацыі вучыць «любіць беларускае»

Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджаньне тром FM-станцыям, якія не напаўняюць этэр 75% беларускай музыкі, — «Альфа Радыё», «Радыё Рокс» і «Пілёт ФМ». У студзені аналягічныя папярэджаньні атрымалі «Гіт FM», «Новае радыё» і «Юністар».

### Труса лавілі ўсім горадам

У Барнауле (Алтайскі край, Расея) учынена дзёрзкае злачынства. Невядомы на вуліцы напаў на жанчыну, што несла ў руках дэкаратыўнага труса, скраў зьвярка і на аўтамабілі «Таёта» зьнік зь месца злачынства. Жанчына неадкладна зьвярнулася ў міліцыю, арыенціроўку перадалі на ўсе пасты міліцыі і праз паўгадзіны зламысьнік быў злоўлены. Жывёлінку жывую і здаровую вярнулі гаспадыні.

**АГ, svaboda.org, afn.by**

# Паход дзьвюма калёнамі азначае паразу

Працяг са старонкі 2.

Калі праз год захаваецца стабільнасьць у эканоміцы, палітыцы, Лукашэнка мае стоадсотквыя шанцы. Да іншага выніку можа прывесьці ўзьдзеяньне чыньнікаў, якія разварушаць электаральнае балота. І гэта можа адбыцца даволі хутка, бо так званая беларуская мадэль — калёс на гліняных нагах. Варта абваліцца цэнам на нафту…

«Жалезнага» дэмакратычнага кандыдата пакуль што не відаць. Можна параўноўваць шанцы, напрыклад, Казуліна і Лябедзькі, але гэта будзе гаворка пра адносныя шанцы.

**«НН»: Калі цяпер няма яркай фігуры, што рабіць? Ствараць яе, шукаць?**

**АК:** Мэханізм вылучэньня адзінага кандыдата, які выпрацавала «дзясятка», сам па сабе не дае гарантыі, што выбар спыніцца на аптымальнай фігуры. Цяпер вось пайшоў шэраг вылучэньняў партыйных лідэраў. Спадзяюся, яны разумеюць сымбалічнасьць гэтага дзеяньня. У кандыдатаў-партыйцаў ёсьць пэўны «паталок» рэйтынгу. Важна разумець — сталы апазыцыйны электарат складае толькі ад 15 да 30% насельніцтва. Пад 50 адсоткаў — гэта так званае электаральнае балота. Каб прыцягнуць большую яго частку на свой бок, патрэбен кандыдат, які не асацыюецца з усім апазыцыйным нэгатывам.


АРЦЕМ ЛЯВА

**«НН»: Якую ролю ў прасоўваньні кандыдата можа адыграць ягоная прарасейскасьць ці праэўрапейскасьць?**

**АК:** Ідэальны кандыдат той, хто будзе спавядаць нацыянальныя прынцыпы і разам з тым у дачыненьні да Расеі здолее быць дыпляматам. Масква мае тут свае інтарэсы і здольная задзейнічаць рэсурсы, якія могуць працаваць альбо на карысць адзінага кандыдата, альбо супраць яго. Расеі ўсюды мроіцца нацыяналізм. Для маскоўскай кіруючай эліты гэтыя фобіі маюць сур'ёзнае значэньне. Трэба адрозьніваць дзьве рэчы: у дэмакратычнай апазыцыі ёсьць тактычная задача замяшчэньня ўлады і стратэгічная задача пабудовы незалежнай Беларусі.

З другога боку, пераацэньваць расейскі чыньнік ня варта, што паказаў досьвед Украіны. Гэта паказваюць і паводзіны беларускага прэзыдэнта ў дачыненьні да Масквы, здавалася б, недаравальныя. Пры ўсіх імпэрскіх амбіцыях у Расеі недастаткова рычагоў уплыву.

**«НН»: Што будзе адыгрываць у нашых умовах больш значэньня — асабістыя якасьці палітыка ці ягоная каманда і праграма?**

**АК:** Павінна быць гарманічнае спалучэньне ўсіх гэтых складнікаў.

Значная частка нашай нацыянальнай публікі пакутуе на палітычны рамантызм: вось выйдзе сьветлы рыцар беларушчыны і зваліць таго, хто ўвасабляе цёмныя сілы існуючага рэжыму. Малюнак нерэалістычны, такія летуценьні вядуць хіба ў культурную рэзэрвацыю. Першачарговая канкрэтная задача — гэта, кажучы мовай паліталёгіі, замяшчэньне ўлады. Да яе вырашэньня варта падыходзіць больш прагматычна, больш тэхналягічна нават.

Ва ўмовах недаступнасьці СМІ ўзрастае роля каманды, якая праз улёткі, «ад дзьвярэй да дзьвярэй» будзе даносіць да суграмадзян ідэі кандыдата. Важна знайсьці залатую сярэдзіну паміж ідэаламі палітыка і прывабнымі для публікі тэзамі.

**«НН»: Як ахарактарызуеце ўваходжаньне ў палітыку А.Казуліна?**

**АК:** З аднаго боку, ён зрабіў фурор і сваімі дзеяньнямі нават выклікаў Лукашэнку на палеміку падчас выступу на нарадзе ў справе барацьбы з карупцыяй. Вылучэньне былога намэнклятуршчыка ўстрывожыла беларускага прэзыдэнта значна болей, чым вылучэньне кандыдатаў ад партый. Гэта сьведчаньне таго, што «нэўтральны» кандыдат выглядае больш прывабна для масавага выбарца і небясьпечна для ўлады. Рэч у тым, што без альянсу з партыямі ня будзе падтрымкі іх структур. А пры супрацоўніцтве зь імі непазьбежнае сутыкненьне з усёю моцай чорнага антыпартыйнага піяру афіцыйнай прапаганды.

**«НН»: Ці ня ставіцца «Воляй народу» крыж на праекце вылучэньня адзінага кандыдата супраць Лукашэнкі? Ці магчыма паразуменьне паміж незалежным грамадзтвам і рухам «Воля народу»? Вылучэньне адзінага ад дэмакратаў кандыдата ідзе паводле пэўнай схемы, а Казулін пазыцыянуе сябе як кандыдат ужо цяпер.**

**АК:** Могуць і не паразумецца. Паход на выбары дзьвюма калёнамі апрыёры азначае паразу. Патрэбны адзіны кандыдат, вакол якога будуць аб'яднаны ўсе апазыцыйныя рэсурсы і, шырэй, усе надзеі дэмакратычнай часткі грамадзтва.

**Гутарыў Арцём Лява**

# БНРМ

Эпоха патрабуе іх. Чуткі пра сьмерць рок-музыкі перабольшаныя.

## ВІТАЛЬ ТАРАС

Хтосьці слушна заўважыў: «Пасьля трыццаці з музыкай нешта адбываецца». Маецца на ўвазе, зразумела, рок-музыка. Але ж і пасьля трыццаці з табой часам можа адбывацца нешта, з-за чаго «стары добры рок» зноў гучыць гэтаксама, як у маладосьці.

Пры канцы лютага гурт «N.R.M.» даў разьвітальны канцэрт у менскім начным клюбе «Рэактар». Паколькі я ўжо шмат гадоў ня быў на канцэртах і ўвогуле не хаджу ў клюбы, мне было ўсё адно, дзе будзе адбывацца імпрэза. Але мае знаёмыя, значна маладзейшыя й больш дасьведчаныя за мяне, зьдзівіліся і нават крыху напалохаліся: «Рэактар»? Гэта ж небясьпечнае месца! Там бываюць крымінальнікі».

Сам факт выступу там «N.R.M.» іх чамусьці не зьдзівіў.

Праўда, пра тое, што канцэрт разьвітальны, нідзе абвешчана не было. Проста ў гурту скончылася так званая ліцэнзія на гастрольна-канцэртавую дзейнасьць. Было б дзіўна, калі б улады, вяртаючыся да колішняй савецкай практыкі, забаранялі штосьці галосна і адкрыта. Фактычна, тое была нізкая й дробная помста за тое, што «N.R.M.» і яшчэ некалькі беларускіх гуртоў і музыкаў узялі летась удзел у канцэрце падчас


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

мітынгу апазыцыі на плошчы Бангалор у Менску.

Але ж я не пра палітыку. Я пра музыку.

Танц-заля ў «Рэактары» была запоўненая моладзьдзю цалкам, і нават на бальконе, дзе кветкі даражэйшыя, вольных месцаў не засталося. Ня думаю, што на дыскатэках ды ў іншых публічных месцах зараз часта можна пачуць, як моладзь скандуе: «Жыве Беларусь!» Скандавалі ў той вечар і іншыя лёзунгі. Але, памятаючы пра помсьлівасьць цяперашняй улады, пашкадую кіраўніцтва начнога клюбу.

Зноў жа, я не пра палітыку. Я пра музыку. Пра рок-музыку без палітыкі? Што ж, напэўна, і такое магчыма. Але спачатку трэба ўзяць, хіба, тое пад увагу, што паняцьце «музыка пратэсту», якое ўжывалася савецкай прапагандай у 1960—1970-я гады мінулага стагодзьдзя ў якасьці эўфэмізму рок-музыкі, ад самага пачатку было паняцьцем абсурдным. Бо прысутнасьць «пратэсту» вызначалася паводле тэкстаў песень заходніх выканаўцаў. Калі ў іх асуджалася вайна ў Віетнаме, напрыклад, ці капіталізм — значыць, песьню можна было дазволіць. Альбо лепш — перакласьці й дазволіць яе выкананьне якім-небудзь ВІА з эстрады на расейскай мове, што было самым трапным спосабам забіць песьню.

Вузка-тэматычны падыход часам падводзіў цэнзараў. Сёньня якая-небудзь Джаан Баэз сьпявае пра мір, а заўтра — пра свабоду каханьня! Ці якая-небудзь рок-зорка скажа нешта ў якім-небудзь інтэрвію пра дысыдэнтаў у Савецкім Саюзе, і ўсё — бывайце, кружэлкі фірмы «Мэлёдыя» з запісамі (зразумела, пірацкімі) гітоў гэтай самай зоркі! Праўда, былі ж яшчэ бабінныя магнітафоны. Але гэта зусім ужо асобная гісторыя.

Шчыра кажучы, пераважную частку тагачасных падлеткаў і юнакоў мала цікавілі тэксты, бо ангельскую мову ведалі з нас адзінкі. Проста ўсім сваім ладам, гучаньнем, манерай выканаўцаў ды проста нейкай агульнай аўрай рок быў сам па сабе пратэстам. І, што парадаксальна, патрапіўшы з Захаду на Ўсход, ён ня толькі не губляў сваёй «пратэставасьці», але толькі набываў яе яшчэ больш. Бо справа была ня толькі ў забароне ўладаў, ня толькі ў канфлікце дзяцей і бацькоў і жаданьні вырвацца з-пад апекі. Справа ў тым, што пазбаўлены, на першы погляд, сэнсу з-за неразуменьня словаў большасьцю слухачоў, рок рабіўся свайго роду квінтэсэнцыяй вольнасьці, непакорлівасьці, бунтарства. Гэтыя якасьці перадаваліся не праз словы, а непасрэдна, праз рытм — у сэрцы.

Але потым здарылася яшчэ адна парадаксальная рэч. З рокам, які загучаў па-расейску, адразу адбылася нейкая дэвальвацыя. Напэўна, з мной ніколі не пагодзяцца прыхільнікі гурту «Акварыюм» ці, тым больш, геніяльнага трагічнага прарока Віктара Цоя. Але я кажу цяпер пра беларускую сытуацыю.

Расейскамоўны рок міжволі стаўся для беларускай моладзі нейкім часовым замяняльнікам, сурагатам свайго, айчыннага року — такога року, напрыклад, які выконваў легендарны чэскі гурт «Plastic Peoples of the Universe». Гісторыя сучаснага року ведае няшмат выпадкаў, калі музыкаў камуністы саджалі за іхныя песьні ў турму. Так было ў ЧССР, і прэзыдэнт Чэхіі, былы дысыдэнт Вацлаў Гавал прызнаўся пазьней, што маральны прыклад «Пластык піпл...» адыграў вырашальную ролю ў ягоным далейшым жыцьці...

Адных «Песьняроў» з геніяльным самародкам Мулявіным на чале было недастакова на пераломным для беларускае нацыі этапе. Усё-ткі «Песьняры», ня кажучы ўжо пра іншыя «беларускамоўныя» ВІА, ад самага пачатку і вельмі доўга былі ўбудаваныя ў сыстэму савецкага істэблішмэнту й савецкіх каштоўнасьцяў. Гэты факт не прыніжае тых «Песьняроў», што сталіся легендай «савецкага року». (Само словазлучэньне гучыць амаль што анэкдатычна, але такі рок быў!) Адно не перастаю зьдзіўляцца — наколькі жывучай выявілася тая мадэль, што ўвесь час нараджае новыя клоны аднаго гурту.

Такім чынам, эпоха запатрабавала іх — і яны выйшлі на беларускую сцэну, рок-каралі і рок-князёўны. Я не пішу мастацтвазнаўчага артыкулу, і таму ня буду тут называць аніякіх імёнаў. Кожны можа назваць сваіх улюбёных музыкаў. Я назваў на самым пачатку толькі адзін гурт, безь якога, лічу, немагчыма ўявіць сучасны беларускі рок. І ня толькі я адзін. Значна важней, што некалькі дзясяткаў, ці сотняў, ці тысячаў хлопцаў і дзяўчат ужо ня могуць жыць без Незалежнай Рэспублікі Мроі. Частка гэтых людзей апантана засьведчыла гэты факт у «Рэактары» 22 лютага.

Ці было гэта разьвітаньне з рокам? Дазволю сабе ўсумніцца. Па-першае, «N.R.M.», я ўпэўнены, нікуды ня зьнікне — прынамсі, надоўга. Па-другое, і гэта яшчэ больш важна — паслухайце адну менскую ФМ-станцыю, і вы вельмі хутка пераканаецеся, як шмат стала таленавітых беларускіх рок-гуртоў і музыкаў за апошні час, як далёка сягнуў айчынны рок і ў пляне майстэрства і ў пляне зьместу. Я наўмысна не называю станцыі, бо рэкляма ёй зусім непатрэбная. Хаця б таму, што разьвіцьцё беларускага року зусім не ўваходзіць у пляны тых, хто ўвёў на ўсіх радыёстанцыях «залатое правіла» 75:25. У пляны начальства ўваходзіць, каб на ўсіх хвалях гучала 25 працэнтаў расейскай папсы і 75 — «беларускай». На вялікі жаль, тут нельга ўжыць нават слова «беларускамоўная». Бо сутнасьць тут — у самых адсоткавых суадносінах паміж гэткай музыкай і гэткай. Інакш кажучы, размова ідзе аб кантролі ідэалягічнага начальства за тым, колькі і якой музыкі павінна гучаць у этэры. Гэта мы ўжо праходзілі. І гэта ніколі не давала плёну. Музыка існавала і будзе існаваць не для начальства, а для тых, каму яна найбольш патрэбная — гэта значыць, для тых, каму сёньня яшчэ няма трыццаці.

Рок-н-рол хутчэй жывы, чымся мёртвы! Жыве БНРМ!

# Гуканьне Лукашэнкі

Працяг са старонкі 1.

Калі мы пачыналі сваю дзейнасьць, то матывавалі тым, што нам будзе працаваць ня так цяжка, аднак выходзіць усё наадварот».

Большасьць з тых, хто сабраўся, відавочна чакалі рашучых дзеньняў, але кіраўнік РГА «Пэрспэктыва» Анатоль Шумчанка адразу паведаміў прысутным, што «наша мэта — не рэвалюцыі і паўстаньні». «Мы — мірныя людзі. Мы прыйшлі да Аляксандра Лукашэнкі як да гаранта Канстытуцыі, каб ён абараніў нашы правы… Аляксандар Рыгоравіч, мы — вашы людзі, і мы прыйшлі да вас зь мірам», — пракрычаў у мэгафон сп.Шумчанка, пасьля чаго заклікаў прадпрымальнікаў, «каб тут не было ніякіх сьцягоў, ніякіх лёзунгаў антыканстытуцыйных каб не было; я папрашу саміх прадпрымальнікаў правакатараў выяўляць, здаваць у міліцыю». «Лу-ка-шэн-ка!», — на прапанову аратара пачаў скандаваць натоўп.

Перад прысутнымі на пляцы выступілі Ўладзімер Колас і Мікола Статкевіч, але паколькі сп.Шумчанка папрасіў палітыкаў выступаць «без палітыкі», тыя вымушаны былі абцякальна пажадаць грамадзе перамогі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Празь нейкі час да прадпрымальнікаў прыехаў віцэ-прэм’ер ураду Аляксандар Кабякоў. Паводле ягоных слоў, ён зрабіў гэта «па даручэньні прэзыдэнта, які папрасіў высьвяліць сытуацыю, у чым прычына праявы вашага нездавальненьня». «Вялікі дзякуй за магчымасьць перад вамі выступіць. Я надзвычай рады такой магчымасьці», — пачаў Кабякоў, пасьля чаго яшчэ раз паведаміў прысутным, што ПДВ адмяняць ніхто ня будзе. Віцэ-прэм’ер падзякаваў прадпрымальнікам за тое, што «ўчора вечарам і нават сёньня раніцай вы выканалі свой грамадзянскі абавязак і заплацілі адзіны падатак». На гэтую заяву натоўп выбухнуў: «Хлусьня!»

У выніку Кабякоў прапанаваў прадпрымальнікам два варыянты вырашэньня праблемы, якія гатовы абмяркоўваць зь імі ўрад. Першы — размаўляць «паводле мэханізму выплаты падатку» («Далоў ПДВ!» — закрычалі людзі). Другі варыянт — «разам стварыць аптовыя структуры, якія будуць вазіць тавар з Расеі: мы дамо аптовыя базы, дзе вы зможаце афармляць тавар». Прадпрымальнікі пачалі скандаваць «У адстаўку!», пасьля чаго Кабякоў зьехаў.

Потым, паведаміўшы прысутным, што сустрэча скончана і што ніхто не павінен хадзіць да будынку Адміністрацыі прэзыдэнта, зь мітынгу зьехаў і Анатоль Шумчанка, пераапрануўшыся, як потым казалі, у чужую куртку, каб пазьбегнуць затрыманьня.

Калі кіраўнікі «Пэрспэктывы» зьехалі і ніхто ўжо не баяўся, што яго як правакатара здадуць міліцыі, пад паўтары тысячы прадпрымальнікаў рушылі ў бок рэзыдэнцыі, якую апэратыўна перакрылі шэрагі АМАПу й міліцыі. Прадпрымальнікі, не разбэшчаныя раней такімі відовішчамі, паспрабавалі прарваць кардоны. Завязалася невялікая сутычка, але ў выніку дробных бізнэсоўцаў адціснулі з тэрыторыі сквэру.

2 сакавіка на Кастрычніцкай плошчы сталіцы а 12-й сабралася толькі 300 чалавек. Прадстаўнікі «Пэрспэктывы» ўдзелу ў акцыі не бралі. Акцыя трывала сорак хвілінаў, пасьля чаго амонаўцы высьцеснілі маніфэстантаў з пляцу. У гэты дзень прайшлі суды. Заблякаваны ў аўтамабілі невядомымі напярэдадні ва Ўручы Шумчанка атрымаў 10 сутак арышту, М.Багдановіч — 200 базавых велічыняў штрафу (4 млн 800 тыс. руб.).

Крыху аптымістычней было ў Горадні, дзе на Плошчы Леніна зноў сабралася больш за паўтары тысячы гандляроў. Да прысутных выйшаў намесьнік старшыні гарвыканкаму Аляксандар Сіўцоў, прапанаваўшы прадпрымальнікам вылучыць прадстаўнікоў, каб правесьці перамовы ў больш зручных умовах. Прадпрымальнікі адмовіліся, слушна спаслаўшыся на досьвед В.Леванеўскага, А.Васільева і З.Іваноўскага. Затым яны перайшлі да будынку аблвыканкаму і ўзялі яго ў аблогу. Перамовы з намесьнікам старшыні аблвыканкаму Аляксандрам Радзевічам не далі плёну. Каля другой гадзіны «прыватнікі», выпусьціўшы пару на марозным паветры, разышліся.

Прадпрымальнікі ўзялі таймаўт, паставіўшы ўладам ультыматум. Да 4 сакавіка Лукашэнка мае распачаць перамовы, а да 20 сакавіка вызваліць іх ад уплаты ПДВ. У адваротным выпадку гандляры прысягнулі, што яны, іхныя сваякі і знаёмыя выйдуць 25 Сакавіка, у Дзень Волі, на Кастрычніцкую плошчу. На гадавіну абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі адбываюцца традыцыйныя акцыі пратэсту. Сёлета акцыя абяцае быць шматлюднай.

**Аляксей Шэін**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**НА ДРУГІ ТЭРМІН. Анатоля Шумчанку другі раз за месяц пасадзілі на 10 сутак.**

**«АСОБНЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ прыйшлі на Кастрычніцкую плошчу», — паведаміў Аляксандар Аверкаў на АНТ у аўторак.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**МАРЫНА БАГДАНОВІЧ павяла прадпрымальнікаў да прэзыдэнцыі. На наступны дзень ёй быў выпісаны штраф 4,8 млн рублёў.**

## ГАСПАДАРКА СЬЦІСЛА

### Сусьветны банк чарнобыльскім раёнам

Сусьветны банк выдзеліць краіне крэдыт у памеры $45 млн на рэабілітацыю пацярпелых ад чарнобыльскай бяды раёнаў. Ня выключана, што будуць прыцягнутыя і дадатковыя сродкі. Пра гэта заявіў у Менску дырэктар банку ва Ўкраіне, Малдове і Беларусі Пол Бірмінгем.

### Арэлі дзярждоўгу

Дзярждоўг Беларусі за студзень скараціўся на 1,6% і складае 4,383 трлн руб. Між тым, у сьнежні ён вырас на 13,5%. На 1 студзеня ўнутраны доўг складаў 2,846 трлн руб., вонкавы — $741,1 млн.

### А ты пасьпеў падаць дэкларацыю?

1 сакавіка скончыўся тэрмін падачы грамадзянамі дэкларацыі аб сукупным гадавым даходзе. Аднак калі пры падачы дакумэнтаў былі пададзены непраўдзівыя зьвесткі, да 15 красавіка ёсьць шанец выправіцца. Міністэрства па падатках і зборах абнародуе дакладныя лічбы аб колькасьці пададзеных дэкляраций у найбліжэйшы час.

### Кожны чацьвёрты

На пачатак сакавіка сярод апэратараў GSM-сувязі лідзіруе МТС — 1,32 млн абанэнтаў, у «Velcom» на 100 тыс. меней — 1,225 млн. Мінсувязі прагназуе, што да 2010 году адзін мабільнік будзе прыпадаць меней чым на два чалавекі.

### Цэны, назад

Менская мэрыя сабрала прадстаўнікоў адміністрацый сталічных рынкаў і загадала вярнуць кошты на садавіну і гародніну на ўзровень 1 лютага ды не падвышаць іх да 1 красавіка. Кіраўніцтва сталіцы лічыць недапушчальным, каб цэны на садавіну і гародніна падвышаліся адразу на 20—25%, як гэта звычайна здараецца напачатку вясны. Прадпрымальнікі ж мяркуюць, што гэта глупства і пустаслоўе.

### Жанчынам — гуркі

Агракамбінат «Ждановічы» ўзяў абавязацельства да 8 Сакавіка штодня пастаўляць на сталічныя рынкі па сем тон гуркоў.

### Украіна расплаціцца сьвятлом

Беларусь чакае пагашэньня ўкраінскага доўгу пастаўкамі электраэнэргіі. Пра гэта заявіў на прэс-канфэрэнцыі ў Кіеве пасол Беларусі Валянцін Вялічка. Заліковая схема пагашэньня доўгу прадугледжвае распрацоўку сумесных ліній электраэнэргетыкі, у прыватнасьці, узнаўленьня дзейнасьці падстанцыі «Чарнігаў—Гомель» ды выкарыстаньне энэргіі Ровенскай АЭС. Беларусы настойваюць на лічбе запазычанасьці $150 млн, украінцы прызнаюць суму ўдвая меншую.

**АГ, afn.by, belapan.com**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

на **3 сакавіка:**

1 амэрыканскі даляр — 2 157 рублёў
1 эўра — 2 832,25 рубля.
1 латвійскі лат — 4 068,66.
1 літоўскі літ — 820,20.
1 польскі злоты — 722,52.
1 расейскі рубель — 77,87.
1 украінская грыўна — 407,40.

**Паводле Нацбанку**

# Чэх працаваў на беларускую выведку?

У Чэхіі разгарэўся скандал вакол былога супрацоўніка чэскае вайсковае разьведкі Рамана Лінэра. Шпіён абвінавачваецца ў фінансавых махінацыях, якія ён ажыцьцяўляў у фіктыўных фірмах, створаных чэскай разьведкай для прыкрыцьця сваёй шпіёнскай дзейнасьці. Пікантнасьць справы палягае ў тым, што, увёўшы ў пошукавік імя «Лінэр», карыстальнік Інтэрнэту зь сярэднімі здольнасьцямі можа ў базе даступнага для грамадзтва гандлёвага рэестру за гадзіну адшукаць назвы фіктыўных шпіёнскіх фірмаў і іх заснавальнікаў разам з пашпартнымі зьвесткамі, а гэта ўжо вялікая пагроза для сакрэтнасьці ў дзеяньнях чэскіх спэцслужбаў.

Акрамя таго, затрыманага, які шмат гадоў працаваў у самым сакрэтным аддзеле вайсковай разьведкі, падазраюць у вядзеньні так званай двайной гульні.

«Справа, калі ўзяць пад увагу дыпляматычны пункт гледжаньня, вельмі далікатная. Ёсьць зьвесткі, што афіцэр разьведкі перадаваў інфармацыю беларускай спэцслужбе», — паведаміла, спасылаючыся на добра інфармаваныя крыніцы, газэта «Hospodarzske noviny». Адначасова газэта падкрэсьліла, што афіцэру яшчэ не было прад'яўлена абвінавачаньне ў шпіёнскай дзейнасьці.

Затрыманы афіцэр валодаў дэталёвай інфармацыяй аб тым, хто ў Беларусі працаваў і працуе на карысьць чэскай разьведкі.

**БТ**

# Амэрыканская гісторыя

3 сакавіка можа вырашыцца лёс маленькага сына беларускіх эмігрантаў, забранага амэрыканскімі паліцэйскімі.

Эміграцыя — заўжды трагедыя. Хтосьці дасьць ёй рады, а для іншых яна робіцца толькі першым зьвяном у ланцугу бядот. Так выйшла і ў Сьвятланы Міхель ды Зьмітра Траянкі, якія зьехалі ў ЗША ў студзені.

Можа, абрыдла Сьвятлане атрымліваць мізэрны заробак настаўніцы, муж палічыў, што працу аўтамэханіка на той бок Атлянтыкі ацэняць лепш, чым у Беларусі. А тут яшчэ дзіця на сьвет прасіцца… Сын нарадзіўся ў Філадэльфіі, усяго праз некалькі дзён пасьля пералёту бацькоў праз акіян. Назвалі яго на англасаксонскі лад — Дэніэлам.

У суботу 19 лютага маладая сям'я выправілася на «шопінг» у гандлёвы цэнтар «Wal-Mart». Малое заснула ў дзіцячым сядзеньні ў машыне, таму бацькі, паводле іх слоў, вырашылі яго не чапаць, а самі пайшлі ў краму, нават не заглушыўшы рухавіка. Калі яны вярнуліся, вакол машыны ўжо стаялі паліцэйскія. Без цырымоній яны замкнулі на руках Сьвятланы і Зьмітра кайданкі ды адвезьлі ў турму. Малое забралі і аддалі ў прыёмную сям'ю.

Бацькам высунулі абвінавачаньні ў тым, што яны наўмысна паставілі пад пагрозу жыцьцё дзіцяці. Сьвятлана і Зьміцер кажуць, што адсутнічалі ня больш за 15 хвілін, паліцэйскія ж сьцьвярджаюць, што бацькоў не было каля гадзіны.

Наша краіна ў Амэрыцы амаль невядомая ды мала зразумелая. Цяпер бацькі спрабуюць перакanaць суд, што пакідаць немаўлятка ў аўто з уключаным рухавіком — звычайная рэч у Беларусі. Сьвятлана таксама настойвае на тым, што павінна карміць малое грудзямі. «У Беларусі жанчына, якая ня корміць свайго дзіцяці ўласным малаком, выклікае пагарду», — сказала яна праз перакладчыцу ў інтэрвію тэлеканалу NBC.



Сьвятлана, Зьміцер і іх малы Дэніэл.

Хто іх, беларусаў, ведае зь іх звычаямі? Магчыма, судзьдзя не заўважыў хітрыкаў ці проста пашкадаваў няшчасных бацькоў — ён дазволіў ім наведваць дзіця раз у дзень пад наглядам паліцыі. Чым скончыцца гэтая гісторыя, пакуль невядома — чарговае судовае пасяджэньне прызначанае на 3 сакавіка.

Зьяжджаючы ў далёкі сьвет зь ціхай Беларусі, варта захапіць з сабою ня толькі надзеі на лепшы лёс, але і веды пра той край, дзе зьбіраешся жыць. Анэкдоты пра дурных амэрыканцаў ведаюць усе, але ж менавіта яны пішуць свае законы, няхай таксама не заўсёды вельмі разумныя.

**Алесь Кудрыцкі**

# Іх усё адно раскрыюць

Забойства 1953 году ў Гарадоцкім раёне на Віцебшчыне — самае старое з раскрытых аддзелам па раскрыцьці злачынстваў мінулых гадоў упраўленьня крымінальнага вышуку галоўнага ўпраўленьня крымінальнай міліцыі МУС.

Пра гэта расказаў намесьнік начальніка ўпраўленьня Герман Дзёмкін. Што праўда, забойцу пэнсіянэркі Фірсавай закон пакараць ня здолеў: народжаны ў 1909 годзе, да раскрыцьця злачынства ён не дажыў…

436 тысяч нераскрытых крымінальных злачынстваў — такую статыстыку мае на сёньня беларускі МУС. Штогод колькасьць нераскрытых злачынстваў узрастае амаль на 30 тысяч, за два гады існаваньня ўпраўленьне раскрыла толькі шэсьць тысяч (2753 злачынствы ў 2003 г. і 3302 злачынствы ў 2004 г.). За 2004 год раскрытыя 50 забойстваў, 61 наўмыснае нанясеньне цяжкіх цялесных пашкоджаньняў, 19 згвалтаваньняў, 89 разбойных нападаў, 156 рабункаў, 2424 крадзяжы і г.д.

Аднак дагэтуль нераскрытымі застаюцца 1300 забойстваў. Г.Дзёмкін адзначыў, што «найстарэйшай» справай, якую вывучалі спэцыялісты ўпраўленьня, было забойства 1947 г.: «Але мы яе не расьсьледавалі — толькі вывучылі». Тэрміну даўнасьці для раскрыцьця цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў нашы камісары Мэгрэ не прызнаюць — справядлівасьць павінна быць адноўленая. Але пакараньне чакае вінаватага не заўжды: тэрмін даўнасьці за найбольш цяжкае злачынства — забойства — абмяжоўваецца 15 гадамі. Гэта калі не было абцяжваючых акалічнасьцяў, бо тады ступень адказнасьці вызначае суд.

Прэс-канфэрэнцыя Г.Дзёмкіна адбылася ў дзень, калі ва Украіне былі арыштаваныя меркаваныя забойцы журналіста Георгія Гангадзэ, зьніклага ў 2000 г. Для прагрэсу ў сьледзтве спатрэбілася зьмена ўлады. Усе трое арыштаваных — супрацоўнікі сілавых структураў.

Задавалі Г.Дзёмкіну пытаньне і пра загадкі зьнікненьняў і забойстваў Ганчара, Красоўскага, Захаранкі, Завадзкага, Чаркасавай. Ён сказаў, што іхны аддзел гэтымі справамі не займаецца.

**АШ**

# Анатоль Івашчанка — ляўрэат «Залатой літары»

Адам Глёбус на сайце «Litara.net» абвесьціў сёлетніх пераможцаў прэміі «Залатая літара». За ўдзел у паэтычным праекце «12+1» былі адзначаны крытык Ганна Кісьліцына за прапаганду праекту, Андрэй Хадановіч за рэдактуру кнігі і адзін з аўтараў — Анатоль Івашчанка за радок «Я — слуп, прыбіты да ганебнага чалавека». **Анатоль Івашчанка**, асьпірант Інстытуту літаратуры НАН, адказвае на пытаньні «НН».

**— Вы атрымалі прэмію за радок, напісаны вэрлібрам. Нехта казаў, што верлібр — гэта верш, схаваны ў прозе. Прыхільнасьць да такой формы была нечым абумоўленая?**

— Мае пачатковыя творы — з тых, якія ня сорамна паказаць — сапраўды напісаны вэрлібрам. Напачатку мне хацелася пазьбегнуць абмежаваньняў сылябатанічнага вершу зь яго абавязковымі рыфмамі, рытмамі, дакладнай пабудовай. А цяпер пішу і ў клясычнай манеры. Пасьля ўдзелу ў конкурсе імя Арсеньневай мне на вочы трапілі аркушы з маімі вершамі з паметкамі сяброў журы. Насупраць некаторых вершаў было пазначана: «Разанаў». Мяне гэта зьдзівіла, я думаў, што я ў іх першапраходнік, але... Мяркую, Разанаў моцна паўплываў на мяне таму, што я пісаў навуковую працу пра ягоную творчасьць. Мушу канстатаваць, што апошнім часам трапіў і пад уплыў Хадановіча, напісаўшы (несьвядома) верш у ягоным стылі.

**— Як бы Вы ахарактарызавалі сучасную беларускую паэзію?**

— Маладая паэзія магутна прадстаўлена, так бы мовіць, «сьцёбам». Інтэлектуальная паэзія знаходзіцца ў цені праз пасіўнасьць яе адэптаў. У мяне няма аўдыторыі. Я пішу для сябе. Тое, што я раблю цяпер, нагадвае пасланьне сыгналаў у космас у накірунку незямных цывілізацый. Добра, калі ўнутры чалавека ягоная ўнутраная цывілізацыя на гэта адгукнецца.

**— Напэўна, унутры Адама Глёбуса нешта адгукнулася.**

— У мяне ёсьць падазрэньне, што сп.Глёбус мае сантымэнты да выпускнікоў філфаку. Летась прэмію атрымала Аксана Бязьлепкіна за сваю дыплёмную працу, па сутнасьці, таксама выпускніца філфаку. У гэтым годзе Хадановіч, Кісьліцына і я. Прэмія 111 эўра добра дзеліцца на траіх. Вядома, гэтую прэмію цалкам



АРЦЕМ ЛЯВА

заслужылі Ганна Кісьліцына і Андрэй Хадановіч.

**— Куды мяркуеце патраціць прэміяльныя?**

— Ёсьць некалькі варыянтаў. Самы разумны — набыць добрага віна і пасядзець за бутэлькай зь сябрам.

**— Што для вас літаратура?**

— Магчымасьць выказацца, пакінуць сьлед. Спосаб самарэалізавацца. Я мала напісаў, каб казаць пра прафэсійнасьць майго занятку літаратурай. Я пішу прозу і паэзію. Прыблізна адно апавяданьне за год, якое доўга выношваецца. Вершы пішу пераважна ўвосені. Потым цягам году яны шліфуюцца, рэдагуюцца. Агулам набралося пад сотню вершаў, якія можна камусьці паказаць. Ёсьць вершы зусім кароткія, як гэты: «Для таго, хто знайшоў свой шлях, словы не патрэбныя». Увогуле пішацца, калі на душы нядобра, нават пагана. Мне здаецца, што такі стан натуральны для нашай сытуацыі. Ёсьць думка, што беларускамоўны творца ня можа пачувацца гарманічным у нашым грамадзтве, нават калі піша вясёлыя вершыкі пад Хадановіча.

**— Вашы прынцыпы жыцьцёвыя, літаратурныя?**

— Рухацца далей. Не спыняцца на дасягнутым.

**Гутарыў Арцём Лява**




**ЧЫСТЫ АДРЭНАЛІН.** «Зубровец» уздымае бел-чырвона-белы сьцяг над праспэктам Скарыны. 15 лістапада 2004 г.

# Ліцэнзія на адстрэл «зубранят»

«Советская Белоруссия» пайменна пералічвае маладых апазыцыянэраў

«Культурны шок» — такую назву мае артыкул Івана Пагранзона, зьмешчаны ў нумары газэты «Советская Белоруссия» за 9 лютага. Нагода для матэрыялу — выпуск «Хартыяй-97» «Маніторынгу парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі» за 2004 г. «Аб чым гаворыцца ў маніторынгу?» — пытаецца аўтар матэрыялу. «Праз кожную старонку расказваецца аб тым, што супрацоўнікамі міліцыі ўвесь час затрымліваліся юныя актывісты т.зв. руху «Зубр». Варта пагадзіцца, што сумарна гэтыя зьвесткі выглядаюць дастаткова змрочна. Старонка за старонкай ідзе бясконцы пералік: затрымалі, адпусьцілі, зноў затрымалі… Мільгацяць адны і тыя ж прозьвішчы: Юлія Гарачка, Артур Гайдукевіч, Дар’я Малдаванава, Яўген Афнагель, Павал Юхневіч». «Каб міліцыя не затрымлівала зубранят, — сьцьвярджае І.Пагранзон, — дык буйны маладняк сам браў бы штурмам райаддзелы міліцыі. Бо кожнае затрыманьне, кожны пратакол — прамы і вельмі пажаданы шлях у палітычныя ўцекачы».

Актывіст «Зубра» **Яўген Афнагель (на фота справа)** камэнтуе:

**«НН»: Пайменны пералік актывістаў у галоўнай дзяржаўнай газэце — ці часта такое здараецца?**

**Яўген Афнагель:** Калі такое й рабілі раней, дык я пра гэта нічога ня ведаю. Чаму гэтыя прозьвішчы вырашылі згадаць, лепш спытацца ў кіраўніцтве лукашэнкаўскай газэты. У артыкуле ідзе гаворка пра маніторынг парушэньняў правоў чалавека. Прачытаўшы матэрыял, я прагледзеў маніторынг — памянёныя прозьвішчы найчасьцей згадваюцца ў першы месяц затрыманьняў мінулага году. Хутчэй за ўсё, той чалавек, які пісаў гэты артыкул, прачытаў крышку маніторынг, самыя першыя старонкі, і тыя прозьвішчы, якія найчасьцей трапляліся на вочы, падаў у артыкуле. Хтосьці з гэтых людзей часта затрымліваўся, але некаторыя затрымліваліся толькі на пачатку году. Тым больш калі глядзець агульныя зьвесткі, дык можна адшукаць прозьвішчы, якія згадваюцца яшчэ часьцей. Агулам на працягу мінулага году былі затрыманы больш за 250 актывістаў руху. Трэба таксама ўлічваць і тое, што ня ўсе факты рэпрэсій фіксуюцца ў маніторынгу. Часам мы не даём асабістых даных чалавека на ягоную просьбу.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«НН»: Ці мелі Вы і іншыя асобы, згаданыя ў артыкуле, праблемы пасьля публікацыі?**

**ЯА:** Не, ня мелі.

**«НН»: Наколькі адэкватныя сёньняшняй сытуацыі цяперашнія стратэгія і тактыка «Зубра»?**

**ЯА:** Агульная стратэгія «Зубра» — гэта мабілізацыйная кампанія, асабліва падчас падрыхтоўкі да выбараў. Мы заклікаем людзей, каб яны прыйшлі на выбарчыя ўчасткі і зрабілі сьвядомы выбар, а потым здолелі абараніць яго. Цяпер «Зубр» вядзе кампанію па вызваленьні палітычных вязьняў. Распаўсюджваюцца ўлёткі з заклікам вызваліць Марыніча, Леванеўскага, Васільева. Праводзяцца акцыі — на працягу апошніх двух месяцаў яны адбыліся ў Менску, Бабруйску, Барысаве, Магілёве, Маладэчне, Віцебску. Штомесяц актывісты руху распаўсюджваюць ад 200 да 400 тысяч асобнікаў друкаванай прадукцыі. Гэта больш, чым усе партыі разам узятыя. Няспынна ідзе разбудова рэгіянальнай сеткі. Пасьля ўкраінскай рэвалюцыі паднялася хваля новых людзей, якія жадаюць далучыцца да супраціву.

**«НН»: У артыкуле сьцьвярджаецца, што зуброўцы зарабляюць сабе на палітычны прытулак. Як Вы гэта пракамэнтуеце?**

**ЯА:** Гэта проста сьмешна. Я асабіста ведаю ўсіх людзей, названых у газэце. Яны ня першы год у супраціве. Наўмысна карыстацца ўласнымі затрыманьнямі, каб зарабіць палітычны прытулак, — у нас такіх людзей няма. Ёсьць людзі, якім рэальна пагражае небясьпека рэпрэсій, выключэньня з навучальных установаў, пазбаўленьня працы — асабліва ў рэгіёнах. Часам такія людзі адпраўляюцца за мяжу. Але ніхто не ідзе на «пасадку» з мэтай зьехаць.

**«НН»: Ці падтрымліваеце Вы кантакты з замежнымі арганізацыямі накшталт украінскай «Пары»? Напрыклад, з Кіргізіі ці Казахстану, дзе палітычная сытуацыя збольшага падобная да нашай?**

**ЯА:** Так, такія кантакты ёсьць — з украінцамі, грузінамі, сэрбамі. Пасьля «аранжавай рэвалюцыі» «Пара» трансфармавалася і займаецца спрыяньнем разьвіцьцю нармальнага грамадзтва. Тое самае і з грузінскай «Кхмарай», і з сэрбскім «Отпарам».

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

## Нягоды Славаміра Адамовіча

Паэт, які атрымаў палітычны прытулак у Нарвэгіі, быў моцна зьбіты невядомымі. Ён пацьвердзіў гэтую інфармацыю ў электронным лісьце. «Зьбілі на ўласнай кватэры, бо сам адчыніў. Білі прафэсійна, толькі твар, і душылі ручніком. Пры гэтым зьвязалі рукі ззаду, каб менш супраціўляўся. Адбывалася гэта раніцай, гадзін мо ў дзевяць. Паліцыю выклікала суседка, калі я нарэшце змог дабрацца да яе кватэры. Цяпер мяне перасялілі ў новую кватэру, далі спэцсувязь для кантакту з паліцыяй. Два разы пра гэта пісала мясцовая «Авіза Норлянд». Справу расьсьледуюць. Хто і што гэта — ня ведаю, адны здагадкі. Хачу дамоў, бо яшчэ такога пекла духоўнага, як тут, не перажываў… Трэба было два гады сядзець, каб аказацца бітым, ды яшчэ ня ведаць за што і кім. Во якія запалярныя справы».

**АШ**

## Усіх не перасаджалі

З 2004 год «зуброўцаў» затрымлівалі — каля 565 разоў;

распачата крымінальных спраў — 3;

агульная колькасьць сутак, праведзеных за кратамі — 400;

выключаны з навучальных установаў альбо звольнены з працы — 15;

колькасьць актывістаў, што падвергліся рэпрэсіям — 250.

**Крыніца: прэс-служба «Зубра»**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Зіма ў Даманаве

Даманава — няблізкі сьвет. Жыхары вёскі на рацэ Грыўда выбіраюцца ў сталіцу толькі па вялікай патрэбе, раз у некалькі гадоў. Калі ў Менску няма сваякоў, ехаць няма патрэбы — побач Івацэвічы, да Баранавічаў — з паўгадзіны на электрычцы. Узімку Даманава агортвае сон. Дзіва пабачыць кагосьці на вуліцы ўвечары — толькі дзеці ганяюць шайбу самаробнымі клюшкамі. У старэйшых забавак няшмат — тэлевізар, самагонка і размовы. А што яшчэ паробіш на 18 тысячаў заробку? Рэпартаж **Сяргея Будкіна**.

## Залатыя саветы

За сваю кароткую гісторыю Даманава ўпершыню згадваецца ў сярэдзіне XIX ст. у сувязі зь сялянскімі хваляваньнямі. Мястэчка гарэла тройчы. Падчас эвакуацыі 1914 г. расейцы вывезьлі жыхароў у Омскую і Саратаўскую вобласьці, а Даманава спалілі пры адступленьні — доўгія сем год вёска не існавала. Аднавілася мястэчка ўжо за Польшчай. Краязнаўца Уладзімер Шлык кажа, што ягоныя бацькі, вярнуўшыся на пустую зямлю, наноў будавалі хаціны, а па першым часе елі жычугку.

У верасьні 1939 г. даманаўскія жыхары сустракалі чырвоныя войскі. Сп.Шлык, якому тады было чатырнаццаць, кажа, што ўсе без вынятку віталі саветы. Больш палкія яшчэ ў 1930-х засьведчылі сваю адданасьць бальшавізму: «На ўсю вёску ў нас быў адзін прымач, і слухалі толькі «Маяк», дык некаторыя, наслухаўшыся прапаганды, кідалі ўсё і пераходзілі нелегальна праз мяжу. Натуральна, атрымлівалі па 10 год турмы за шпіёнства».

«Аднак савецкая ўлада заняла ўсіх, за палякамі шмат хто хадзіў бяз працы», — уздыхаюць старыя.

У 1944 г. частка Даманава ізноў гарэла — немцы пры адступленьні падклалі выбухоўку пад вакзал, мост праз Шчару і воданапорную вежу і спалілі частку вёскі. Не пасьпела Даманава аднавіцца як сьлед — адбыўся трэці пажар, загарэўся лясны завод і агонь перакінуўся на вёску, спаліўшы палову хацін.

1960-я гады старэйшыя жыхары прыгадваюць з асаблівай цеплыnёй — тады Даманава сталася невялікім прамысловым цэнтрам — зь дзясятак млыноў, чатыры лесазаводы, камбінат будматэрыялаў, гута, цагельня і шыфэрны заводы, дзе на вытворчасьці было задзейнічана 1200 чалавек. Тады ў Даманава зьяжджаліся людзі адусюль, бо працы хапала. Але прыйшоў 1991г.: спынілася дастаўка цэмэнту, скараціліся штаты, заводы зачыняліся, прыпынілі выпуск шыфэру.

## Людзей менее

Даманава так і не акрыяла. Цяпер вяскоўцы задзейнічаны толькі ў вытворчасьці сылікатнай глыбы, зь якой робяць вадкае шкло, але штат супрацоўнікаў там невялікі — 320 чалавек. Пад сотню чалавек занятыя на чыгунцы (там больш-менш прыстойны заробак). У калгасе некаторыя атрымоўваюць мізэр.

А насельніцтва ўсё скарачаецца (цяпер 1500 чалавек), і вёска няўмольна старэе. Некалькі дзесяткаў хацін стаяць пустыя. У 1970—1980-х колькасьць вучняў у школе сягала 700, сёлета — 254. Настаўніца Сьвятлана кажа, што цяпер мала хто набывае адукацыю далей (летась толькі чатыры выпускнікі даманаўскае школы паступілі ў ВНУ, яшчэ некалькі — у тэхнікумы).

Жывуць даманаўцы па-рознаму: некалькі дзясяткаў беспрацоўных-апівох, хоць у гэты лік можна дадаць яшчэ калгасьнікаў, якія ўзімку атрымліваюць 20—30 тыс. руб. на месяц (хіба гэта не беспрацоўныя?), таму і робяць вочы заплюшчыўшы. Міхал — адзін з такіх. Ён жыве ў суседняй вёсцы і ходзіць убездараж штораніцу на працу ў калгас, каб атрымаць пры канцы месяца 18 тыс. руб.! Зь іх плоціць яшчэ і аліменты былой жонцы. Як выжывае? Жыве пры бацьках, а ў тых пэнсія куды большая, таму на трох хапае.

## Тут вам не Ўкраіна

Пэнсіянэры пераважна захапляюцца прэзыдэнтам. «Куды я супроць буду галасаваць, пэнсію вунь заўсёды ў свой час заносяць, а там немаведама што будзе пры іншым», — кажа бабця Наста.

Дзед Павал мае вялікую гаспадарку, дапамагае дзецям, унукам і праўнукам, што жывуць у Менску. На выходныя возіць на продаж сьмятану, малако на баранавіцкі рынак. Але гандаль не ідзе — замінае мясцовая «санітарная мафія». Хоць і мае даведку, што ягоная карова здаровая, мясцовы санітарны доктар не дае яму гандляваць, аднойчы нават пабіў наўмысна слоік са сьмятанай і абліў старога. «Хоча, каб дзяліўся, а шыш яму!» — кажа дзед Павал ды шукае праўды ў вышэйшых інстанцыях, каб толькі атрымаць магчымасьць прадаваць.

«А ў нас кажны тут сам за сябе, тут Украіны не паўтарыцца», — кажа дзядзька Сьцяпан. Ён колісь галасаваў за Лукашэнку, але цяпер настроены супраць. Канстытуцыі, маўляў, парушаць нельга. «Але, калі здарыцца такое, як ва Ўкраіне, у сталіцу на мітынг не паеду, ды мала хто зь вёсак паедзе — улада зьменіцца, а мяне за прагул усё адно звольняць з працы», — кажа Сьцяпан, які на спрэчку можа выпіць два літры самагонкі.

Ёсьць у Даманава і заможныя людзі, няшмат іх праўда, але ёсьць. Адзін зь іх — Мікола. Пераганяе аўто праз мяжу на замову і мае за тое капейчыну, тым і жыве: «Усё адно лепей, чым у калгасе гарбаціцца за нішто».

Узімку ёсьць час паразважаць, вуглы паабціраць, але з адыходам маразоў тыя развагі адыходзяць на другі плян. Трэба рабіць. Каб выжыць.

Некаторыя імёны герояў матэрыялу зьменены.

# Легендарную «Лазьню» прададуць

У Полацку працягваецца працэс прыватызацыі дзяржмаёмасьці. Летась было прададзена дзесяць аб'ектаў, за якія выручылі 281 млн рублёў. Зборльшага гэта невялікія крамы і збудаваньні, што засталіся ад ліквідацыі вайсковага гарадка ў Баравусе-3 (казармы, сталоўкі, склады). А вось клюб былога полацкага камбінату будматэрыялаў не ўдаецца прадаць цягам дзевяці год. На такія аб'екты-бедалагі гарвыканкам нават робіць адмысловыя «зьніжкі» — зьмяншае кошт на 80 адсоткаў, што мала дапамагае. Дый навошта прадпрымальніку-бізнэсоўцу гмах былога камбінату, тым больш што будынак знаходзіцца ня ў цэнтры гораду.

Сёлета выканкам таксама мяркуе прадаць 10 аб'ектаў, сярод якіх дзіцячая кавярня на цэнтральным пляцы, база адпачынку на возеры Янова, першы паверх прыбудовы да легендарнай полацкай лазьні (на якой так і напісана «Лазьня», менавіта зь мяккім знакам).

**Васіль Кроква, Полацак**

# МАЗ ставіць на паток плястыкавыя аўтобусікі



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Першыя экзэмпляры новых аўтобусаў «малое» клясы МАЗ-256 сышлі з канвэеру летась у чэрвені. Цяпер, з адкрыцьцём новага цэху, вытворчасьць аўтобуса пастаўлена на паток.

Таго, хто чакаў убачыць вялізнае памяшканьне, дзе стаіць запраграмаваны аўтамат і сам усё скручвае, чакала расчараваньне. Увесь аўтобус да апошняга вінціка за адзін дзень зьбіраюць рукамі 103 чалавекі, якія шчыруюць на 14-ці пастах. Спачатку прывозяць мэталічны каркас, падобны да клеткі ў заапарку. Потым ён паступова абрастае жыцьцёва неабходнымі кампанэнтамі — шасі, маторам, падлогай, кабінай, у якой безьліч правадкоў. Іржа — праклён для любога аўтамабіля, які трапляе ў беларускі вільготны клімат. Таму новы аўтобус абшываюць плястыкам, які не баіцца карозіі.

Колер аўтобуса і аснашчанасьць тэхнікай — на жаданьне заказчыка. МАЗы-256, якія будуць хадзіць па турыстычных маршрутах, абсталююць кандыцыянэрам, аудыё- і відэасыстэмамі. Калі ж аўтобус будуць выкарыстоўваць у якасьці маршруткі ці школьнага аўтобуса, абсталяваньне будзе нашмат прасьцейшым.

Цяпер нашы дзеці, як у амэрыканскіх фільмах, таксама будуць садзіцца ў свой «school bus», каб дабрацца да школы. У ім будуць прадугледжаны месцы для партфэляў, ля кожнага сядзеньня — кнопка для запатрабаваньня прыпынку, і, вядома, павышаная патрабаваньні бясьпекі.

Аўтобус сапраўды выйшаў на выгляд сучасным. Гэта дазваляе выкарыстоўваць МАЗ-256 у прадстаўнічых мэтах для VIP-перавозак. Дарэчы, менавіта такія аўтобусы ўжо заказала для сябе МУС. Старыя «Пазікі» хутка давядзецца сьпісаць.

**Кацярына Кудрыцкая**

# Агурбашшу па «Грынджолах»


АЛЕНА АДАМЧЫК

У Польшчы ці Нямеччыне конкурс «Эўрабачаньне» мала каго цікавіць, і гэтыя краіны прадстаўляюць другарадныя выканаўцы, звычайна ў стылі «дыска». У былым СССР трапіць на «Эўрабачаньне» — пытаньне прэстыжу і інтрыг. Адборамі кіруюць дзяржаўныя чыноўнікі, а сваіх кандыдатаў лабіруюць найбуйнейшыя прадусарскія агенцтвы. Не абыходзіцца без палітыкі. Украіну сёлета прадставіць рэп-гімн Аранжавай рэвалюцыі, Малдову — нацыянальныя куміры, а паміж Расеяй і Беларусьсю адбылася музычная інтэграцыя. Не на нашу карысьць.

На фэстываль «Эўрабачаньне» ад Украіны была выбрана група «Greenjolly» з Івана-Франкоўску зь песьняй «Разам нас багата», а ад Малдовы — твор «Bunica bate doba» ў выкананьні «Zdob si Zdub». Расея ж і Беларусь прапануюць да ўвагі эўрапейскіх глядачоў поп-стандарты. Праўда, рознага гатунку.

### «Greenjolly» — «Разом нас багато»

Разом нас багато —
Нас не подолати!
Фальсифікаціям — ні!
Махінаціям — ні!
По понятіям — ні!
Ні брехні!
Ющенко — так, Ющенко — так!
Це наш президент!
Так! Так! Так!

Ми не бидло,
Ми не козли.
Ми України
Доньки і сини.
Зараз чи ніколи
Годі чекати!
Разом нас багато,
Нас не подолати.

## Палітрэп на «Эўрабачаньне»!

Вынікі выбару песьні на «Эўрабачаньне» ад Украіны зьявіліся сапраўнай неспадзяванкай. Перамогу ў адборачным туры прадказвалі Ані Лорак, але ў апошні момант да сьпісу выступоўцаў з ініцыятывы новага кіраўніцтва тэлерадыёкампаніі далучыліся яшчэ некалькі выканаўцаў. Сярод іх былі героі Майдану «Greenjolly» — два хіп-хопэры з Івана-Франкоўску, паўгоду таму нікому не вядомыя. Музыкі засьпявалі «Разам нас багата» і набралі 2247 галасоў (Ані Лорак — другая з 1952 галасамі). Можна аспрэчваць мастацкія вартасьці выбранага музычнага твору, але тое, што ён зьяўляецца галоўнай украінскай песьняй гэтай зімы, — факт бясспрэчны.

## Бэсарабскі рок-н-рол

У Малдове адборачны конкурс прайшоў без скандалаў, але вынікі яго таксама аказаліся досыць нечаканыя. Журы спыніла свой выбар на групе «Zdob si Zdub» — пастаянным удзельніку эўрапейскіх альтэрнатыўных фэстаў. Рок-каманды на конкурсах поп-песьні посьпеху ня маюць, але пра «Zdob si Zdub» — гаворка асобная. Аснова іх творчасьці — малдаўскі фальклёр.

Твор «Bunica bate doba» грунтуецца на народных сьпевах, але напісаны лідэрам групы Раманам Ягупавым. Зь вялікай любоўю да сваіх вытокаў ён апавядае пра гісторыю напісаньня песьні на афіцыйным сайце групы: «На індзейскіх абсягах поўдня Бэсарабіі, на беразе Пруту, дзе жыве сапраўдны малдаўскі фальклёр, ёсьць паселішча Вэлень. Там жыве чабанская сям'я Бэжэнару. Пасьля цяжкага тыдня яны адпачываюць «па поўнай»: мамалыга, віно — усяго ўдосталь. Бабуля Лідзія б'е ў барабан і нізкім голасам крычыць «стрыгетуры» — малдаўскія напевы. Мы натхніліся гэтым вобразам». «Bunica bate doba» — вясёлая песьня, з моднымі музычнымі «фішкамі» і фолькавай каларытнасьцю. «Бабулі ўсёй Малдовы б'юць у барабаны і перадаюць вітаньні каліфарнійскім хлопцам», — так рэкламуе сваю песьню група «Zdob si Zdub», адна зь нешматлікіх рок-камандаў, што мае за сваю дзейнасьць узнагароды ад кіраўніцтва краіны. Хлопцы атрымалі ад прэзыдэнта Малдовы мэдалі «За заслугі перад Айчынай».

## Музычная інтэграцыя

Беларусь будзе прадстаўляць міс БССР-89 Анжаліка Агурбаш зь песьняй без нацыянальных прымет, затое на сацыяльную тэматыку. Галоўныя героі відэашэрагу да «Boys and girls» — дзецi, што жывуць у «гарачых» кропках. Песьня ў выкананьні Падольскай «Nobody Hurt No One» мае выразны антыамэрыканскі падтэкст: «Вітаю, любая Амэрыка, / Тая, у якой губляюцца ўсе нашы мары, / Паглядзі на маленькую Эрыку: / Усё, што яна ведае — гэта страх». У музычным пляне «расейская» песьня больш жорсткая па стылістыцы і куды менш банальная за «Boys and girls» з гледзішча прафэсійнага. Пры галасаваньні будзе мець значэньне і ўзрост — публіка, як вядома, любіць маладых, а сталых — шануе. Розьніца ж ва ўзросьце між сьпявачкамі — 10 год. Цікавая адбылася музычная ракіроўка — беларуска Натальля Падольская едзе ад Расеі, Анжаліка, што мае расейскае грамадзянства, — ад Беларусі.

**Сяргей Будкін**

КАЛЯНДАР

# Сакавік

**3** — 125 гадоў з дня нараджэньня мовазнаўца Лява Шчэрбы (1880—1944).

**5** — 75 гадоў з дня нараджэньня мовазнаўца Паўла Сьцяцка (1930).

**8** — 75 гадоў з дня нараджэньня пісьменьніка Яраслава Пархуты (1930—1996).

**8** — 100 гадоў з дня нараджэньня генэрал-палкоўніка Аляксандра Радзімцава (1905—1977), двойчы Героя Савецкага Саюзу.

**9** — 150 гадоў з дня нараджэньня Аляксандра Мадэстава (1855—1908), навукоўца ў галіне клінічнай мэдыцыны.

**10** — 75 гадоў з дня нараджэньня мастака Мікалая Кірылава, аўтара партрэта кінарэжысэра, начальніка прэс-службы рэспубліканскай пракуратуры Юр'я Азаронка.

**15** — 75 гадоў з дня нараджэньня Жарэса Алфёрава (Віцебск), ляўрэата нобэлеўскай прэміі ў галіне фізыкі.

**19** — 175 гадоў з дня нараджэньня фармаколяга Івана Догеля (1830, Віцебская губэрня — 1916), ганаровага сябра Ваенна-мэдычнай акадэміі, Казанскага й Тартускага ўнівэрсытэтаў.

**20** — 75 гадоў з дня нараджэньня эканаміста Барыса Шапіры (1930).

**23** — 75 гадоў з дня нараджэньня мовазнаўца Леаніда Бурака (1930—1996).

**24** — 100 гадоў з дня нараджэньня Івана Флёрава (1905—1941), пад чыім кіраўніцтвам пад Воршай 14 ліпеня 1941 г. дала свой першы залп устаноўка БМ-3 («кацюша»).

**25** — Дзень Волі.

**25** — Дабравешчаньне ў каталікоў.

**25** — 100 гадоў з дня нараджэньня акадэміка-біяхіміка й паэта-маладнякоўца Алеся Вечара (1905—1985). Ён стварыў тэхналёгіі атрыманьня каратыну з морквы.

**27** сакавіка — Вялікдзень у каталікоў.

**29** — 125 гадоў з дня нараджэньня хірурга Яўгена Корчыца (1880—1950), які ўпершыню ў Беларусі зрабіў апэрацыю на сэрцы (1927, Менск).

**29** — 100 гадоў з дня нараджэньня этнографа, фальклярыста, гісторыка Міхася (Майсея) Грынблата (1905—1983).

СЬЦІСЛА

## Канцэрт у турме

Гурт «Ляпіс Трубяцкой» адыграў канцэрт у калёніі строгага рэжыму Бабруйску. Менавіта там адбывае пакараньне бізнэсовец Яўген Краўцоў, які колісь дапамагаў «Ляпісам». Музыкі гралі ў залі, што месьціцца на тэрыторыі калёніі і зьмяшчае 1200 чалавек. Цікава, што гэтая заля — самая ёмістая ў горадзе. «Ляпісы» па канцэрце яшчэ доўга раздавалі аўтографы і размаўлялі са зьняволенымі. Міхалок прыгадаў песьні, якія не сьпяваў некалькі год (у тым ліку і вядомы «Паренёк под следствием»). Аднойчы «Ляпісы» ўжо выступалі ў турме — некалькі год таму яны пацешылі сваімі песьнямі зьняволеных у калёніі ў Менску.

## Букчын адшукаў скарб Напалеона

Публіцыст Сямён Букчын вярнуўся да літаратуры. Менская фабрыка каляровага друку выдала накладам 5000 асобнікаў ягоную гістарычна-дэтэктыўную аповесьць «Скарб Напалеона». Твор быў напісаны ў 1988—1989 г. і друкаваўся ў часопісе «Вираж». Задума ж яго ўзьнікла яшчэ раней — у 1970-я, калі С.Букчын працаваў над трылёгіяй пра дзекабрыстаў «Да мячоў ірвануліся нашы рукі…». Як расказаў С.Букчын, у аповесьці ён пайшоў на лёгкую містыфікацыю: у духу Стывэнсана дапісаў неіснуючыя ўрыўкі да сапраўднага дзёньніка лейтэнанта Савэна, ад'ютанта маршала Нэя. «Пасьля таго як твор быў надрукаваны, мне тэлефанавалі шукальнікі й прапаноўвалі: у нас ёсьць спэцыяльнае абсталяваньне — паедзем шукаць скарб», — кажа аўтар.

## Брэнд турызму

Міністэрства спорту й турызму ладзіць у сакавіку конкурс на стварэньне нацыянальнага турыстычнага графічнага знаку. Знак мае як мага паўней ахарактарызаваць Беларусь як турыстычную краіну. Цікава, што турзнак Гішпаніі, напрыклад, стварыў слынны Пікаса.

## Шэдэўры нематэрыяльнай спадчыны

11 краінаў — Беларусь, Кітай, Латвія, Літва, Японія, Кітай ды інш. — ратыфікавалі Канвэнцыю аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, падпісаную на Генэральнай канфэрэнцыі UNESCO ў 2003 г. У сьпіс UNESCO ўжо ўваходзяць і шэдэўры вуснай ды нематэрыяльнай творчасьці нашых суседзяў — балтыйскія (Літва, Латвія, Эстонія) сьвяты песьні й танцу.

**АВ, СБ**

# Нас Буш бачыў

Працяг са старонкі 2.

брамак-мэталашукальнікаў, куды прапускалі паасобку (ключы, мабільнікі, гадзіньнікі, гаманцы з манэтамі — на стол, сумкі прафэсійна абшукваюцца, зазіраюць нават у цыгарэтныя пачкі). Каму-нікаму прыйшлося выцягваць са штаноў рамяні, у якіх было занадта шмат мэталічнай арматуры, у кагосьці адабралі яблык, узяты з самай бяскрыўднай мэтай — перакусіць… Амаль адразу за брамкамі знаходзіцца сцэна, дзе цягам некалькіх гадзін перад пачаткам імпрэзы давалі жару славацкія артысты. Гук быў вельмі добры, музыкі — натхнёныя, людзі, асабліва моладзь, — у захапленьні. Аднак большасьць народу (і мы ў тым ліку) адразу ішлі бліжэй непасрэдна да месца выступу — і хутка застылі перад чарговым кардонам паліцыянтаў, які ахоўваў плошчу перад трыбунай і месцамі для ўрадоўцаў. Журналістам адвялі асобную плятформу, паднятую мэтры на тры над натоўпам, а тэле- і фотарэпартэры захапілі і іншыя ўзвышаныя пункты на плошчы. Вышэй за іх — толькі спэцы-назіральнікі ў чорным на дахах навакольных дамоў ды верталёты ў шэрым небе.

Вецер і мокры сьнег робяць чаканьне Буша доўгім і нудным. Прамакаюць курткі, цякуць ручаінкі з валасоў, ногі мерзнуць і пачынаюць балець. Славакі вакол размаўлялі аб сваім звычайным жыцьці. Пераважная большасьць людзей вакол нас — маладыя хлопцы і дзяўчаты, старэйшых за 30 год мала, а людзей пэнсійнага ўзросту — наагул адзінкі. Стаяньне доўжыцца амаль дзьве з паловай гадзіны, у галаву пачынаюць прыходзіць нядобрыя думкі пра арганізатараў імпрэзы. Нарэшце апошні паліцэйскі кардон прапускае нас бліжэй да трыбуны. Цяпер яна прыкладна за 20 мэтраў. Усё цудоўна відаць. Па натоўпе перадаюць зьвязкі славацкіх і амэрыканскіх сьцяжкоў. Славацкія да нас дайшлі, а вось штатаўскіх на ўсіх не хапіла. Некаторыя людзі з натоўпу дастаюць прыхаваныя чэскія сьцяжкі і далучаюць іх да славацка-амэрыканскіх.

Яшчэ пад гадзіну чаканьня, і рады крэслаў ззаду трыбуны пачынаюць запаўняцца. Прыходзяць і садзяцца людзі. Бегаюць туды-сюды спрактыкаваныя ахоўнікі, пераглядаюць сто разоў пераглядканае. Праверацца і перапраўляюцца мікрафон. Актыўней варушацца назіральнікі на дахах. Натоўп трохі нэрвуецца ў чаканьні. Амаль перастае сьнег.

Першым да трыбуны падыходзіць славацкі прэм'ер Мікулаш Дзурында, недзе разам зь ім — усе вакол устаюць на дыбачкі, разглядзець нешта больш выразна ўжо цяжка — славацкі прэзыдэнт Іван Гашпаровіч… Іх вітаюць, але без асаблівага захапленьня — яны свае, «хатнія», вядомыя і звыклыя. Буш — супэрзорка гэтае імпрэзы, і асноўная ўвага належыць менавіта яму. Яму — найбольшыя воплескі, захоплены сьвіст, трымценьне сьцяжкоў. Славацкія лідэры выдатна ўсё разумеюць і наўрад ці крыўдуюць. Яны выканалі сваю задачу, і выканалі добра, зрабіўшы сваю маленькую краіну месцам сустрэчы кіраўнікоў дзьвюх дзяржаў, адна зь якіх выразна дамінуе ў сьвеце, а другая ліхаманкава імкнецца ня страціць хаця б тое, што праўдамі-няпраўдамі захавала ад колішняга імпэрскага ўплыву ды тэрыторый.

Прамаўляе Буш.

Вы скажаце: «Я бачыў выступ па тэлебачаньні». Аднак тэлебачаньне ніякім чынам не перадае ні асаблівай энэргетыкі, ні абаяльнасьці, ні ўладарнасьці гэтага чалавека. Можна гаварыць пра гэта з поўнай упэўненасьцю — бо калі падчас прамовы (чыйсьці сьцяжок упарта засланяе трыбуну) ты пераводзіш позірк на вялікія экраны з буйнапляннай трансьляцыяй, бачыцца трохі іншая карцінка. Такое — і не такое. Адзін і той жа чалавек — і зусім розны. Тэлебачаньне, пры ўсёй неабходнасьці і незамяннасьці яго, штосьці таемнае і сапраўднае перадаць ня ў стане.

Буш гаворыць пра другую хвалю свабоды… Ён згадвае Грузію, Украіну… Ён спадзяецца на Малдову… Ён хацеў бы бачыць свабоднай Беларусь!

Мы ўзрываемся крыкам, ускідваем вышэй самаробныя папяровыя сьцяжкі і пранесены пад вопраткай, нягледзячы на забарону ў запрашэньнях, вялікі бел-чырвона-белы сьцяг. Славакі вакол трохі адхістваюцца. Пасьля перакладу на славацкую штосьці разумеюць і паглядаюць ужо па-сяброўску ды зь цікавасьцю. Мы стаім — некалькі беларусаў у чужой краіне, чужой сталіцы, на плошчы перад чужой філярмоніяй — і вітаем горача і натхнёна прэзыдэнта далёкай краіны з зусім не адназначнай палітыкай толькі праз тое, што ён спалучыў у сваёй прамове два знакавыя для нас словы — «свабода» і «Беларусь».

*24.02.2005, Браціслава*

**Х.Ясная**

ЗАМЕСТ ПАСЬЛЯСЛОЎЯ

## Час спускацца зь вяршыняў

У мінулым нумары «НН» у артыкуле «Час спускацца зь вяршыняў, або Ці бачны Менск з Браціславы» я пісаў аб тым, што надта мала падстаў чакаць, каб на сустрэчы прэзыдэнтаў ЗША і Расеі Буша і Пуціна абмяркоўвалася сярод іншых беларускае пытаньне. Дакладней, я засумняваўся, што падчас саміту будзе нейк закранацца лёс дэмакратыі ў Беларусі. Але я памыліўся, і ў дадзеным выпадку магу толькі радавацца сваёй памылцы. Адзін з двух удзельнікаў сустрэчы — Джордж Буш — ня толькі заўважыў Беларусь з вышыні браціслаўскага саміту. Ён выказаў упэўненасьць, што ў Беларусі — усьлед за Грузіяй, Украінай і, магчыма, Малдовай — таксама ўсталюецца дэмакратыя. Сказаў Буш аб гэтым не падчас перамоў з расейскім прэзыдэнтам, не ў кулуарах, а публічна — на плошчы ў цэнтры славацкае сталіцы. І тым больш гучна й пераканаўча, на ўвесь сьвет, яны прагучалі.

Зноў жа хачу паўтарыць сваю думку, выказаную ў артыкуле. Не ад самітаў і не ад прэзыдэнтаў іншых краін, у тым ліку нават такой вялікай дзяржавы, як ЗША, залежыць сёньня лёс Беларусі. Але ж варта дапусьціць, што словы амэрыканскага прэзыдэнта былі прызначаныя ня столькі ўсяму сьвету, колькі нам, беларускім грамадзянам. Кожнаму паасобку і ўсім разам. Толькі ці пачуем?..

**Віталь Тарас**

# Пожань—Прэсбург—Браціслава

Маё першае знаёмства са Славаччынай адбылося ўвосень 1998 году. Гэта была мая першая міжнародная місія па назіраньні за выбарамі. Менавіта тады Славацкая дэмакратычная кааліцыя перамагла на парлямэнцкіх выбарах, паклаўшы канец панаваньню папуліста У.Мечыяра. За шэсьць з паловай гадоў шмат чаго зьмянілася. Сёньня Славаччына ўваходзіць у Эўразьвяз. Менавіта сталіцу гэтай краіны абралі для правядзеньня сустрэчы прэзыдэнты ЗША і Расеі. Рэпартаж праваабронцы **Валянціна Стэфановіча**, які быў у Браціславе напярэдадні сустрэчы Буша з Пуціным.



WWW.ND.EDU

### Нятожа-вугорцы

Першай дзяржавай на гэтай тэрыторыі было Мараўскае княства, але ў 907 годзе яно было захоплена вугорскімі войскамі і надоўга ўвайшло ў склад Вугорскага каралеўства. Пазьней славацкія землі ўвайшлі ў склад Аўстра-Вугорскай імпэрыі. То быў складаны пэрыяд. У XIX ст. пасьля шэрагу няўдалых нацыянальна-вызваленчых паўстаньняў было зачынена больш за 80% славацкіх школ, праводзілася палітыка мадзярызацыі славакаў.

Славакам шмат чаго каштавала захавацца як нацыі і не ператварыцца ў «тожа-вугорцаў». У выніку паразы ў Першай сусьветнай вайне і распаду Аўстра-Вугорскай імпэрыі ў 1918 годзе Славаччына разам з Чэхіяй утварыла незалежную дзяржаву. Менавіта ў гэты час Браціслава атрымала сваю цяперашнюю назву. Да 1918 году яна насіла нямецкую назву Прэсбург, і на пачатку XX ст. у ёй пражывала да 50% немцаў і 30% вугорцаў. Славакі стагодзьдзе таму былі сялянскім народам, і ў гэтым іхнае першае падабенства зь беларусамі.

Цяпер Славаччына — гэта невялікая цэнтральнаэўрапейская краіна з насельніцтвам каля 5 млн чалавек і тэрыторыяй, памерам з нашу Менскую вобласьць.

Незалежнасьць Славакія атрымала ў выніку мірнага «разводу» Чэхаславакіі 1 студзеня 1993 г. Гэта ня першы досьвед існаваньня незалежнай Славацкай дзяржавы. Праўда, папярэдні прыпаў на складаныя гістарычныя ўмовы. У выніку акупацыі Чэхаславакіі нямецкімі нацыстамі 14 сакавіка 1939 году Ёжэф Ціса абвясьціў незалежную Славацкую дзяржаву, якая, праўда, знаходзілася пад нямецкім пратэктаратам. Але ў 1944 годзе ў Славакіі ўспыхнула антынацысцкае паўстаньне, разгарнуўся партызанскі рух. Улада ў Браціславе трымалася так няпэўна, што немцы былі вымушаны акупаваць краіну цалкам. У 1945 годзе Браціслава і Славакія былі вызвалены ад нямецкіх акупантаў часьцямі Чырвонай Арміі ды румынскімі фармаваньнямі, што прымкнулі да іх.

Пасьля былі славакі Дубчак і Гусак, але гэта ўжо больш вядомая гісторыя.

### Ленін беларускі

Я бадзяўся па вуліцах старой Браціславы, шукаючы хоць нейкія прыметы саміту. Але высілкі былі дарэмнымі. Горад і ягоныя жыхары жылі сваімі штодзённымі турботамі, а пра саміт нагадвалі толькі закрыты для наведваньня турыстамі старажытны Град — замак над Дунаем у цэнтры гораду — ды пару сувэніраў з сымболікай саміту ў адной з сувэнірных крамаў. Многія славакі сьмехам казалі, што ня ўпэўнены наконт месца правядзеньня саміту, прыгадваючы старую гісторыю пра тое, як Буш аднойчы пераблытаў Славакію са Славеніяй.

На адной з цэнтральных вуліц пад назвай Абходна (Гандлёвая) увагу прыцягнула шыльда аднаго з пабаў. На ёй было напісана «КГБ». Гэткая экзотыка для заходніх турыстаў у стылі «back in USSR». Унутры «КГБ» аказалася ўтульным падвальчыкам з шырокімі драўлянамі сталамі, за якімі моладзь піла піва ды слухала выступ нейкага мясцовага гурту. Сьцены клюбу былі ўпрыгожаны партрэтамі Леніна-Сталіна ды іншай савецкай атрыбутыкай. Маю ўвагу прыцягнуў вялікі гіпсавы бюст Леніна ля барнай стойкі. На бюсьце так было і напісана «Ленін», прычым кірылічнымі літарамі зь беларускай літарай «і». Вось так нечакана ў цэнтры Браціславы я сустрэў нашага беларускага Леніна, якому мы так і не сказалі сваё "гуд-бай».

### Славацкі мішка

У адзін з вольных дзён я шпацыраваў па Браціславе са сваёй чэскай знаёмай, што прыехала з Прагі. Мы проста хадзілі па горадзе і разглядалі вітрыны крамаў. У адной з кнігарняў мая знаёмая паказала мне славацкую дзіцячую кніжку і засьмяялася. Яе зьдзівіла, што на вокладцы дзіцячай кніжкі былі зьмешчаны славацкі герб і партрэты славацкіх дзеячаў адраджэньня, — гэта ж усяго толькі дзіцячая кніжка. Яна расказала мне гісторыю аб тым, як у Бэрліне яна бачыла фігуркі мішак з розных краін Эўропы — Аўстрыі, Францыі, Расеі, нават Беларусі. Усе мішкі былі проста вясёлыя мішкі, і толькі адзін славацкі мішка выконваў яшчэ і інфармацыйную функцыю: ён быў упрыгожаны гербам Славакіі і трыма партрэтамі дзеячаў славацкага адраджэньня пачатку XX ст. Гэта весяліла маю чэскую знаёмую, яна не разумела гэтага. Бо гэта ж былі ўсяго толькі вясёлыя мішкі, а не інфармацыйная шыльда каля амбасады.

# Сардэчна запрашаем у постбрацісла ўскі сьвет

Выбары ў Кыргызстане і Таджыкістане, рэфэрэндум наконт праекту эўраканстытуцыі ў Гішпаніі, візавы скандал зь Ёшкам Фішэрам, прапанова Хосьні Мубарака выбіраць эгіпэцкага прэзыдэнта прамым галасаваньнем, кансультацыі ЭС—Украіна... З усяго вадаспаду навін мінулага тыдня беларускага назіральніка больш за ўсё цікавіла брацісла ўская сустрэча Буша і Пуціна, дзе дзяржавы–мастадонты «дзялілі» постаранжавы сьвет. Прэсу аглядае **Лёлік Ушкін**.



СЯРГЕЙ САЛАШ

**БЕЛАРУСЫ Ў БРАЦІСЛАВЕ, на фоне трыбуны, зь якой выступаў Буш.**

Напярэдадні саміту ў газэтах было шмат спэкуляцый наконт абструкцыі, якую Буш паабяцаў учыніць Пуціну за аўтарытарызм у Расеі. Выданьне Паўлоўскага «Крэмль.org» нават параіла Пуціну актывізаваць напярэдадні ваяжу беларуска-расейскі праект і прыехаць у сталіцу Славаччыны ў статусе прэзыдэнта саюзу Беларусі і Расеі. Аднак жахі патрыётаў аказаліся перабольшанымі.

Ня дзіўна, што расейская прэса задаволеная вынікамі Браціславы: «Известия» назвалі сустрэчу «эталённам цывілізаваных адносінаў паміж краінамі». «Время новостей» лічыць, што Пуцін увогуле перамог у Браціславе, бо «насуперак шматлікім папярэднім абяцаньням Буша жорстка пакрытыкаваць Пуціна за праблемы з дэмакратыяй» прэса не пачула нічога падобнага.

Эўрапейскія камэнтатары асьцярожнічалі. Вугорская «Нэпсабатшаг»: «Амэрыка і Расея яшчэ ніколі не былі такія ўзаемна жорсткія, не гатовыя пайсьці на саступкі ў сваіх пазыцыях». Нямецкая «Зюддойчэ цайтунг» сьцьвярджае, што публічныя дэклярацыі аб сяброўстве на брыфінгах не даюць поўнай карціны ўзаемаадносін прэзыдэнтаў: «Пакуль Буш і Пуцін на людзях дэкляруюць жаданьне мірнага суіснаваньня, нешта накшталт вайны адбываецца на заднім пляне».

Большасьць СМІ разглядаюць вынікі Браціславы як перамогу прагматычнай плыні ў амэрыканскай замежнай палітыцы. «Франкфуртэр альгемайнэ цайтунг»: «Альтэрнатывы паглыбленьню амэрыканска-расейскіх адносін няма. Бяз згоды Расеі амэрыканцы ня здольныя паставіць пад кантроль пашырэньне зброі масавага зьнішчэньня». Што беларусам чакаць ад такога геапалітычнага пакту, які француская «Лібэрасьён» эмацыйна называе амэрыканскай «крывадушнасьцю»?

Магчыма, актывізацыі ў нашым рэгіёне можна чакаць з Бэрліна. Нямецкая прэса сярод эўрапейскай была найбольш халоднай да Буша. Адна з прычын негасьціннасьці — нежаданьне Буша бачыць у Нямеччыне глябальнага актора. «Тагесшпігель»: «Абодва бакі паабяцалі больш кантактаваць адзін з адным. Аднак яны не гатовыя да ўзаемнай павагі». «Вэльт»: Буш не шкадаваў фраз накшталт «дарагі Герхард» і «вялікі народ», аднак гэта не хавае факту, што ён не зьбіраецца прапанаваць Германіі годнае партнэрскае месца».

Магчыма, немцы будуць спрабаваць узьняць свой міжнародны аўтарытэт, у тым ліку і ва Ўсходняй Эўропе.

Як ні дзіўна, задаволена Бушам Францыя. Шырак і Буш разам дамагліся буйной перамогі ў Ліване, прымусіўшы Сырыю вывесьці адтуль свой кантынгент.

Францускі «Кур'е энтэрнасьяналь» цешыцца надзеяй, што з выводам сырыйскіх войскаў у Ліване будзе рэалізавана 1559-я рэзалюцыя ААН аб раззбраеньні парамілітарных груповак, у тым ліку і «Хезбалаг», якая фінансуецца Тэгеранам. У артыкуле пад назвай «Эфэкт даміно: ад Бэйрут у да Тэгерану» выданьне прагназуе: «Зьмена рэжыму ў Бэйруце будзе значыць для «Хезбалаг» трансфармацыю ў звычайную палітычную партыю. Гэта прывядзе да таго, што Іран зьменіць свае стратэгічныя падыходы адносна Ізраілю, і ў пэрспэктыве пераўтворыць мусульманскі сьвет».

У ліванскай сытуацыі беларусам найбольш цікавая мэтамарфоза масавай псыхалёгіі. Ліванцы доўгі час ставіліся да прысутнасьці сырыйцаў у краіне як да элемэнту інтэр'еру — прыблізна гэтак, як мы да расейскіх вайсковых баз. І раптам усе: ад друзаў да сунітаў — запатрабавалі ад іншаземцаў «гоў хоўм».

На ўсім гэтым ваяўнічым фоне эўрапейскіх СМІ надзіва апалітычна выглядаюць заакіянскія калегі. Загалоўкі іхніх штотыднёвікаў проста шакуюць сваімі мірнымі клопатамі: «Як пачынаецца атавізм» («Ньюсуік»), «Боль у сьпіне і ў каленях» («Тайм»), «Ці будзе здольны чалавечы мозг рабіць адкрыцьці, калі пачне працаваць па мадэлі кампутара» («Вайрэд»).




А я зразумеў. Як прадстаўнік самай закамплексаванай нацыі ў Эўропе, самаадрачэньню якой няма межаў, тлумачэньня і разуменьня, я разумею жаданьне славакаў самасьцьвердзіцца.

Я разумею жаданьне славакаў жыць самастойна, бо нельга ўвесь час быць у ролі малодшага брата, нават у сям'і брацкіх народаў. І што вельмі істотна, у Эўропе ёсьць месца для ўсіх народаў і краін. І для тых, хто можа ганарыцца шматвяковай гісторыяй існаваньня сваёй краіны, і для «новых» краін. Для ўсіх ёсьць магчымасьць самасьцьвердзіцца і расказаць сьвету пра сябе. Пры гэтым ніхто ня скажа пагардліва аб тым, што «такого государства никогда раньше не было».

У Новай Эўропе ёсьць месца для ўсіх.

### Кахайцеся, а не ваюйце

14 лютага на Дзень Сьвятога Валянціна мяне запрасілі на прагляд праваабарончых фільмаў, які быў наладжаны славацкім аддзяленьнем «Міжнароднай амністыі». Акцыя насіла назву «Пад маскай дэмакратыі». Прагляд адбываўся ў цэнтры Браціславы ў будынку пад знаёмай назвай «Дом культуры».

У залі сабралася надзіва шмат гледачоў — у асноўным студэнцкая моладзь. Перад пачаткам дэманстрацыі фільмаў была зачытана рэзалюцыя з нагоды саміту Буша і Пуціна, у якой абодва лідэры зьведалі жорсткую крытыку. Праваабаронцы заклікалі Буша ды Пуціна спыніць войны і забойствы мірных жыхароў падчас узброеных канфліктаў. Потым былі паказаны тры дакумэнтальныя праваабарончыя стужкі.

Першыя дзьве датычыліся правоў чалавека ў Расеі. Жахлівыя кадры чачэнскай вайны, інтэрвію з бацькам чачэнскай дзяўчынкі, згвалтаванай і забітай расейскім палкоўнікам Буданавым, — усё гэта пакідала жахлівае ўражаньне. Пасьля заканчэньня фільму ў залі некалькі хвілін стаяла поўная цішыня. Другі фільм быў прысьвечаны справе расейскага журналіста Рыгора Пасько, які быў асуджаны да чатырох гадоў пазбаўленьня волі за шпіянаж. Шпіянаж Пасько заключаўся ў тым, што ён адзьняў на камэру, як расейскія ваенныя караблі скідаюць радыяактыўныя адкіды ў Японскае мора. Матэрыял быў перададзены японскаму тэлебачаньню. Гэтага Пасько не даравалі. Цяпер ён сядзіць у турме. Акрамя гэтага, у стужцы паказалі іншыя «цуды» расейскай дэмакратыі — зьбіцьцё журналістаў, катаваньні і гвалт міліцыі над затрыманымі ды інш.

Фільм пра вайну ў Іраку быў пазбаўлены гэтых жахлівых карцінак. Ён грунтаваўся на інтэрвію вядомых амэрыканскіх дзеячаў (мабыць, вядомых у ЗША, бо ніводнага зь іх я ня ведаў, акрамя чарнаскурага праваабаронцы — біскупа Дэсманда Туту) аб вайне ў Іраку, яе прычынах і выніках, а таксама на кадрах акцый пратэсту амэрыканцаў супраць гэтай вайны. У фільме таксама падымалася праблема вязьняў амэрыканскай вайсковай базы «Гуантанама» на Кубе.

Пасьля прагляду моладзь вывалiла на вуліцу, на якой яна раздавала «валянцінкі» ў выглядзе чырвоных сэрцайкаў з надпісам «Make love, not war!» — «Кахайцеся, а не ваюйце!».

### Чардаш па славацку

Пры канцы тыдня я апынуўся ў мястэчку Шаморын за 20 км ад Браціславы. Акуратнае з дыхтоўнымі традыцыйнымі дамамі і старымі касьцёламі. Шаморын, або, па-вугорску, Шамор'я, адно з шматлікіх мястэчак, у якіх кампактна пражывае вугорскае насельніцтва. Наагул вугорцы, раскіданыя ўздоўж Дунаю, складаюць самую вялікую нацыянальную меншасьць Славакіі — 10% насельніцтва. Узаемаадносіны славакаў з вугорцамі ў ходзе гісторыі былі рознымі, часам вельмі складанымі.

На працягу XIX стагодзьдзя славакі ня раз уздымалі паўстаньні супраць мадзярскіх акупантаў. У Браціславе — па-вугорску Пожань — пасьля акупацыі Вугорскага каралеўства Асманскай імпэрыяй у XV ст. была перанесеная рэзыдэнцыя вугорскіх каралёў. Вось так і выйшла, што стаіць у сталіцы Славаччыны замак, у якім жылі вугорскія каралі, касьцёл, у якім іх каранавалі, а на сьцяне аднаго з будынкаў вісіць шыльдачка ў памяць аб 1400 славацкіх дзетках, гвалтоўна вывезеных на пачатку XX ст. у Вугоршчыну ў мэтах дэнацыяналізацыі. Вось у такім цяжкім гістарычным кантэксьце прыходзіцца суіснаваць славакам і вугорцам у незалежнай Славакіі.

У часы панаваньня ў Славакіі Мэчыяра вугорцы зазналі дыскрымінацыю. У краіне адчувалася напружанасьць. Некаторыя вугорцы ўсур'ёз забаяліся этнічных чыстак «а-ля Югаславія». Але ўлада зьмянілася, і людзі пачалі вучыцца жыць разам, у супольнай краіне, грамадзянамі якой яны ўсе зьяўляюцца. Вугорская палітычная партыя ў 1998 годзе ўвайшла ў склад апазыцыйнай кааліцыі СДК, забясьпечыўшы славацкім дэмакратам галасы вугорцаў, якія раней традыцыйна галасавалі толькі за свае нацыянальныя партыі. Вугорцы зрабілі свой выбар на карысьць новай будучыні сваёй краіны — Славаччыны.

Цяпер ва ўмовах аб'яднанай Эўропы славацкіх вугорцаў турбуе пытаньне нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Яны маюць сваіх прадстаўнікоў ва ўрадзе і парлямэнце краіны, вугорскія школы, газэты, тэлебачаньне, квоты для студэнтаў ва ўнівэрсытэтах Будапэшту.

У апошні вечар майго знаходжаньня ў Славакіі мы зь сябрамі зайшлі ў адзін зь мясцовых шаморынскіх бараў і выпадкова трапілі на сьвяткаваньне яго 10-годзьдзя. Гаспадар — смуглявы высокі Атыла — вельмі ўзрадаваўся візыту гасьцей зь Беларусі. Нас пачаставалі найлепшай гарэлкай «Баравічка» і смажаным парсючком. Было прыемна назіраць за гэтымі чарнявымі, тэмпэрамэнтнымі людзьмі. Асабліва цікава было чуць зь іх вуснаў славацкую мову — такую зразумелую і блізкую для беларускага вуха.

Ранішні аэрапорт Браціславы нагадаў мне аб будучым саміце. Каля будынку аэрапорту стаяла некалькі бронетранспартэраў і поўна мясцовых «амапаўцаў». Яны чакалі Буша з Пуціным.

# Уладзімер Колас:
# «Беларусы павінны навучыцца мець сваю ўладу»

«Павінна прыйсьці новая фармацыя палітыкаў, якая верне Беларусь з паралельнага вымярэньня ў рэальны час і зробіць яе перадавой эўрапейскай краінай». Уладзімер Колас адказаў на пытаньні карэспандэнта «НН».


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**«НН»: Многія, калі ім кажуць пра тое, што Колас вылучаецца кандыдатам у прэзыдэнты, пытаюцца: «Ён гэта сур’ёзна?» Скажыце, Вы сапраўды цалкам сьвядома ўключаецеся ў прэзыдэнцкую гонку? Ці маеце Вы настрой да перамогі і веру ў яе, жаданьне перамагчы?**

**Уладзімер Колас:** Асабіста мне часьцей даводзілася чуць якраз парады за гэта ўзяцца. А наконт настрою, жаданьня і да таго падобнага, то, ведаеце, я не люблю патэтыкі. Але гэтую праблему трэба вырашаць. Ад яе залежыць наш лёс. Ад яе залежыць будучыня маіх дзяцей і маіх вучняў. І будучыня маёй краіны. Мы падыходзім да апошняй мяжы, за якой ужо не застанецца магчымасьці вырашыць гэтую праблему цывілізаваным шляхам. Таму я стаўлюся да гэтай справы сур’ёзна.

**«НН»: Калі і чаму Вы вырашылі пайсьці ў вялікую палітыку?**

**УК:** Думаць пачаў пасьля 2001 году. Быў тады моцна ўражаны, як танна ўсё было здадзена. А яшчэ больш — тым, што людзі, у якіх я верыў і ад якіх чакаў канкрэтнай справы, нават не паспрабавалі яе зрабіць. Ну а пазьней палітыка сама прыйшла да мяне.

**«НН»: Ці зробіцца для Вас палітыка асноўным заняткам, прынамсі, на найбліжэйшы час?**

**УК:** Так, зробіцца.

**«НН»: Апішыце, калі ласка, ваш досьвед кіраўнічай працы.**

**УК:** Гэты досьвед ужо дастаткова апісаны. Думаю, не было ў Беларусі такой справы ці арганізацыі, якой было прысьвечана больш артыкулаў у айчыннай і замежнай прэсе, чым Беларускаму ліцэю. Хто мяркуе, што гэта здарылася выпадкова, ці само па сабе, той памыляецца. Дарэчы, доўгі час Ліцэй працаваў як Рэспубліканскі цэнтар Міністэрства адукацыі — распрацоўваў зьмест адукацыі і навучальныя праграмы, выдаваў кнігі і падручнікі, якімі маглі карыстацца ўсе беларускія школы, і меў філіі ва ўсіх абласьцях Беларусі.

Аднак хацеў бы засьцерагчы тых, хто сёньня зноў пачынае шукаць для беларусаў «бацьку», які будзе вучыць іх гуляць у хакей, перабіраць бульбу, пугай гнаць месьці вуліцу і фарбаваць траву… Ці меў, напрыклад, Вацлаў Гавал «досьвед кіраўнічай працы»? Але чэхі далі зь ім рады, і няблага.

**«НН»: Якую галоўную выснову Вы зрабілі са свайго ўдзелу ў парлямэнцкай выбарчай кампаніі?**

**УК:** Што перамагчы на выбарах — ня самая цяжкая праблема. Праблема — абараніць перамогу.

**«НН»: Ці маеце Вы перадвыбарную праграму? Якія галоўныя пункты яна мае і чаму? Калі можна вылучыць стрыжнёвую ідэю вашай будучай палітыкі, што гэта за ідэя?**

**УК:** Праграму, натуральна, маю. Дзесяць апошніх гадоў мы працягваем выпрацоўваць яшчэ бээсэсэраўскі рэсурс — з плянамі і задачамі, пастаўленымі яшчэ пры Машэраве, з адпаведнай структурай улады. Але сьвет зьмяніўся, і наша краіна нібы выпала са свайго часу. Цяперашняе кіраўніцтва, якое села на бээсэсэраўскага канька, ня хоча і ня можа разьвітацца зь ім, бо ня ведае, як гэта зрабіць. Павінна прыйсьці новая фармацыя палітыкаў, якая верне Беларусь з паралельнага вымярэньня ў рэальны час і зробіць яе не перадавой савецкай рэспублікай, а перадавой эўрапейскай краінай. Просты беларус не павінен жыць горш за немца ці француза.

Мы паступова і асэнсавана пяройдзем ад цяперашняй прымітыўнай сыстэмы ўлады да сучаснай мадэлі, у якой будуць прадстаўленыя інтарэсы ўсяго грамадства.

Галоўная мэта маёй праграмы — беларусы павінны навучыцца мець сваю ўладу. Мы надта доўга жылі пры чужой, а часам і варожай уладзе, якая заўсёды нам хлусіла, ніколі па-сапраўднаму ня дбала пра нашы інтарэсы, ад якой трэба было хавацца, да якой трэба было прыстасоўвацца, але спадзявацца толькі на сябе. Многія проста ня вераць у існаваньне іншай, сваёй улады, якая будзе дапамагаць, а не перашкаджаць нам жыць. Але недарэчна думаць, што такая ўлада можа ўсталявацца раптоўна, у выніку некалькіх «мудрых» указаў прэзыдэнта. Мая праграма прадугледжвае паэтапнае пераразьмеркаваньне ўлады, перадачу рэальных паўнамоцтваў мясцовым органам самакіраваньня, падзел улады паміж парлямэнтам, Радай міністраў і прэзыдэнтам, судом па меры таго, як усе ўдзельнікі гэтага працэсу будуць гатовыя да чарговага этапу.

Інакш кажучы, ніякіх рэвалюцый і землятрусаў я не пляную. Мы — усе разам — паступова і асэнсавана пяройдзем ад цяперашняй прымітыўнай сыстэмы ўлады да сучаснай мадэлі, у якой будуць прадстаўленыя інтарэсы ўсяго грамадства.

**«НН»: Што новага Вы прапануеце нашай гаспадарцы?**

**УК:** Тое самае будзе адбывацца і ў эканоміцы. Галоўнае злачынства кампартыйных ініцыятараў «перабудовы» ў тым, што яны ўвялі рыначныя мэханізмы, сьвядома не навучыўшы людзей імі карыстацца. Бо галоўнай мэтай тых дабрадзеяў было ня толькі памяняць форму ўласнасьці з калектыўнай на прыватную, але і хапнуць гэтую калектыўную ўласнасьць сабе.

Таму працэс разьдзяржаўленьня і прыватызацыі маёмасьці павінен адбывацца па меры таго, як для ўсіх людзей будзе рабіцца зразумела, што яны рэальна маюць і за што рэальна плацяць падаткі, што такое «акцыя», «біржа», «брокер» і г.д

Галоўным этапам у гэтай справе будзе ўвядзеньне прыватнай уласнасьці на зямлю.

Трэба выцягнуць наш прыватны бізнэс зь цені, у які яго ад самага нараджэньня загнала карумпаваная і некампэтэнтная ўлада. Безумоўна, вызначальную ролю ў гэтым адыграе рэформа падатковай сыстэмы, але ці можна спадзявацца на празрыстасьць і выкананьне законаў у сфэры бізнэсу пры адміністрацыі прэзыдэнта, якая падграбае пад сябе ўсе найбольш выгадныя сфэры і першая ігнаруе законы? Таму ад самага пачатку неабходна вызначыць: улада і бізнэс — рэчы несумяшчальныя.

Вядома таксама, што трэба рабіць з адукацыяй, падтрымкай моладзі, з чарнобыльскай праблемай, зь міжнароднымі адносінамі, але ня ведаю, ці варта цяпер пра ўсё гэта казаць. Думаю, яшчэ будзе час і нагода надрукаваць праграму цалкам.

Злачынства кампартыйных ініцыятараў «перабудовы» ў тым, што яны ўвялі рыначныя мэханізмы, сьвядома не навучыўшы людзей імі карыстацца. Галоўнай мэтай тых дабрадзеяў было хапнуць гэтую калектыўную ўласнасьць сабе. Мая праграма прадугледжвае празрыстыя і паэтапныя рэформы.

**«НН»: Калі Вы зробіцеся прэзыдэнтам, які будзе ваш першы ўказ, першае распараджэньне?**

**УК:** Жыцьцё пакажа, што будзе найбольш патрэбным і неабходным на той момант, калі адбудзецца тое, пра што Вы кажаце.

**«НН»: Вы вылучаныя не ад партыі, а ад Рады беларускай інтэлігенцыі. Беспартыйнасьць — гэта сьвядомы выбар? На чым ён грунтуецца?**

**УК:** Па-першае, на ўласных перакананьнях. Прэзыдэнт павінен быць у цэнтры, незаангажаваным і забясьпечваць роўныя ўмовы для дзейнасьці ўсіх партый. Па другое, я шчыра паважаю партыі і асабліва іх лідэраў, але паглядзіце на вынікі шматлікіх апытаньняў. Колькі працэнтаў насельніцтва не падтрымліваюць рэжым і колькі вераць у тое, што партыі могуць нешта зь ім зрабіць? Ці можна не прымаць гэта да ведама, калі мы хочам сапраўды працаваць на вынік?

**«НН»: Ці Вы ўжо маеце сваю каманду? Што гэта за людзі?**

**УК:** На апошнім сваім пасяджэньні Рада беларускай інтэлігенцыі прыняла рашэньне рэкамэндаваць мне далучацца да працэсу і аднагалосна прагаласавала за гэта. Цяпер сябры Рады і ёсьць мая каманда. І гэта для мяне — вялікі гонар, бо ўсе яны — вядомыя і выбітныя людзі. Апроч таго, мы супрацоўнічаем з шэрагам кампэтэнтных і дасьведчаных людзей зь вялікім вопытам дзяржаўнай працы. Але па вядомых прычынах ня варта цяпер іх называць. Усё толькі пачынаецца. Так што запрашаем у нашу каманду аднадумцаў!

**«НН»: Цяпер модна карыстацца парадамі «піяршчыкаў», «паліткансультантаў». Ці будуць такія людзі ў Вашай камандзе?**

**УК:** Безумоўна, такія людзі ўжо ёсьць. Але лічу, што калі ты для гэтай справы не падыходзіш, то ніхто табе і не дапаможа. Гэта як трэнэры для спартсмэна.

**«НН»: Чым Вы, на ваш погляд, адрозьніваецеся ад іншых кандыдатаў, уключаючы вядомага кандыдата «ад улады»?**

**УК:** Многія мае сябры — «канкурэнты» — сапраўды дасьведчаныя людзі зь вялікім палітычным вопытам. Тым больш я дагэтуль не магу зразумець, як некаторыя зь іх маглі ў свой час так памыляцца наконт сапраўднай сутнасьці таго, каго вы называеце «вядомым кандыдатам ад улады», дапамагаць яму заваладаць гэтай уладай, падтрымліваць ягоную палітыку. Што да мяне, то для мяне гэтая сутнасьць была відавочная ад самага пачатку, і я ніколі не пераходзіў зь лягеру ў лягер. Акрамя таго, у мяне ёсьць вопыт сапраўдных перамог. І рэальная справа, рэальныя здабыткі. Мне ўжо неаднаразова даводзілася чуць: пасьля таго, што нарабіў дырэктар сярэдняга саўгасу, менавіта дырэктар Беларускага ліцэю павінен вывесьці Беларусь на новы віток яе гісторыі. Бо так атрымалася, што менавіта ліцэй апынуўся ў авангардзе змаганьня з тым, што ўзды-

Працяг на старонцы 14.

**УЛАДЗІМЕР КОЛАС** (нар. 22 верасьня 1951 у Менску). Скончыў сярэднюю школу і Інстытут замежных моваў у Менску, Вышэйшыя рэжысэрскія курсы ў Маскве. Служыў у войску. Працаваў настаўнікам на Віцебшчыне, кінарэжысэрам на «Беларусьфільме». Стажаваўся па кінарэжысуры і кінапрадусарстве, пазьней — па эканоміцы і грамадзянскім самакіраваньні ў краінах Эўропы і ЗША.
У 1990 г. заснаваў і ўзначаліў Беларускі гуманітарны ліцэй.
З 1994 г. узначальвае Беларускі грамадзкі камітэт Каледжаў міжнароднай супольнасці (United World Colleges). Віцэ-прэзыдэнт грамадзкага аб’яднаньня «Эўрапейскі Рух» (з 2002). У 2003 г. абраны старшынём Рады беларускай інтэлігенцыі. Паводле зьвестак Балтыйскай службы Гелапа, быў падтрыманы абсалютнай большасьцю выбаршчыкаў сваёй акругі (63%) на выбарах у палату прадстаўнікоў 2004 году.
Жанаты, мае сына Мікіту і дачку Вольгу.

# Аляксандар Мілінкевіч: «Я сьвята веру ў перамогу»

Прадзед і прапрадзед Аляксандра Мілінкевіча былі ўдзельнікамі вызвольнага паўстаньня Каліноўскага, а дзед правёў два гады ў польскай турме за дзейнасьць у Таварыстве беларускай школы. «Адказнасьць перад продкамі і нашчадкамі абавязвае мяне перамагчы на гэтых выбарах», — сказаў А.Мілінкевіч карэспандэнту «НН».


АРЦЁМ ЛЯВА

**«НН»: Крыху нечакана было пачуць, што першай Вас вылучыла Беларуская партыя зялёных. Мы добра ведаем пра ўплывовасьць такой партыі ў Нямеччыне. А вось беларускія зялёныя — рэч малавядомая. Наколькі сур’ёзнае вылучэньне?**

**Аляксандар Мілінкевіч:** Да «Пяцёркі-плюс» наступнай, шостай партыяй далучыліся якраз зялёныя. Мэханізм вылучэньня прэтэндэнтаў у кандыдаты ад дэмсілаў такі: спачатку вылучаюць партыі, а потым рэгіянальныя кангрэсы, якія павінны адбыцца цягам наступнага месяца. Я зьвярнуўся да палітычных партый наконт маёй падтрымкі. Вядома, што большая іх частка мае сваіх кандыдатаў. Аднак дзьве партыі адгукнуліся і вылучылі мяне прэтэндэнтам на ролю адзінага кандыдата — гэта вельмі сур’ёзна і я за гэта партыйцам вельмі ўдзячны.

**«НН»: Дагэтуль некаторыя экспэрты лічаць, што Сямён Домаш, палітычна досыць нэўтральны, у час папярэдняй прэзыдэнцкай кампаніі дарэмна прыняў падтрымку ад БНФ, бо гэтым ён сабе пашкодзіў у вачах апалітычнай публікі. Ці ня лічыце Вы, што ў сёньняшніх умовах вылучэньне ад Партыі БНФ зьяўляецца амаль што «чорнай меткай»?**

**АМ:** Калі кандыдат хоча, каб яго падтрымала шырокая грамадзянская кааліцыя, яму патрэбна падтрымка ўсіх. БНФ — вялікая партыя па колькасьці сяброў і мае вопыт выбарчых кампаній. А штампы на лоб накшталт «агент сусьветнага імпэрыялізму» ўсё роўна будуць ставіць. Таму я не адчуваю вялікай небясьпекі ў тым, што мяне падтрымала Партыя БНФ, і ад прапановы такой падтрымкі я ня мог адмовіцца. Я ўдзячны сябрам Сойму за давер. Спадзяюся, што мяне падтрымаюць і іншыя партыі, а таксама рэгіянальныя кангрэсы. Чалавек, якога выберуць адзіным кандыдатам на прэзыдэнцкія выбары 2006 году ад дэмакратычных партый і арганізацый, павінен быць прадстаўніком усіх дэмакратычных сілаў Беларусі.

**АЛЯКСАНДАР МІЛІНКЕВІЧ** (нар. 25 ліпеня 1947 г. у Горадні ў праваслаўнай сям’і). Кандыдат фізыка-матэматычных навук, тэма дысэртацыі «Мэханізм генэрацыі звышмагутных лазэрных імпульсаў». Стажаваўся ва ўнівэрсытэце Манпэлье (Францыя) і Каліфарнійскім унівэрсытэце. Працаваў загадчыкам катэдры Сэтыфскага ўнівэрсытэту (Альжыр), дацэнтам Гарадзенскага ўнівэрсытэту. У 1990—1994 г. займаў пасаду намесьніка старшыні Гарадзенскага гарвыканкаму. Быў кіраўніком Беларускай асацыяцыі рэсурсавых цэнтраў. Вядомы краязнаўца і гісторык. Вёў гістарычную праграму на гарадзенскай тэлевізіі. Знайшоў пахаваньне апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, рэстаўраваў найстаражытнейшы ў Эўропе гарадзенскі вежавы гадзіньнік (XV—XVI ст.).

Нават калі мала шанцаў зьмяніць Выбарчы кодэкс, трэба патрабаваць гэтага і паказаць людзям, што рэжым ня хоча пайсьці на зьмены. Баіцца, бо слабы.

**«НН»: У 2001 г. кампанія С.Домаша была найлепшай з падтрымкай ва ўсіх рэгіёнах. Толькі ён здолеў правесьці агульнабеларускі зьезд прыхільнікаў, прычым вельмі прадстаўнічы. Але да яго ставіліся з рэўнасьцю, як да чужога, да правінцыяла. І некаторыя «сталічнікі» ўсё зрабілі, каб Домаш ня быў адзіным кандыдатам ад апазыцыі. Ці ня будзе зараз паўтору?**

**АМ:** Тады мэханізм вылучэньня адзінага кандыдата быў падобны. Існавала задума вызначыць адну або некалькі кандыдатур і прапанаваць іх Кангрэсу дэмакратычных сілаў. Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў працавала, і ўсе мелі надзею, што вось-вось будуць вынікі. Але КРДС зацягвала справу і цалкам страціла ініцыятыву, а потым увогуле перадала гэтае вырашэньне пяцёрцы кандыдатаў, што было вялікай памылкай. Пяцёрка вызначала паводле суб’ектыўных крытэраў, а не паводле аб’ектыўных. Домаш сапраўды быў мацнейшы, у яго была актыўная, прафэсійная каманда і структуры, у тым ліку і ў рэгіёнах — у 97 гарадах і мястэчках. У Домаша быў пазытыўны рэйтынг лепшы, чым у іншых прэтэндэнтаў, і подпісаў за ягонае вылучэньне сабралі больш, чым за іншых прэтэндэнтаў. Спрацаваў папросту нейкі эгаістычны прынцып: пры зачыненых дзьвярах вырашылі, што У.Ганчарык больш прыдатны для тых, хто галасаваў.

Можа, і цяпер будзе такое пэўнае нежаданьне дапусьціць рэгіянала. Але я пакуль што такога не адчуваю, да мяне наадварот ставяцца вельмі добра і з павагай, таму што факт жаданьня быць адзіным кандыдатам — гэта ня толькі вялікая адказнасьць, але ў нашых умовах і небясьпека для жыцьця. На нацыянальным Кангрэсе будзе большасьць рэгіянальных прадстаўнікоў, а не сталічных. Рашэньне будзе прымацца не кулуарна, а калегіяльна.

**«НН»: На што можа спадзявацца апазыцыя, Вы асабіста на прэзыдэнцкіх выбарах, калі Лукашэнка вырашыў не выпускаць уладу са сваіх рук? Як Вы ацэньваеце свае шанцы?**

**АМ:** Я думаю, што ва ўсіх сур’ёзных людзей, хто працуе ў грамадзкіх ці палітычных арганізацыях, няма сумневу ў тым, што сапраўдных выбараў ня будзе. Лічыць галасы пасьля выбараў улада ня стане, яна папросту прызначыць свайго кандыдата, як гэта было на выбарах у парлямэнт. Так і будзе з прэзыдэнтам. Але гэты прызначаны ёю прэзыдэнт будзе нелегітымны, гэта значыць, Беларусь фактычна застанецца без кіраўніка дзяржавы. Аднак адбудзецца такое ці не, залежыць выключна ад нас, грамадзян краіны. І таму адна з мэтаў будучай прэзыдэнцкай кампаніі — правядзеньне шырокай кампаніі ад дзьвярэй да дзьвярэй, каб абысьці як мага больш людзей і каб яны адчулі, што нас большасьць і што мы перамаглі. І калі мы створым такі пазытыўны настрой, пачуцьце сілы ў людзей і абаронім свой выбар, толькі тады мы будзем называцца сапраўднымі грамадзянамі, вартымі дастойнага жыцьця.

На першым этапе дэмакратызацыі дэмакратычны прэзыдэнт павінен быць моцным і дзейнічаць апэратыўна. Прыклад — сёньняшняя дзейнасьць Юшчанкі.

**«НН»: Існуе дакумэнт адносна таго, як немцы хацелі пасьля вайны выселіць у Сібір большасьць палякаў, іншыя народы, нават чэхаў. Беларусы ў гэтым дакумэнце названы «самым бяскрыўдным і таму самым бясьпечным» для немцаў народам. Але потым высьветлілася, што немцы памыляліся. Сёньняшняя ўлада таксама культывуе імідж беларуса як рахманага, бяскрыўднага для гэтай улады аматара «чаркі ды скваркі». У Вас ёсьць спадзяваньне, што ў беларусаў па-ранейшаму існуе ўнутраная моц, цяга да свабоды?**

**АМ:** Легенда пра тое, што беларусы сядзяць, а потым хапаюцца за зброю, ідуць у лясы і партызаняць… Тады была вайна, і хай усё гэта застанецца ў мінулым. Я супраць узброенага супраціву і крыві. Але я думаю, што, калі чалавека бясконца падманваюць, ён абавязкова павінен выйсьці на плошчу і мірна бараніць свае годнасьць і гонар. Адзінае, што нам перашкаджае гэта рабіць на дадзены момант, — гэта пачуцьце няўпэўненасьці, але гэта зьменіцца. Калі ў час прэзыдэнцкай кампаніі ўзьнікне пачуцьце веры ў свае сілы, крыўды за тое, што нас падманулі і падманваюць, будзе сфармавана пачуцьце перамогі, тады людзі абавязкова выйдуць бараніць свой выбар і сваё існаваньне.

Можна сказаць яшчэ пра тое, што за дзень да першага туру выбараў ва Ўкраіне самі ўкраінцы, якія рыхтавалі абарону сваёй перамогі, фактычна ня верылі, што такая колькасьць людзей выйдзе на плошчу сталіцы. Настаюць моманты ў жыцьці кожнай дзяржавы, калі раптам узьнімаецца хваля, нечаканая па памерах для ўсіх.

**«НН»: Улада вельмі пісьменна працуе, каб такой хвалі не было. Калісьці немцы высякалі лес уздоўж чыгунак, высялялі вёскі, якія былі побач, рабілі карныя апэрацыі супраць партызанаў. Сёньня ўлада таксама мэтадычна робіць зачыстку тэрыторыі — перасьледуе партыі, прафсаюзы, любыя дэмакратычныя арганізацыі, незалежную прэсу, нават Саюз пісьменьнікаў. Каб беларус ня мог бараніцца ад гвалту з боку гэтай улады, каб у яго не было рэальных палітычных правоў і свабод. Ва Ўкраіне ўсё ж было інакш, там улада не была такім ворагам грамадзтва.**

**АМ:** Тое, што ва Ўкраіне сытуацыя была іншая, гэта ўсе разумеюць. Асабліва ў інфармацыйнай прасторы. Было мясцовае самакіраваньне. Але ў мяне чаму ёсьць вялікі аптымізм — таму што, калі ўзяць 2001 год, у нас таксама не было фактычна электронных СМІ. І ня будзе іх у 2006 годзе. Але кампанія «ад дзьвярэй да дзьвярэй» за Домаша ў рэгіёнах паказала вялікую моц такога непасрэднага звароту да людзей. Людзі даведаліся пра Домаша, хаця не маглі яго ўбачыць на той момант. Проста актывісты, якія паверылі ў яго, сваёй працай, сваімі вачыма запаленымі, энэргіяй выклікалі ў людзей надзею, асабліва ў тых, што прагнулі зьменаў. Таму я веру, што ў нашых умовах можна толькі за кошт такой кампаніі дайсьці да жыхароў гарадоў, мястэчак і нават вёсак. У Менску і абласных гарадах будзе прасьцей. Карацей, я сьвята веру ў перамогу, і прыкладам таму — Домаш, якому ўдалося толькі за некалькі месяцаў падняць свой рэйтынг з нуля амаль да 20 працэнтаў. Гэта былі вынікі працы тысяч людзей па ўсёй краіне… І гэтыя людзі засталіся, іх ня стала менш. Яны будуць працаваць на адзінага. Далучацца і новыя пратэстныя групы, якія, дзякуй богу, улада стварае бесьперапынна.

**«НН»: Вы недзе ў інтэрвію сказалі, што выступаеце за парлямэнцка-прэзыдэнцкую рэспубліку, супраць празьмерных паўнамоцтваў аднаго чалавека. Канкрэтызуйце сваю пазыцыю.**

**АМ:** Многім так надакучыла гэтае прэзыдэнцтва Лукашэнкі, што здаецца небясьпечнай сама пасада. Некаторыя нават лічаць, што трэба ад яе адмовіцца ўвогуле. Бо раптам і наступны чалавек таксама будзе дыктатарам? У мяне ўжо пыталіся на сустрэчы ў Магілёве: а ты, можа, таксама будзеш дыктатарам? Тое, што зьмяншаць царскія паўнамоцтвы прэзыдэнта трэба, вядома ўсім. Тыя людзі, якія будуць прэтэндаваць на ролю адзінага кандыдата, падпішуць пагадненьне, што выступаюць за зьмяншэньне паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы. Але я адначасова лічу, што на першым этапе дэмакратызацыі якраз дэмакратычны прэзыдэнт можа зрабіць у гэтым кірунку значна больш і, галоўнае, хутчэй. Прыкладам — сёньняшняя дзейнасьць Юшчанкі. І тут у прэзыдэнта ўсе шанцы імгненна зрабіць тое, што парлямэнт будзе рабіць доўга. Новая ўлада павінна пашырыць паўнамоцтвы парлямэнту і Савету міністраў і даць моцны імпульс разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці.

Аснова пераўтварэньняў — стварэньне чатырох незалежных галін улады: прадстаўнічай, выканаўчай, судовай і СМІ.

**«НН»: Што датычыць выбараў: вельмі небясьпечна тое, што выканкамы ствараюць выбарчыя камісіі і праводзяць**

**Працяг на старонцы 14.**

# «Жырафы» рэктара Казуліна

У асяродках незалежнага грамадзтва працягваюць абмяркоўваць пераход у апазыцыю экс–рэктара БДУ Аляксандра Казуліна. У Рэдакцыю «НН» прыйшлі студэнтка 4 курсу філфаку і студэнт 3 курсу гістфаку БДУ — удзельнікі студэнцкага руху, якія змагаліся супраць абмежаваньня правоў студэнтаў у казулінскія часы. Яны палічылі патрэбным данесьці да чытачоў «НН» сваё бачаньне працэсаў, што адбываліся ў БДУ за Казуліным.

— Нас усхвалявала тое, што адбывалася, кампанія ў падтрымку Казуліна ў асобных СМІ, бо казулінскія часы ў БДУ вызначаліся русіфікацыяй, узмацненьнем кантролю і паўфэадальнымі парадкамі. Казулін стварыў службу аховы. Паглядзіце на здаровых дужых мужыкоў, што сьцерагуць спакой навукі ля кожнага слупа. Іх шмат: «чалавек прэзыдэнта» Казулін стварыў службу для кантролю за студэнцтвам. І такой службы ў іншых унівэрсытэтах няма.

У гэтым рэчышчы ішло і ўвядзеньне электронных студэнцкіх білетаў. Праз іх нашмат прасьцей кантраляваць перамяшчэньне і паводзіны студэнтаў, адсочваць электронную пошту (студэнтам прапанавана карыстацца Інтэрнэтам і поштай праз унівэрсытэцкі доступ на аснове карткавай сыстэмы). У 2003 г. гэтае новаўвядзеньне ўдалося сарваць, хоць цяпер яго ўсё адно ўкараняюць.

БДУ быў своеасаблівым фэадальным уладаньнем рэктара. Ён і паводзіў сябе адпаведна, ладзіўшы з кожным годам усё больш шыкоўныя фэсты і сьвяты. Напрыклад, сьвята Першакурсьніка ў аквапарку з прыбыцьцём рэктара на верталёце, сьпевы расейскіх зорак. Адначасова галоўная ВНУ краіны не знаходзіла грошай на аплату паслуг інтэрнэт-правайдэра і сядзела без Інтэрнэту. Адбывалася і камэрцыялізацыя ўнівэрсытэту. З году ў год больш станавілася платных паслуг (напрыклад, у бібліятэках). Ад некаторых зь іх адмовіцца было немагчыма. Напрыклад, быў вынайдзены спосаб штогадовага абнаўленьня электроннага студэнцкага білета.

**— Ці меў Казулін падтрымку сярод студэнцтва?**

— Інсьпіраваную адміністрацыяй — на сустрэчах са студэнцкім «актывам». У той жа час ён трэціраваў тых, хто пытаўся пабеларуску. Нават на апошняй сустрэчы (17 лістапада 2003) ён размаўляў зь беларускамоўнымі студэнтамі празь перакладчыцу. Тады ён, зьнерваваны ці што, ня вытрымаў пытаньняў шэрагу звычайных студэнтаў, якім удалося пратачыцца на мерапрыемства, і, можна сказаць, абразіў іх, назваў «жырафамі». Тыя запатрабавалі прабачэньняў, але Казулін перад «жырафамі» выбачацца ня стаў. Тады студэнты (хто не належаў да «актыву») пакінулі залю.

**— Вы гаворыце пра апошні пэрыяд кіраваньня…**

— Так, бо чуваць разважаньні пра эвалюцыю Казуліна. Маўляў, гэта спачатку ён быў «чалавекам прэзыдэнта», а пасьля адумаўся і выправіўся. Не было гэтай эвалюцыі.

**— Ці існаваў нейкі супраціў з боку студэнтаў?**

— За гады кіраваньня Казуліна ўнівэрсытэт зачысьцілі ад недзяржаўных моладзевых арганізацый (таго ж Свабоднага прафсаюзу). У выніку нам даваўся ўвесну 2003 г. заснаваць незарэгістраваны Камітэт за студэнцкае самакіраваньне (КСС), які змог сарваць прымусовае ўвядзеньне электронных студэнцкіх, здолеў сарваць выставу, што праслаўляла таталітарную савецкую мінуўшчыну — камсамол, правесьці іншыя акцыі.

Мы мусілі хавацца, робячы толькі ананімныя акцыі супраціву.

**— Вы не гатовыя дараваць Казуліну?**

— Хай спачатку папросіць прабачэньня за зьнявагі ў адрас беларускай мовы і студэнтаў. Мы не жырафы і маем гонар. Мы гатовыя размаўляць зь ім і гатовы сустрэцца зь ім пры пасрэдніцтве «Нашай Нівы». Выбачэньні — ня ганьба.

**Гутарыў Сяргей Рак**

# «Я сьвята веру ў перамогу»

Працяг са старонкі 13.

**выбары. Гэтая савецкая сыстэма пры Лукашэнку была ўзмоцнена. Што Вы пра гэта думаеце?**

**АМ:** У дэмакратычных краінах такога няма. Лепш за ўсё, каб не выканаўчая ўлада фармавала гэтыя камісіі, а, напрыклад, незалежная судовая ўлада. Абавязкова, каб у камісіях былі прадстаўлены розныя палітычныя плыні. Тады злоўжываньняў, махлярства будзе менш. Але ў сёньняшніх умовах калі судам ці саветам даручыць фармаваньне камісій, дык будзе тое самае, бо яны не незалежныя. Таму трэба мяняць сыстэму. Нават калі ў нас мала шанцаў зьмяніць Выбарчы кодэкс, трэба патрабаваць гэтага і паказаць людзям, што рэжым ня хоча пайсьці на зьмены. Значыць, баіцца. Баіцца, бо слабы.

**«НН»: Улада робіць усё, каб у людзей не было жаданьня змагацца за свае правы, каб такое жаданьне перамагаў страх. Вы — сярод тых, у каго такі імпэт пакуль застаецца…**

**АМ:** Калі я задумваўся над тым, адкуль у мяне ёсьць воля і рашучасьць да змаганьня за перамены ў нашай краіне, то прыходзіў да цьвёрдай высновы — гэта, перш за ўсё, ад продкаў, якія ахвяравалі сабой на карысьць барацьбы за незалежнасьць Беларусі, за свабоду. Мой дзед, таксама Аляксандар Мілінкевіч, быў адным з актыўных стваральнікаў суполак Таварыства беларускай школы на Гарадзеншчыне ў 1920-я гады мінулага стагодзьдзя. Калі Заходняя Беларусь адышла канчаткова да Польшчы, напачатку ён і ягоныя сябры спрабавалі атрымаць для беларусаў у Рэчы Паспалітай аўтаномію. Былі абяцаньні самога Пілсудзкага. Але потым, калі не ўдалося, уся праца ішла па стварэньні беларускай школы. Я ведаю, што ён зьвяртаўся з тэлеграмамі да Пілсудзкага, яны пісалі лісты, звароты. І за гэтую дзейнасьць ён трапіў у гарадзенскую турму і праседзеў два гады. Успамін пра дзеда — для мяне прыклад, які дае энэргію і моц духу для маёй далейшай актыўнай працы.

Дзед такім быў, бо ягоны бацька, мой прадзед Казімер, і бацька прадзеда — абодва таксама былі ўдзельнікамі вызвольнага паўстаньня. Яны жылі ў вёсцы Зубрава, на самай мяжы зь Літвой сёньня, на беразе Котры. Мелі маёнтак. Яго забралі за ўдзел у паўстаньні 1863 году. Такая вось патрыятычная сям'я. І для мяне гэта вельмі важна, калі я думаю пра сваё месца, пра тое, што я павінен рабіць сёньня. Я маю адказнасьць перад продкамі і нашчадкамі, для мяне гэта напраўду вельмі важна.

Аснова пераўтварэньняў — стварэньне чатырох незалежных галін улады: прадстаўнічай, выканаўчай, судовай і СМІ.

**Гутарыў Сяргей Максімовіч**

### Конкурс

Беларускі камітэт каледжаў міжнароднай супольнасьці абвяшчае конкурс на атрыманьне дзьвюх стыпэндый у міжнародных каледжах Нарвэгіі і Італіі.

У каледжах выкарыстоўваецца сыстэма міжнароднай перадунівэрсытэцкай адукацыі IB. Навучаньне вядзецца па-ангельску.

Мэта такіх каледжаў — усталяваньне ідэалаў міру, талерантнасьці і супрацоўніцтва паміж моладзьдзю розных краін праз адукацыю. Студэнт павінен як найбольш расказаць пра сваю краіну сябрам па вучобе з 150 іншых краін. Апроч выдатных акадэмічных ведаў, кандыдаты мусяць выдатна гаварыць па-беларуску, ведаць гісторыю і культуру Беларусі.

На першы тур конкурсу трэба дасласьць **да 4 красавіка** заяву з сваім адрасам і нумарам школы, даведку аб стане здароўя, ліст пасьпяховасьці за мінулы і гэты навучальныя гады, характарыстыку, зьвесткі аб удзеле ў вучнёўскіх алімпіядах, самадзейнасьці, спартовых сэкцыях, копіі грамат, дыплёмаў, твор на тэму «Ліст зь Беларусі» (да чатырох старонак вучнёўскага сшытку) па-беларуску ці па-ангельску. Пераможцы будуць выкліканы на другі тур, які адбудзецца 15 красавіка.

Дакумэнты дасылаць на адрас: РГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны», вул.Румянцава, 13, 220050, Менск (з пазнакай «На конкурс UWC»).

# «Беларусы павінны навучыцца мецць сваю ўладу»

Працяг са старонкі 12.

маецца з нашага саўгаснага мінулага і паралізуе нашае грамадзтва, не дазваляе яму разьвівацца, крочыць наперад. А галоўная перамога, якая даказала ўсім Беларусам і ўсяму сьвету вартасьць і трываласьць каштоўнасьцяў, на якіх грунтуецца Ліцэй — тое, што і вучні, і іхнія бацькі, і выкладчыкі прынялі рашэньне застацца зь Ліцэем і працягваць нашу справу, калі яе пасправабалі зьнішчыць, нягледзячы на небясьпеку, якую нёс такі выбар асабіста кожнаму. Гэты выбар уразіў мяне так, як ня ўражвала нішто ў жыцьці. З таго часу гэта для мяне — як незагоеная рана ў душы, якая ні на хвіліну не дазваляе разьняволіцца, падумаць пра нешта іншае. Але я разумею, што Ліцэю будзе добра толькі тады, калі будзе добра ўсёй Беларусі...

Ну, а ад «вядомага ад улады» я адрозьніваюся проста ўсім.

**«НН»: Як Вы ацэньваеце працэс вылучэньня адзінага кандыдата ад апазыцыі? Ці рухаецца апазыцыя ў правільным кірунку? Якія Вы бачыце адрозьненьні ад падрыхтоўкі да мінулых прэзыдэнцкіх выбараў?**

**УК:** На маю думку, тут многае вырашае пакліканьне — ці адчувае чалавек унутраны покліч вывесьці сваю краіну з застою. Калі не адчувае, дык і людзі ніколі ня выйдуць на плошчы, каб абараніць ягоную-сваю перамогу. Інакш кажучы, пытаньне ня ў тым, ці выбралі цябе адзіным кандыдатам, а найперш у тым, ці адчуваеш ты такое пакліканьне, сваю місію і тое, што на абарону тваёй перамогі падымуцца масы.

Што да адрозьненьняў, то яны — навідавоку. Тады тыя, хто дзесяць год біў сябе кулакамі ў грудзі, увогуле не парупіліся, каб канкрэтна вызначыцца, своечасова і прафэсійна «раскруціць» сапраўдную пэрспэктыўную кандыдатуру. Замест яе ў самы апошні момант узьніклі тыя, каго ніхто не чакаў і не жадаў. Гэта і вызначыла вынік. Цяпер спахапіліся раней. Але небясьпека ня столькі ў адрозьненьнях, колькі ў падабенствах. Іх, на жаль, таксама хапае.

**«НН»: Ці кантактуеце Вы зь іншымі кандыдатамі? Як рэгулярна? Што абмяркоўваеце?**

**УК:** Так, кантактуем рэгулярна. Усе яны — сапраўды талковыя і годныя людзі. Гэта выдатная каманда. Спадзяюся, адбудзецца момант, калі ўсе сасьпеюць для таго, каб «выкласьці карты на стол» і прыняць неабходнае рашэньне. Прынамсі, я — за гэта.

**«НН»: Чым Вы зараз зарабляеце сабе на хлеб?**

**УК:** Я здымаю кіно, вучу і перакладаю зь некалькіх моў, пішу сцэнары, артыкулы, урэшце магу рабіць мэблю, правесьці электрычнасьць і водаправод ды шмат чаго іншага. Жыцьцё навучыла выкарыстоўваць усё гэта ў залежнасьці ад магчымасьцяў і неабходнасьці. Так што з голаду ніколі не паміраў, і сям'я ніколі не галадала.

**«НН»: Ваша хобі?**

**УК:** Маю надта шмат прафэсійных заняткаў, таму на хобі проста няма часу. Напрыклад, нядаўна скончыў чарговы фільм. А цяпер працую над кнігай. Усё гэта раблю «ў вольны ад асноўнай працы час». Таму ўчора пакладуся ў 3 ночы, сёньня падняўся ў 6 раніцы. Тут не да хобі. А ўвогуле, добра было б калі-небудзь зноў пасядзець з вудай на Браслаўскіх ці паплаваць з маскай у Чорным моры і палавіць крабаў...

**«НН»: Чаго Вы больш за ўсё ня любіце ў людзях? І наадварот, якія якасьці паважаеце?**

**УК:** Люблю, як гэта ні банальна гучыць, шчырасьць і ветлівасьць, а ненавіджу хамства і хлусьню.

**«НН»: Ваша любімая страва?**

**УК:** Калі шчыра — вустрыцы. Каштаваў іх толькі некалькі разоў у жыцьці, можа, таму яны для мяне заўсёды прывабныя, як нязьдзейсьненая мара.

**«НН»: Што кажуць пра Ваша рашэньне вылучацца блізкія людзі, сябры?**

**УК:** Мама і жонка супраць, бо ведаюць, чым усё можа скончыцца. Але яны будуць заўсёды са мной і за мяне. Сябры — таксама.

**«НН»: Ёсьць меркаваньне, што палітыка зьмяняе людзей, часам ня ў самы лепшы бок. Ці адчуваеце Вы, што зьмяняецеся? У чым гэта праяўляецца?**

**УК:** Бадай што не. Мяняецца хіба рытм жыцьця, паскараецца ў некалькі разоў, хаця і да таго ён быў ня надта павольны. А ўвогуле, гэта справа цікавая і захапляльная, таму што тут вялікую ролю адыгрываюць імправізацыя і азарт.

Многія мае сябры — «канкурэнты» — сапраўды дасьведчаныя людзі. Тым больш я не магу зразумець, як некаторыя зь іх маглі ў свой час так памыляцца наконт сапраўднай сутнасьці таго, каго вы называеце «вядомым кандыдатам ад улады», дапамагаць яму заваладаць гэтай уладай, падтрымліваць ягоную палітыку.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# ПГД, прысяга і далей

**СЯМЁН ПЕЧАНКО**

**Працяг. Пачатак у №6.**

ПГД — паркава-гаспадарчы дзень, насамрэч ня дзень, а цэлыя два. Паркавы праводзіцца ў пятніцу, гаспадарчы — у суботу. У пятніцу з раніцы салдаты кіруюцца ў парк, дзе завіхаюцца ля тэхнікі ды прыбіраюць тэрыторыю. Маладое папаўненьне на час карантыну да працы ў парку не прыцягваецца — каб пазьбегнуць непажаданых кантактаў са старaслужачымі.

Але работы і каля казармы заўсёды хопіць — прыбраць пляц, навесьці трасіроўку — перакапаны і пасыпаны пяском шнурочак зямлі ўздоўж бардзюру шырынёй у штых рыдлёўкі. Першая субота ў войску запомніцца грандыёзным марафэтам у казарме — з вынасам мэблі і шкрабаньнем падлогі шклом. Папярэдне падлогу шчодра змочваюць вадой і намыльваюць. Да абеду трэба навесьці бляск ва ўсіх памяшканьнях, уключна з трайніком і навучальнымі клясамі. Калі не пасьпееце да абеду — працягнеце пасьля сталоўкі. Зь цягам часу навучыцеся ўкладацца ў тэрмін, каб зэканоміць час на тэлевізар.

Калі ў часьці чакаецца візыт высокага начальства, то варта рыхтавацца да таго, што ПГД зацягнецца не на дзень і не на два. Мне пашчасьціла, бо нягледзячы на тое, што на працягу маёй службы да нас наведваліся міністар абароны і камандуючы сухапутных войскаў, падрыхтоўка да іх прыезду абыходзілася бязь лішняга фанатызму — прынамсі, нам не давялося фарбаваць лісточкі на дрэвах.

Гаспадарчы дзень здараецца неабавязкова ў азначаныя дні. Бываюць цэлыя гаспадарчыя тыдні, калі ў памяшканьнях казармы робіцца нейкі рамонт ці проста неабходна чымсьці заняць салдат — для большасьці камандзіраў выгляд нічым не азадачанага салдата ёсьць ненатуральным.

Першае наведаньне лазьні зробіць вам адкрыцьцё, што гарачая вада ў войску ўсё ж ёсьць, бо ў іншых выпадках, акрамя хіба яшчэ сталоўкі, яе няма. Мыцца штодзённа і зімой, і летам даводзіцца халоднай. Вялікія часьці маюць свае лазьні, нам жа даводзілася хадзіць у гарадзкую. І першы паход у лазьню стаўся да ўсяго першым выхадам у вольны сьвет. Памыўка тут адбываецца па адмысловых нарматывах: на разьдзяваньне-адзяваньне — столькі хвілін, на непасрэдна мыцьцё — столькі. Міжволі пачынаеш чакаць дня, калі будзеш мыцца колькі хочаш. Яшчэ адна навіна чакае вас у лазьні: новая бялізна, аказваецца, даецца ў арміі толькі двойчы — першы раз, калі вас апрануць ва ўсё вайсковае, і перад прысягай. Але ня варта баяцца ношанай бялізны, бо яна праходзіць адмысловы апрацоўку. Сачыць трэба толькі, каб атрымаць споднясвайго памеру.

Набліжаецца прысяга і заняткі па страявой робяцца ўсё больш працяглымі. Асабліва складана тым, хто трапіў у войска апошнім, бо брак часу не вызваляе вас ад адказнасьці за якасьць мерапрыемства. Але вось і той чаканы дзень, калі пад урачысты барабанны пошчак вы выйдзеце са зброяй на пляц і пашыхтуецеся ў вызначаным месцы. За ўсім гэтым будуць назіраць вашы сваякі і сябры. Падчас працэдуры прыняцьця прысягі забаронена глядзець па баках. Мабыць, каб, сутыкнуўшыся з позіркам некага са сваіх, не расхвалявацца. Мова, на якой зачытваецца тэкст урачыстай прысягі, выбіраецца самім вайскоўцам. Нашы сяржанты ўсяляк заахвочвалі і віталі выбар на карысьць беларускай мовы, матывуючы тым, што гэта і будзе праявай сапраўднага патрыятызму. З усяе роты — сарака чалавек — толькі трое гэтак зрабілі, не чакаючы пры гэтым ніякіх заахвочваньняў. Праўда, двое з гэтых траіх пасьля ўступілі ў БРСМ.

Пасьля таго як усе прымуць прысягу, даецца некалькі хвілін на тое, каб павітацца з роднымі, сфатаграфавацца на памяць. Потым настае чарга ўрачыстага маршу і праходжаньня зь песьняй. Родным зладзяць экскурсію па казарме, яны паназіраюць, як вы будзеце харчавацца ў сталоўцы. А вас зьдзівіць зьяўленьне новых сталовых прыбораў накшталту відэльцаў і чайных лыжак. Як і нязвыкла тлусьцейшыя катлеты і цукеркі зь печывам. Але асаблівага апэтыту гэта ня выкліча на тле таго, што прывезьлі з сабою бацькі. Дый само нецярпеньне, зь якім вы будзеце чакаць першага звальненьня, ня дасьць вам асабліва задумвацца пра ежу.

Вось вы дрыготкай рукой падпісваеце «звальняшку», абяцаючы не купацца ў неабсталяваных месцах і не ўжываць сьпіртное і, нарэшце, свабода! Мясцовыя рушаць дамоў, іншагароднія накіроўваюцца ў гарадзкія паркі. Тут і зьявіцца апэтыт, і вы атрымаеце поўную сатысфакцыю за начныя мроі аб хатніх стравах. Ці варта казаць, зь якім сумам вы будзеце разьвітвацца з роднымі, зь яшчэ большай сілай прагнучы наступнай сустрэчы.

Такім чынам, прысяга стане для вас завяршэньнем першага, найбольш складанага этапу службы. З гэтага моманту на вас ускладаецца адказнасьць за яе выкананьне і гонар служыць сваёй Радзіме. З наступнага дня здымецца абмежаваньні, абумоўленыя карантынам, пачнецца служба ў нарадах у межах усёй часьці. Спаганяць за нейкія правіннасьці таксама будуць больш грунтоўна — ад нечарговага нараду на службу і пазбаўленьня чарговага звальненьня да арышту на гаўптвахту. Зрэшты, тут усё залежыць асабіста ад вас і вашых паводзін — будзеце вы па выходных у звальненьні ці ў нарадзе.

Наступным разам пра тое, чым кормяць у вайсковай сталоўцы і як паводзіць сябе ў звальненьні.

**Працяг будзе.**

## Куды скардзіцца салдату, калі яго правы парушаныя

Прыёмная міністра абароны
220034, Менск, вул.Камуністычная, 1, т.: 288-14-43

Беларускі вайсковы суд
220034, Менск, вул.Азгура, 4, т.: 297-15-52

Беларуская вайсковая пракуратура
220034, Менск, вул.Азгура, 4, т.: 297-14-48

Менская міжгарнізонная вайсковая пракуратура
220030, Менск, вул.Кірылы і Мяфодзія, 6, т.: 227-46-12

Менскі міжгарнізонны вайсковы суд
220030, Менск, вул.Кірылы і Мяфодзія, 6, т.227-46-97

Псыхалягічны тэлефон даверу Міністэрства абароны (для Менску), т.: 229-14-14

Рэспубліканскі камітэт Беларускай арганізацыі салдацкіх мацярок
220029, Менск, вул.Чычэрына, 19-404, т.: 239-46-85

# Грэчка

**АЛЕСЬ БЕЛЫ**

Так цудам зноў нас вернеш
на Айчыны ўлоньне.
Тым часам перанось дух сумны
мой сягоньня
У край лясных узгоркаў
і лугоў духмяных,
Шырока над блакітным Нёмнам
разасланых,
Да каляровых ніў,
дзе жыта серабрыцца
І залачоная калышацца пшаніца,
Дзе грэчка, быццам сьнег, сьвірэпка,
як бурштыны,
І дзяцельнік гарыць
румянцамі дзяўчыны.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Так пісаў Міцкевіч у «Пане Тадэвушу». У ягоныя часы палеткі, белыя ад кветак грэчкі, быццам засыпаныя сьнегам, былі адным з паэтычных вобразаў-сымбаляў Беларусі. У «Пане Тадэвушу» грэчка згадваецца ня раз: аднаго з герояў завуць Грачэха, жаніцьба пагражае Тадэвушу пэрспэктывай стаць дамаседам-«грэчкасеем», а стол апошняй старасьвецкай бяседы ўпрыгожваюць дэкаратыўныя палеткі грэчкі, зробленыя з шакаляду. Грэчку ў нас калісьці шанавалі ўсе — ад самага беднага селяніна да самага пышнага магната.

Масавая сьвядомасьць звыкла ўспрымае грэчку як адзін са злакаў, але калі верыць батаніцы, грэчка — «аднагадовая травяністая расьліна сям'і драсёнавых». Яе блізкія сваякі — рэвень і шчаўе. Але з усіх сваякоў толькі яна мае такі адносна вялікі, і прытым смачны і пажыўны, трохгранны арэшак, падобны формай да букавага. Галяндцы, якія пазнаёміліся з грэчкай досыць позна, у XV ст., так яе і празвалі — «букавая пшаніца» («boechweite»), а ад іх гэтую назву пазычылі брытанцы.

У назвах легендарнай калісьці расьліны канспэктыўна запісана гісторыя Эўропы. Французы і італьянцы, якія сутыкнуліся з прыгожай незнаёмкай падчас крыжовых паходаў, дагэтуль называюць яе «сарацынскім просам», а палякі доўгі час называлі «татаркай», бо яна ўвасабляла для іх жах ад татарскай навалы XIII ст. Аднак урэшце яны пазычылі ад усходніх славян назву «грыка», бо продкі беларусаў, украінцаў і расейцаў атрымалі грэчку быццам бы ў дадатак да Хрыстовай веры, зь Бізантыі, ад грэкаў.

Упершыню ж грэчку, ураджэнку Гімаляяў, пачалі культываваць у кітайскай правінцыі Юнань каля V ст. н.э., і яшчэ праз 200 зь нечым гадоў яна пачала распаўсюджвацца на ўсход, у Японію ды Карэю, на поўнач — у Манголію і Сібір, і на захад — у Пэрсію і Бізантыю.

Хто пажыў у час разьвітага сацыялізму, памятае, якім дэфіцытам лічылася тады грэчка, якую куплялі або па спэцыяльных картках для дыябэтыкаў, або ў складзе сьвяточных прадуктовых набораў. Іранічна кажучы, гэта чымсьці нагадвае становішча на сучасным Захадзе, дзе купіць грэчку можна ня столькі ў супэрмаркеце, колькі ў краме «здаровай ежы». Праўда, хутчэй грэцкую муку (якую ў нас мала дзе ня знойдзеш), чым крупы.

Сапраўды, грэчка добра надаецца для разнастайных дыет. Яе бялкі пераважна добра засвайльныя, тлушч вылучаецца ўстойлівасьцю пры захоўваньні (амаль не ялчэе), грэчка мае менш вугляводаў і больш клятчаткі, чым іншыя крупы. Адсутнічае глютэн, якога так пазьбягае сучасная заходняя дыеталёгія. У грэцкіх крупах у пяць разоў больш вітаміну $B_1$, чым у манных крупах, і ў два разы больш, чым у ячных, а вітаміну $B_2$ у 2,5 разу больш, чым у любых іншых крупах. Шмат нікацінаміду і мінэральных рэчываў (кальцыю, магнію, фосфару, жалеза).

Вельмі доўгі час каша з грэцкіх круп адыгрывала надзвычай важную ролю ў харчаваньні беларусаў. Беларуская кухня можа, дакладней магла, пахваліцца ці ня самым шырокім у сьвеце наборам страў з грэчкі — сярод якіх, зрэшты, не было грэцкага плову, які спрабавалі былі навязаць у якасьці «нацыянальнай стравы» толькі пасьля Другой сусьветнай вайны. Гэта і своеасаблівая падпражаная каша з грэцкай мукі «лямешка» (або «пражуха»), разнастайная выпечка з грэцкай мукі ў выглядзе бліноў з начынкай і без, булак, пірагоў — грэцкія калдуны, грачанікі, таўкачыкі, паляніцы, шалтаносы і г.д., цяпер амаль невядомыя. А знакамітыя грэчаныя пелюхі з маслам!

Фарш з дабаўленьнем грэцкіх круп незаменны ў найлепшых гатунках традыцыйных крывяных кілбас, якія, спадзяемся, колісь будуць прадавацца ў беларускіх гіпэрмаркетах. А на заканчэньне, калі чытач пранікся павагай да сьціплай прыгажуні грэчкі і адчуў апэтыт, — прапануем рэцэпты.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**АЛЕСЬ БЕЛЫ** (нар. у 1968 у Менску) — дасьледчык гісторыі матэрыяльнай культуры. Сябар рэдкалегіі часопісу «Спадчына». Ляўрэат прэміі Беларускага ПЭН-цэнтру імя Ф.Багушэвіча 2001 г.

### Грэцкая каша «па-Радзівілаўску»

**Першы варыянт:**
250 г грэцкіх круп, 2 шклянкі вады, 1,5 лыжкі тлушчу, яечны бялок, 200 г жоўтага цьвёрдага сыру, 5—6 лыжак кетчупу, соль, а таксама тлушч і паніровачныя сухары для посуду.

Прыгатаваць грэцкую кашу, перамяшаць яе зь цёртым сырам і бялком. У вымазаную тлушчам і пасыпаную паніровачнымі сухарамі пасудзіну выкласьці кашу, паліць кетчупам, запячы.

**Варыянт другі:**
250 г грэцкіх круп, 2 шклянкі вады, 1,5 лыжкі масла, яечны бялок, 4 яйкі, 100 г цукру, 40 г разынак, соль, а таксама тлушч і паніровачныя сухары для посуду.

Прыгатаваць грэцкую кашу. Яйкі абмыць, выбіць у пасудзіну, перамяшаць з цукрам. Пасудзіну зь яйкамі паставіць у каструлю з гарачай вадой і падаграваць на пары, пакуль маса не загусьцее. Трэба, аднак, сачыць, каб вада ў каструлі не закіпела. Затым перамяшаць атрыманую масу з кашай і разынкамі. У вымазаную тлушчам і пасыпаную сухарамі пасудзіну выкласьці кашу, выраўнаваць паверхню і запячы ў гарачай духоўцы.

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Бел-чырвона-белым нумарам прысьвячаецца

Найгоршаю навіною летась для Маленькага Хлопчыка стала жаданьне даішнага чыноўніцтва ўвесьці новыя аўтамабільныя нумары. Прыйшла навіна, крыху патрэслася ў паветры і зьнікла. У нас у краіне ўвогуле не прынята ўсеагульна абмяркоўваць такія пытаньні. Маўчала дзяржтэлерадыё і аднолькава зь ім дзяржаўная ды недзяржаўная прэса. І ён, наш Маленькі Хлопчык, стараўся маўчаць, каб, крый божа, не сурочыць — можа, забыліся?..

Так мінаў час. Зіма... вясна... Аж пакуль аднаго дня на Прывакзальнай плошчы, стоячы ля акна аўтобуса, ён не разгледзеў па-над літарамі BY на яшчэ новай бляшанцы чырвона-зялёны сьцяжок.

Маленькаму Хлопчыку стала вельмі шкада. Так, нібы ў яго забралі любімую цацку. Бо бел-чырвона-белыя аўтамабільныя нумары заставаліся ў ягоным жыцьці амаль адзінай незабароненай, няхай і стылізаванай, выяваю бел-чырвона-белага сьцяга.

З нумароў зьдзекаваліся даўно. Спачатку вось прымушалі малюначак «Пагоні» заклейваць налепкай. Лёс гэтых нумароў вырашыўся, на жаль, яшчэ на рэфэрэндуме 1995 году. Але чаму, чаму іх замянілі менавіта зараз?!

Шкада стала і беларускае адметнасьці, якая цяпер страцілася між шэрагу чорна-белых нумароў сярод чорна-белых людзей. А бывала ж, беларусаў заўважаў за паўвуліцы і ў Кіеве, і Варшаве і з аднолькавай радасьцю ўздымаў правую руку, каб павітаць.

Абурае (але аднаму абурацца не выпадае), што новыя аўтамабільныя «зоны» — нумары абласцей, пазначаныя апошняй лічбай, пранумараваны ў парадку не беларускай, а расейскай мовы. І шкада, што пра такія дробязі мала хто задумваецца.

**Галіна Дубовая, форум www.nn.by**

### Дуліна ад Барадуліна ў Мазыры

24 лютага ў мурах Мазырскага пэдунівэрсытэту адбылася творчая імпрэза, прытарнаваная да 70-годзьдзя Рыгора Барадуліна. Зладзілі яе студэнты філфаку і супрацоўнікі катэдры беларускае літаратуры. Са сцэны гучэлі барадулінскія вершы розных гадоў, песьні на розных вершы. Гледачы мелі мажлівасьць адчуць шматстайнасьць таленту паэты: была ў праграме незалежніцкая, філязофская, інтымная лірыка, показкі, жарты й досьціпы. Адмыслова была прэзэнтаваная кніга «Дуліна ад Барадуліна». З днём нараджэньня, дзядзька Рыгор!

**Усяслаў Церашковіч, Мазыр**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы.

Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

## ДЛЯ ЗАЦІКАЎЛЕНЫХ АЎТАРАЎ

### «Польшча вачыма беларусаў»

Увесну плянуецца выданьне другой кнігі з сэрыі «Іншаземцы пра палякаў». Першая кніга «Польшча вачыма ірляндцаў», выдадзеная тры гады таму ў ангельска-польскай вэрсіі, зьмяшчае ўспаміны ірляндзкіх настаўнікаў, якія выкладаюць ангельскую мову ў польскіх школах.

«Польшча вачыма беларусаў» працягвае гэты цыкл: польска-беларуская вэрсія будзе складацца з апавяданьняў пра палякаў, напісаных беларусамі — прадстаўнікамі чатырох розных груп: студэнтаў, якія вучацца ў Польшчы, беларусаў, якія стала пражываюць у Польшчы, беларусаў, якія ніколі не былі ў Польшчы, і беларусаў, якія прадстаўляюць розныя прафэсіі — настаўнікі, прадпрымальнікі, чыноўнікі і г.д.

Літаратурная форма можа быць адвольная: эсэ, лісты да сяброў, дзёньнікі, свабодныя заўвагі. Аб'ём — ня больш за 10 старонак (фармат А4, 30 радкоў, каля 1800 знакаў на старонку). Прымаю таксама рукапісы — графічная форма тэкстаў можа быць адвольная.

Аўтарам гарантуецца, калі яны папросяць аб гэтым, ананімнасьць. Тэксты ніякім чынам ня будуць рэдагавацца. Найбольш цікавы, найменш схематычны і сьмелы тэкст будзе ўзнагароджаны грашовай узнагародай у памеры 500 злотых. У склад журы ўваходзяць журналісты Любліна. Інфармацыйную падтрымку выданьню забясьпечвае газэта «Люблінскі кур'ер». Кнігу падтрымлівае пасольства Польшчы ў Беларусі.

Зьвяртаюся да спадарства зь ветлівай просьбай прысылаць свае працы на польскай, беларускай ці расейскай мове да 31 сакавіка на адрас: Bogdan Wagner, ul.Farbiarska 8, 20 107, Lublin, альбо на э-адрас: wagner@world.pl.

# Аб стане канстытуцыйнай законнасьці

**УЛАДЗІСЛАЎ БЕЛАВУСАЎ**

На пачатку лютага Канстытуцыйны суд зьвярнуўся з пасланьнем аб стане канстытуцыйнай законнасьці ў Беларусі ў 2004 г. Але толькі самага легкавернага й неабазнанага чытача можа ўсхваляваць патас назвы. Штогадовы дакумэнт, прадугледжаны Канстытуцыяй ды Законам аб Канстытуцыйным судзе, даўно пераўтварыўся ў прыгожую паштоўку прэзыдэнту і парлямэнту ад судзьдзяў у пекных мантыях зь віншаванкай да Новага году па кітайскім календары.

Віншаванкі складаюцца ў форме справаздач аб зробленай працы, апісаньняў спраў, пералічэньня галін права, якіх тычыліся скаргі, сьпісу канфэрэнцый і сэмінараў, у якіх пашчасьціла ўзяць удзел судзьдзям і да т.п. Але шараговага чытача чакае расчараваньне. У год чарговае элегантнае перамогі «большасьць заканадаўчых актаў прынята ў адпаведнасьці з нормамі Канстытуцыі і міжнародна-прававымі стандартамі».

Орган, вядомы проста-такі подзьвігамі лібэралізму (як узяць і абвясьціць, што патрабаваньне адмысловага штэмпэля ў пашпарце для выезду за мяжу — норма, што супярэчыць Асноўнаму закону), ня мог не прызнаць, што «канстытуцыйныя нормы ў галіне правоў і свабод чалавека ў краіне дзейнічаюць ня ў поўнай меры. Часьцяком выконваюцца так, як трактуецца ў нарматыўна-прававых дакумэнтах. А трактоўка, у сваю чаргу, не супадае з арыгіналам. Навідавоку неразуменьне асобнымі службовымі асобамі канстытуцыйных нормаў, іх прыярытэтнага месца ў прававой сыстэме». Подзьвіг — ён і ёсьць подзьвіг. Ды такі энэргетычна магутны пасаж на якім АНТ ужо і не далі б у этэр, каб не нэрваваць і без таго занепакоеных вайной у Іраку грамадзян.

Калі паспрабаваць паставіцца да гэтага дакумэнту хоць крышачку сур'ёзна з пазыцыі юрыста, то бадай адзіным насамрэч вартым фрагмэнтам можна лічыць аналіз і рэкамэндацыі суду наконт тэхнікі нарматворчага працэсу. Адзначаецца, што ў Беларусі прававому рэгуляваньню дагэтуль уласьцівыя складанасьць і нявызначанасьць. Зьмяненьні ў заканадаўства ўносяцца нясвоечасова, сыстэмы характар набыло наданьне дакумэнтам зваротнай сілы. Заканадаўчыя органы перавышаюць межы сваёй кампэтэнцыі, існуюць прагалы ў прававым рэгуляваньні, а таксама нясвоечасовае вытлумачэньне заканадаўства, асабліва там, дзе маюцца калізійныя нормы. Дзеля гэтага прапануецца ўключаць нормы аб неабходных зьмяненьнях іншых прававых актаў у сам праект закону ды ўпарадкаваць інстытут экспэртызы праектаў нарматыўных актаў. Рэкамэндуецца забясьпечыць прагноз вынікаў прыняцьця нарматыўнага акту, а таксама ўскласьці на пэўны суб'ект улады (магчыма, і сам Канстытуцыйны суд) ажыцьцяўленьне агульнага аналізу правапрымяняльнай практыкі ў краіне. Ну і, вядома, па даўняй беларускай традыцыі ўзмацніць адказнасьць службовых асоб, на якіх ускладзена забесьпячэньне канстытуцыйнай законнасьці як у праватворчасьці, так і ў правапрымяненьні.

> Пасланьне аб стане законнасьці ў краіне карыснае: прымушае задумвацца аб ролі Канстытуцыйнага суду, які ў сярэдзіне 1990-х страціў права даваць заключэньне пра парушэньне Канстытуцыі прэзыдэнтам.

У параўнаньні з 2003 годам кідаецца ў вочы рэзкае падзеньне колькасьці грамадзян, што зьвярталіся са скаргамі ў Канстытуцыйны суд (сёлета іх было 5 тысяч у параўнаньні з 12 тысячамі ў 2003 г.). Затое ўзрасла колькасьць вынесеных рашэньняў — 45 (у 2003 г. — 36).

Тым ня менш, і гэты штогадовы дакумэнт, безумоўна, робіць пасільны ўнёсак у разьвіцьцё прававога мысьленьня краіны. Хаця б таму, што мэтадычна штогод прымушае нас задумвацца аб ролі Канстытуцыйнага суду, з функцый якога ў сярэдзіне 1990-х зьнікла права даваць заключэньне пра парушэньне Канстытуцыі кіраўніком дзяржавы. Тады шмат гаварылася пра норму аб неабходнасьці на прапанову прэзыдэнта даваць заключэньне пра наяўнасьць фактаў сыстэматычнага або грубага парушэньня Канстытуцыі палатамі парлямэнту. Але ў 2005 год мы ўступілі з узорнымі заканадаўцамі, якія наўрад ці замахнуцца на «сьвятую руку, што нясе хрустальны сасуд». Зьнікла згадка пра тое, што пастановы Канстытуцыйнага суду канчатковыя і не падлягаюць абскарджваньню і апратэставаньню. Але няма і прэцэдэнтаў, калі б «рука ўсюдыісная» зьвярнулася да гэтага схаванага мэханізму. Апошні склад КС — людзі ў найвышэйшай ступені сумленныя і пісьменныя, каб зь імі змагацца. Шум, змаганьне, скандалы ў залі Канстытуцыйнага суду — гэта там, у «іх». Дзе страйкі і цунамі, распуста і крымінал. У нас — штогадовыя паштоўкі. Распішэцеся па атрыманьні, грамадзянін.



АРЦЁМ ЛЯВА

**УЛАДЗІСЛАЎ БЕЛАВУСАЎ** — студэнт права. Стваральнік беларускамоўнага часопісу юрыстаў і палітолягаў «Праўнік»: praunik.org.

# Які час, такі і «Лёс»

Ва УП «Лёс» гораду Барані, што пад Воршай, пры канцы кастрычніка выйшлі загады аб паменшэньні прэміяльных работнікам прадпрыемства з 30% да 5—10% заробку. Прычым загады былі афармлены «задняй датай». На неадпаведнасьць загаду заканадаўству зьвярнуў увагу незалежны прафсаюз, але безвынікова. Мясцовая арганізацыя Свабоднага прафсаюзу на чале з Васілём Леўчанкавым зьвярнулася ў пракуратуру.

І пракуратура прызнала памяншэньне прэмій незаконным на падставе неўзгадненьня рашэньня з прафкамам. На той жа падставе пракурор Воршы палічыў незаконным і павышэньне заробкаў на прадпрыемстве і даслаў пратэст дырэктару УП «Лёс». Дырэкцыя вымушана была фармальна панізіць заробак і зноўку павысіць з выкананьнем усіх фармальнасьцяў. Вярнуўся і былы памер прэміяльных.

Цікавая пазыцыя пракурора Воршы. У выступе па мясцовым тэлебачаньні ён сказаў, што дзеля захаваньня законнасьці цяпер мусіць адбіраць грошы ў людзей назад, а яму па-чалавечы гэтага рабіць ня хочацца. З пракурорскага выступу вынікае, што вінаваты прафсаюз, які зьвярнуў увагу пракуратуры на парушэньне законнасьці, праз што пракуратура вымушана цяпер неяк рэагаваць, шукаць вінаватых.

Адміністрацыя хутка сьцяміла, хто вінаваты. Яна, падхапіўшы словы пракурора, правяла тлумачальныя гутаркі ў цэхах прадпрыемства пра тое, якія дрэнныя людзі ў Свабодным прафсаюзе на чале зь Леўчанкавым, чым справакавала варожае стаўленьне некаторых рабочых да сп.Леўчанкава. На адрас апошняга неўзабаве пасыпаліся ананімныя пагрозы. Вось так абаронцаў работнікаў спрабуюць выставіць іхнімі ворагамі.

**Арцём Лява**

# Рэгістрацыя — рэч патрэбная

На справаздачна-выбарнай канфэрэнцыі Партыі БНФ 6 сакавіка будзе абраны новы старшыня Менскай абласной арганізацыі. Прэтэндуе на гэтую пасаду **Аляксей Казлоўскі**, зь якім пагутарыў карэспандэнт «НН».

**— Чаму Вы вырашылі вылучыць сваю кандыдатуру на гэтую пасаду ў такі цяжкі для палітычнае дзейнасьці час?**

— У партыі ёсьць людзі, якія дзейнічаюць ужо шмат гадоў, і яны стаміліся. Думаю, што мне ўдасца прыўнесьці новую энэргію.

**— У чым будзе заключацца дзейнасьць?**

— Па-першае, я хацеў бы прыцягнуць у партыю новых людзей. Па-другое, хачу заняцца навучаньнем партыйных актывістаў. У людзей ёсьць добры досьвед удзелу ў кампаніях, але няма досьведу партыйнага будаўніцтва. Трэці момант зьвязаны зь перарэгістрацыяй партыйных структур. Потым, калі ўся гэтая шуміха сьціхне, усё адно трэба будзе аднаўляць партыйныя суполкі, бо афіцыйная рэгістрацыя дае шмат пераваг: гэта і магчымасьць вылучаць кандыдатаў у дэпутаты, і магчымасьць уваходзіць у камісіі…

**Аркадзь Шанскі**

## СЬЦІСЛА

16 лютага **Валеру Леванеўскаму** адміністрацыя Магілёўскай калёніі №19 адмовілася замяніць меру пакараньня з турэмнага зьняволеньня на папраўчыя работы: ён лічыцца «злосным парушальнікам дысцыпліны». 28 лютага яго перавялі ў калёнію №22 у пасёлку Даманава Івацэвіцкага раёну, дзе яго ўтрымлівалі раней.

Слуцкі гарадзкі суд 16 лютага аднавіў на працы эканаміста-рэвізора ААТ «Слуцак-Модуль», актывіста РЭП **Усевалада Сьцяцова**, незаконна звольненага 11 кастрычніка 2004 г.

Супрацоўнікі падатковай інспэкцыі 22 лютага правяралі офіс **Зьмітра Салаўёва** з Наваполацку: іх цікавіла, ці не аказвае праваабаронца платных юрыдычных паслуг.

23 лютага Мінюст вынес афіцыйнае папярэджаньне на адрас **ТБМ**: арганізацыю вінавацяць у тым, што шэраг суполак маюць юрыдычныя адрасы ў жылых памяшканьнях.

Гарадзенскі абласны гаспадарчы суд 23 лютага пастанавіў выселіць з памяшканьняў **абласную**, а таксама **Ленінскую раённую Рады БНФ** цягам дзесяці дзён. 8 лютага гаспадарчы суд паставіў выселіць з таго ж будынку **гарадзкую і абласную арганізацыі ПКБ**.

З заявай да пракурора Менску 23 лютага зьвярнуўся жыхар Віцебску **Міхал Землякоў**. Ён патрабуе вярнуць маёмасьць, канфіскаваную ў 2001 г. у ягонага сына Юрася, сябра патрыятычнай арганізацыі «Край».

23 лютага Менская гарадзкая пракуратура на месяц падоўжыла тэрмін сьледзтва па крымінальнай справе аб абвінавачваньні намесьніка старшыні БХК **Гары Паганяйлы** ў паклёпе на прэзыдэнта.

Суд Цэнтральнага раёну Менску 23 лютага адхіліў скаргу адваката **Антона Філімонава** — сына забітай у кастрычніку журналісткі Веранікі Чаркасавай; адвакат дамагаўся адмены рашэньня менскай пракуратуры аб прызначэньні хлопцу псыхіятрычнай экспэртызы. Судовае пасяджэньне было закрытым і доўжылася каля сарака хвілін.

Актывіст прафсаюзу РЭПАМ **Юры Курганскі** з Горадні 23 лютага атрымаў ад суду папярэджаньне і штраф у тры базавыя велічыні (72 тыс.) за хадайніцтвы пра адвод судзьдзі: суд палічыў, што Курганскі зацягвае працэс. Прафсаюзны актывіст абскарджвае рашэньне, паводле якога яго аштрафавалі на 5 б.в. за распаўсюд «незарэгістраванага выданьня» — прафсаюзнага бюлетэню.

24 лютага ЦВК пацьвердзіла рашэньне акруговай камісіі Гарадзенскай Цэнтральнай выбарчай акругі №52 пра адмову ў рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты **Сяргею Скрабцу** і намесьніку старшыні АГП **Яраславу Раманчуку**. 28 рашэньне наконт С.Скрабца пацьвердзіў Вярхоўны суд. 27 лютага Скрабца затрымалі ў Горадні, а 28 асудзілі на 200 б.в. (4 млн 800 тыс.), абвінаваціўшы ў арганізацыі мітынгу гарадзенскіх прадпрымальнікаў 10 лютага.

Адміністрацыя УП «Лёс» (г.Барань Аршанскага раёну) 24 лютага паведаміла актывісту Беларускага кангрэсу незалежных прафсаюзаў **Аляксандру Курносенку** пра звальненьне ў сувязі з заканчэньнем кантракту. Дагэтуль ён ня меў спагнаньняў па працы.

**Сяргея Антончыка** 24 лютага судзьдзя Аксана Рэлява з суду Савецкага раёну Менску аштрафавала на 150 б.в. (3 млн 600 тыс.) за парушэньне грамадзкага парадку ў часе правядзеньня масавага мерапрыемства на прыватнай кватэры.

Старшыню ПБНФ **Вінцука Вячорку** 24 лютага дапыталі ў якасьці сьведкі па крымінальнай справе па факце прэс-канфэрэнцыі 15 кастрычніка 2004 г., якую давалі лідэры кааліцыі «5+».

Пракуратура Цэнтральнага раёну Менску распачала 25 лютага крымінальныя справы на экс-кандыдатаў у дэпутаты **Аляксандра Цынкевіча** (АГП) і **Алега Воўчака** (БСДГ): іх вінавацяць у паклёпе на прэзыдэнта, распаўсюджаным праз перадвыбарчыя ўлёткі.

Жаночае грамадзкае аб'яднаньне **«Любава»** з Горак 25 лютага атрымала папярэджаньне ад Магілёўскай абласной управы юстыцыі за тое, што юрыдычны адрас арганізацыі знаходзіцца ў шматкватэрным доме. Актывісткі арганізацыі зьдзіўленыя, бо маюць юрадрас у прыватным доме, які мае два асобныя выхады, як і прадугледжана законам.

25 лютага зь Берасьцейскай мытні звольнілі актывіста БСДП (НГ) **Васіля Ваўранюка**, які адпрацаваў у мытных органах 24 гады. Ён пэўны, што праз палітыку.

Суд Чыгуначнага раёну Гомелю 25 лютага пастанавіў абмежаваць выезд за межы Беларусі **Юліі Марчанцы** — дачцэ прадпрымальніцы Тацяны Марчанкі, якая балятавалася ў парлямэнт ад апазыцыі. Пасьля выбараў прыватную друкарню, дзе Ю.Марчанка была дырэктаркай, зачынілі, на яе саму наклалі штраф больш за 40 млн руб. З гэтай прычыны й прынятае абмежаваньне.

**Ігара Пальчыкава** затрымалі ў Менску падчас раздачы ўлётак 25 лютага і ў той самы дзень асудзілі на 30 б.в.

У Менску 25 лютага падчас раздачы ўлётак былі затрыманы студэнткі **Крысьціна Слушанская** й **Ірма Каўфман**. Да 28 лютага іх трымалі ў пастарунку, а потым яшчэ асудзілі на 20 б.в. кожную.

27 лютага ў Горадні людзі ў цывільным канфіскавалі з друкарні без пратаколу ўвесь наклад улётак (2200 ас.) кандыдата ў дэпутаты **Сяргея Антусевіча** (ПБНФ). С.Антусевіч пэўны, што гэта праз жаданьне сарваць ягоную выбарчую кампанію.

У Рэчыцы 27 лютага затрымалі актывіста аб'яднаньня прадпрымальнікаў «Пэрспэктыва» **Леаніда Невара**. Міліцыянты арыштавалі яго ва ўласным мікрааўтобусе. Калі жонка Невара паспрабавала клікаць на дапамогу, яго самога абвінавацілі ў закліку да масавых беспарадкаў. 28 лютага яго выпусьцілі з аддзяленьня пад падпіску аб нявыезьдзе.

Пінская рэгіянальная друкарня 28 лютага адмовілася друкаваць недзяржаўную газэту **«Мясцовы час»**.

Суд Ленінскага раёну Горадні 28 лютага асудзіў намесьніка старшыні РГА «Пэрспэктыва» **Зьмітра Іваноўскага** на 15 сутак за арганізацыю несанкцыянаванага мітынгу прадпрымальнікаў 10 лютага.

**АШ**

# Вэнэцыянскае

Працяг са старонкі 2.

— Гэта я набыў у Маскве падчас заняткаў у мастацкай студыі. Наш настаўнік параіў кожнаму мець такое. Унутр устаўляецца аловак і заціскаецца колцам на канцы. Тронкі ў руцэ зручна трымаць, і аловак можна сьпісаць да апошняга сантымэтра. Калі адбылася рэвалюцыя, — працягваў мастак, — моладзь у мастацкіх вучэльнях пачала скідаць алебастравыя фігуры антычных і клясычных узораў у шырокі пралёт лесьвіц. Ляціць такая бялюткая Вэнэра — бум! — і выкрыкі: «Канец старому мастацтву!» Стала моднай парафраза з Суворава: «Натура дура, мастак маладзец».

Іншым разам я слухаў далейшую гісторыю:

— Улетку 1920 году наша сям’я вырушыла ў Варшаву, усьлед за наступаючай Чырвонай Арміяй. Бацьку прызначылі камісарам шляхоў зносін ва ўрадзе Польскай Савецкай Рэспублікі. Але ў дарозе тата раптоўна памёр. Куды падзецца? Сям’я ўладкавалася ў Нясьвіжы, дзе былі сваякі, а ў суседнім Снове жыў родны дзядзька.

Чырвоная Армія была хутка адкінута ад Варшавы аж за Стоўпцы, і Нясьвіж апынуўся зусім у іншай Польшчы.

## Віленскі ўнівэрсытэт: дзяржава ўнутры дзяржавы

У Нясьвіжы працягваць мастацкае навучаньне не было дзе, але мары стаць мастаком хлапец не пакідаў — працягваў самастойна маляваць, афармляў вучнёўскія спэктаклі. Па заканчэньні гімназіі вырашыў вучыцца далей. Найбліжэйшая навучальная ўстанова адпаведнага профілю — мастацкі факультэт Віленскага ўнівэрсытэту. Паўстала патрэба мець пашпарт. У гарадзкой радзе высьветлілася, што хлопец ня мае польскага грамадзянства. «Як жа мне атрымаць пашпарт?» — «А нех пан едзе да Саветаў і там яго атрымлівае».

Як было далей з пашпартам, сп.Міхал не распавёў, ды я й не дапытваўся. Хутчэй за ўсё, бяз польскай «легітымацыі» так і пражыў да 1939 г., але ва ўнівэрсытэт яго ўсё ж прынялі. Гэта адбылося ў 1926 г. На той час віленская ВНУ на ўзор заходніх унівэрсытэтаў мела самакіраваньне, заснаванае на аўтаноміі.

— Гэта была нібы дзяржава ўнутры дзяржавы. Віленскі паліцыянт ня меў права ўваходзіць на тэрыторыю навучальнай установы. Гэтым часам карысталіся дробныя зладзеі, уцякаючы ад перасьледу ва ўнутраныя двары ўнівэрсытэту.

Віленскае студэнцтва падзялялася на асобныя групоўкі і карпарацыі. Падзел можна было нават адзначыць звонку. Асноўным яго атрыбутам зьяўлялася «карпарантка» — картуз з дашкам, палатнянае покрыва якога і апасак мелі розную афарбоўку, адпаведна прынятай той ці іншай вучэльняй гораду. Сеўрук з усьмешкай успамінае:

— Першакурсьнікі стараліся як мага хутчэй затрапаць карпарантку: сядзелі на ёй, шпурлялі куды папала, замочвалі па некалькі разоў і трымалі на сонцы ці над вогнішчам, каб яна выглядала даўно ўжыванай і сьведчыла пра бываласьць яе гаспадара.

## Фукс, ваўкі і студэнцкая каса

Падзяляліся студэнты групоўкі таксама на брацтвы — у залежнасьці ад мясцовасьці, адкуль паходзілі студэнты. Існавалі й элітныя карпарацыі студэнтаў вышэйшага, «шляхоцкага», парадку. Бальшыня іх вучылася на факультэтах права і мэдыцыны. У іх быў унутраны падзел па ступенях і панавалі норавы, падобныя на дзедаўшчыну ў войску:

— На найніжэйшай ступені быў «фукс». Ён мусіў на жаданьне «ваўкоў» без ваганьня выканаць любы загад — напрыклад, выпіць куфаль піва, напоўнены цыгарэтнымі «бычкамі».

Усе суполкі меліся па чарзе ў вызначаны пэрыяд апекавацца месцамі калектыўнага абслугоўваньня. Галоўнымі зь іх былі «братняк» — студэнцкая пазычальная каса — і сталоўка.

— «Братняк» дзеля папаўненьня сродкаў зьбіраў «даніну» ад розных прадпрымальнікаў. Здараліся выпадкі адмовы плаціць грошы. Тады суполкі ладзілі байкот або блякаду пляцоўкі «адмоўніка»: пасядуць у кавярні, нічога не замаўляюць ды іншых не пускаюць. Гаспадар цярпеў страты і ўрэшце плаціў. Ці з кінатэатрамі: у даўжэзныя чэргі станууць, а квіткоў не бяруць. Крык, гвалт, паліцыянты! Пакуль разьбяруцца — дзень мінуў.

Дарэчы, пра «братняк» ды іншыя студэнцкія справы Сеўрук цытаваў на памяць жартоўныя вершы, напісаныя ў стылі мясцовай гаворкі, так званай «віляншчызны» — своеасаблівай польска-беларускай трасянкі: «…nic w bratniaku nie załadził, tylko swoje palta zhadził».

У сталоўцы суполкі пільнавалі пастаўкі харчоў і іх прыгатаваньне, а таксама дзяжурылі ў залі як абслуга. Пэрыяды патранажу тут і ў іншых месцах суполкай камуністаў былі асабліва адметнымі: у сталоўцы рабілася чыста і гожа (кветкі, сурвэткі), стравы набывалі лепшы смак, у «братняку» спыняліся злоўжываньні. Ставараліся студэнцкія аб’яднаньні і на палітычнай аснове. Сярод іх вылучалася камуністычная суполка, вынікі дзейнасьці якой асабліва праяўляліся ў студэнцкім побыце.

— Як камуністам удавалася так арганізавацца — усе зьдзіўляліся. А ўнівэрсытэцкія ўлады вырашылі «вылечыць» ад камуністычнай хваробы завадатара суполкі і накіравалі яго на стажыроўку ў Італію. Калі той вярнуўся са стажыроўкі, то стаў яшчэ больш адданым камуністам. Потым ён стаў вядомым дзеячам КПЗБ і загінуў за Саветамі.

## Бачыш старую сьцяну — замалюй

Дэмакратызм Віленскага ўнівэрсытэту быў шырокі і разнастайны. Ладзіліся шматлікія імпрэзы, выставы, дыскусіі. Асаблівай папулярнасьцю карысталіся «шопкі» — лялечныя прадстаўленьні накшталт батлейкі. Дзеючымі асобамі выстаўляліся студэнты, выкладчыкі, палітыкі, сам Пілсудзкі. Некаторыя пастаноўкі разам з фатаздымкамі друкаваліся ва ўнівэрсытэцкім зборніку.

Часам моладзевыя вечарыны, шумныя, з удзелам настаўнікаў і пры выпіўцы, зацягваліся далёка за поўнач. Але раніцай на заняткі зьяўляліся ўсе — паголеныя, ладна апранутыя, і нікому ў голаў не прыходзіла манкіраваць лекцыі прафэсара, разам зь якім весела бавіў мінулую ноч.

Прафэсура па мастацкіх дысцыплінах у асноўным складалася з выхаванцаў Пецярбурскай акадэміі, сярод іх вылучаліся Ф.Рушчыц, Л.Сьляндзінскі, А.Штурман. Нейкай асобнай спэцыялізацыі па відах мастацтваў не было: навучалі жывапісу, скульптуры, графіцы ды іншаму ўсіх разам.

Ян Булгак выкладаў ім самім сфармуляваны прадмет — фатаграфіку. Пазьней мне давялося бачыць у адной зь віленскіх бібліятэк адбіткі з фаташтудый таго пэрыяду — пастаноўкі розных па форме і фактуры прадметаў з розным асьвятленьнем і фонам. Студэнты ганарыліся сваім фотапрафэсарам, асабліва пасьля таго, як за здымак зь берагу Нарачы на выставе ў Японіі ён атрымаў прыз.

Цікавыя лекцыі па гісторыі архітэктуры з багатай падборкай «празрочаў» — шкляных слайдаў — даваў Юльюш Клос. Сеўрук рабіў на лекцыях замалёўкі з экрана. Яго канспэкты з малюнкамі і цяпер захоўваюцца ў мяне. Яны маюць ужо толькі мэмарыяльнае значэньне і будуць перададзены ў музэй мастака ў Нясьвіжы.

Ю.Клос быў значнай асобай у віленскім архітэктурным асяродзьдзі — праектаваў новабудоўлі, рэстаўраваў помнікі, выдаваў архітэктурныя даведнікі па Вільні і ваколіцах. Ён так навучаў студэнтаў: «Бачыш сьцяну старой пабудовы — замалюй, заўтра яе ня будзе».

Навуку рэстаўрацыі твораў мастацтва, у тым ліку і архітэктуры, выкладаў галоўны кансэрватар віленскай акругі Станіслаў Лёрэнц. Насамрэч прадмет выкладу называўся «кансэрвацыя» — такі тэрмін паўсюдна прыняты на Захадзе. Ужыванае ж у нас слова «рэстаўрацыя» мае там даволі адмоўнае адценьне.

Перад вайной С.Лёрэнц быў прызначаны дырэктарам Нацыянальнага музэю ў Варшаве і заставаўся ім безь перапынку палову стагодзьдзя. Дзякуючы пасрэдніцтву Сеўрука я здолеў зь ім зьлістававацца і атрымаць найкаштоўнейшыя зьвесткі па архітэктурнай спадчыне Беларусі.

## Сьвяты з вывернутымі пяткамі

Ад віленскага пэрыяду ў Сеўрука засталося не адчутае ў поўнай меры каханьне. Неяк раз мімаходзь, без прычыны і задуменна, згадаў, што нядоўга сустракаўся зь дзяўчынай, а аднойчы, завітаўшы да ейнага дому, убачыў яе ў труне.

Па заканчэньні ўнівэрсытэту пачаліся пошукі працы. У 1932 г. попыт на мастацтва з прычыны эканамічнай дэпрэсіі быў мізэрны. Але аднойчы пашэнціла — знайшлі замову на ўнутраны росьпіс касьцёлу ў Пазнанскім ваяводзтве. Пасьля прыбыцьця зь сябрам-напарнікам на месца і агледзінаў будынку вырашылі зьвярнуцца да аднаго зь віленскіх прафэсараў па параду. У хуткім адказе было: «Першае, бяз вопыту не бярыцеся за гэтую справу. Другое, калі ўжо ўзяліся — знайдзіце добрага тынкоўшчыка, абазнанага ў фрэскавай тэхналёгіі…» Зь цяжкасьцямі, але работа пайшла.

Познаншчына вельмі адрозная ад Віленшчыны: тут ня знойдзеш маляўнічай занядбаласьці пры дарогах, агароджах, у сялянскіх падворках — усё падагнана, дагледжана. Сяляне — кожны на сваёй брычцы, у гарнітуры і пры гальштуку. Ахвочыя да таварыскіх бясед за сталом, але кабет не запрашаюць. Прымалі іх, мастакоў, вельмі добра.

Падчас працы з росьпісам непадалёк ад касьцёлу знайшлася гаспадыня, якая гатавала для хлопцаў абеды. Аднойчы адзін пан з касьцельнага камітэту запытаўся: «А дзе вы абедаеце?» «А вось там, у той кабеты». — «Яна немка». — «Дык яна гаворыць па-польску!» — «Пажадана, каб вы да яе больш не хадзілі. Яна немка».

Праца над фрэскамі падыходзіла да канца. У адным месцы Сеўруку аніяк не ўдавалася «паставіць» аднаго сьвятога — неяк



КЛЯСЫЧНЫЯ СЕЎРУКОВЫ ЖНЕІ. «Лета». 1938 год.



**МІХАІЛ СЕЎРУК** (нар. 27 лютага 1905 у Варшаве) — жывапісец і графік. Скончыў мастацкі факультэт Віленскага ўнівэрсытэту імя Стафана Баторыя. Вучыўся ў Людаміра Сьлядзінскага, Фэрдынанда Рушчыца, Яна Булгака. У 1939 г. вярнуўся ў Нясьвіж, дзе і жыў да сваёй сьмерці ў 1979 г.

**«Аўтапартрэт». 1969 год.**

# люстэрка

ногі яго «выварочваліся». Ён спрабаваў па-рознаму, і так, і гэтак, па ўсіх правілах анатоміі — не выходзіла. Адзін раз у роспачы ён «вывернуў» сьвятому пятку насуперак усялякім правілам і — о цуд! — сьвяты «стаў» як трэба.

## Шок ад бальшавікоў

Сеўрук валодаў многімі мастацкімі тэхнікамі. Сам цікаўны і схільны да графікі, я пасьля прагляду некалькіх пасечаных драбнюткімі рыскамі мядзяных аркушаў і адбіткаў зь іх запытаўся, чаму ён так рэдка займаецца гравюрай на медзі цяпер. «Я гэтую тэхніку выкарыстоўваў, калі не хапала грошай, — сказаў ён. — У некаторых віленскіх газэтах зьмяшчаліся так званыя «субскрыпцыі» — гравіраваныя абразкі розных мастакоў з прапанаваю падпісацца на той ці іншы твор і атрымаць арыгінальны адбітак».

Сп.Міхал вяртаўся да гравюры і пазьней, але галоўным сваім заняткам лічыў жывапіс, і асабліва партрэт. Не заўсёды я зь ім пагаджаўся. Мне, тады маладзёну, не хапала ў яго партрэтах экспрэсіі, дынамізму. Ведаючы некаторыя мадэлі з жыцьця, я адзначаў, што ў Сеўрука на палатне яны рабіліся спакайнейшымі, твары іх акругляліся, цела насычалася пругкай сьвежасьцю. Ніколі ў яго не сустрэнеш млявых, худых асоб або твараў з палаючымі вачыма. Ужо пазьней адкрыў я ў Сеўрукавых творах згадкі кампазыцыйных пабудоў раньняга рэнэсансу і каларыстычныя пошукі Сэзана. Гледзячы на яго карціны, уяўляеш, што пісаў іх задуменны рамантык, мастак, які шукае і знаходзіць прыгажосьць у прыродзе і чалавеку.

Вільня, верасень 1939 году. Вызваленьне Заходняй Беларусі.

— Віленскіх мастакоў, хто яшчэ тут заставаўся, сабралі ў адно месца, — успамінае сп.Міхал, — і выступіў перад намі таварыш І.Ф.Клімаў: «Усё, панове, цяпер вашы буржуйскія вольнасьці скончыліся, будзеце маляваць партрэты бальшавіцкіх правадыроў». «Як гэта, мы ж іх у вочы ня бачылі?» — «А так: атрымаеце фатаздымкі ўзгодненага ўзору — і за працу. Астатняе вам тлумачыць ня трэба». Гэта быў шок, — працягваў далей Сеўрук. — Маляваньне з фатаздымку лічылася для мастака заганай, такую працу дазваляў сабе выканаць толькі рамесьнік.

— А як жа зь Пілсудзкім? Напэўна ж, яго партрэты віселі па высокіх кабінэтах?

— Дапусьцім, я ў высокіх кабінэтах не бываў. Але і там калі былі, то аўтарскія работы, кожная са сваім бачаньнем пэрсанажа.

У кастрычніку таго ж году пасьля перадачы Вільні летувісам Сеўрук, які ня меў у гэтым слаўным горадзе ўласнага кута, назаўжды вяртаецца ў Нясьвіж. Зь перадваеннага жыцьця ў гэтым месьце ў мяне засталіся толькі мастаковы згадкі пра жыдоўскія крамы на рынку. Аднойчы сп.Міхал пытаецца ў свайго сталага крамніка пра пэндзаль №18.

— Няма, пане.

— То я пайду пашукаю ў каго іншага.

— О не, няхай пан тут пачакае — я хуценька вярнуся! — і празь дзесяць хвілін прыносіць навюткі пэндзаль №18.

## Баталіст-злодзей

На пачатку вайны Нясьвіж моцна бамбілі немцы. Рынкавая плошча амаль уся засталася ў руінах, акрамя самой ратушы і некалькіх камяніц. Пазьней згарэла і ўся жыдоўская дзяльніца разам са старажытнай сынагогай. Іншых ваенных падзей Сеўрук не прыгадваў. Адзначыў толькі, што яму спадабаліся вясёлыя партызанскія хлопцы, пасьля вайны яшчэ пры зброі, за іх шчырасьць і непасрэднасьць.

Ускосна з партызанамі зьвязана адна гісторыя. З Масквы прыехаў мастак М.Сакалоў, каб маляваць партрэты герояў беларускіх лясоў. Уладкаваўся ён у радзівілаўскім замку, дзе адразу пасьля вызваленьня гораду адкрылася санаторыя. Мясцовыя ўлады даручылі Сеўруку «інспэктаваць» госьця. Але злавіць яго ніяк не ўдавалася: то ён на працэдурах, то ад'ехаў у вёску па новага пэрсанажа (ён быў тут на ўласным аўто), то на кароткі час яго выклікалі ў Маскву. Так Сеўрук з Сакаловым і не сустрэўся. А потым, пасьля канчатковага ад'езду госьця, пайшлі чуткі, што княжацкую збройню добра пачысьцілі. Але за руку злодзея ніхто не схапіў.

Не прайшло й паўгоду ад слуханьня гісторыі, як натрапляю на апошняй старонцы «Комсомольской правды» ад 11 сьнежня 1975 г. на занатоўку А.Абрашыдава «Дасьпехі былых часоў»: «Першае ўяўленьне пра калекцыю Міхаіла Мікалаевіча Сакалова я атрымаў яшчэ ў парадным яго доме. Хлопчык, які праводзіў мяне да кватэры мастака, пэведаміў: «Там рыцар ёсьць, сапраўдны!» У пакоі Міхаіла Мікалаевіча ўбачыў я і рыцара, і шмат іншага: старыя штылеты, пісталеты, шаблі, стрэльбы і нават маленькую гармату.

...Вось дэкаратыўная апрацоўка прыклада і ложа старой француcкай стрэльбы. Мудрагелістая пляцёнка ўпрыгожаньняў і жанравыя малюнкі паляваньня... нагадваюць гравюры знакамітых майстроў.

— Вось гэтую напалеонаўскую кірасу я знайшоў яшчэ ў дзяцінстве, — кажа Сакалоў. — А гэты штылет — у кучы старога хламу ў свайго знаёмага, калі дапамагаў яму пераязджаць у новую кватэру. Зьбіраць даўніну я пачаў даўно, яшчэ ў школьныя гады. Спачатку — як рэквізыт для хатніх спэктакляў, якія любілі ставіць у нашай сям'і...

Менскія музэйшчыкі да маёй прапановы паспрабаваць вярнуць на радзіму нарабаванае аднесьліся скептычна: бяздоказна і мінула шмат часу.



ДЗЯНІС РАМАНЮК

**СЕЎРУКАВА ВІЛЬНЯ.** Мост на Зарэччы. Квартал факультэту мастацтваў Віленскага ўнівэрсытэту (сёньня Акадэміі мастацтваў). Дамок за Віленкай — імправізаваны інтэрнат: туды «самапасам» засяліліся студэнты.

## Сум па Вільні

Лёс замацаваў Сеўрука пры Нясьвіжы. Спачуваць ягонаму лёсу ня трэба. Так, гэты лёс не адзін раз падстаўляў яго пад цяжкія ўдары. Але бярог ад іншых. Талент і працаздольнасьць дазволілі б яму ўладкавацца і дасягнуць нейкіх вяршынь у сталіцы. Былі і магчымасьці, і нават прапановы. Сталічныя мастакі ведалі і паважалі яго. Але я ня памятаю блізкіх стасункаў Сеўрука хоць бы з адным. Здаецца, зусім не пасіўнасьць стрымлівала мастака ад рашучага кроку «ўгору». Нясьвіскім «затворніцтвам» ён раўніва аберагаў набытак маладых гадоў — памяць пра чароўную Вільню — ад знадворных замахаў. Відома, былі саступкі ў выглядзе маляваньня кабінэтных Леніных або Суворавых у княскім атачэньні. Затое прыязджала яшчэ віленская сяброўка — мастачка Ядзя Радзялоўская з Маладэчна, а таксама незнаёмыя мне сябры з Баранавіч. Прыязджалі і зь Менску, але не мастакі — акторка-купалаўка Ліля Давідовіч, былыя віленчукі Максім Танк, Генадзь Цітовіч, а з самой Вільні — Алесь Антановіч, знаўца беларуска-татарскіх тэкстаў. З маладзейшых, нясьвіскіх, запомніўся мясцовы мастак; звалі яго Стась і жыў ён на 1-м Савецкім завулку. Тады малады чалавек, ён зрабіў амаль усю падрыхтоўчую працу да апошняй пэрсанальнай выставы Сеўрука ў Менску, якая адбылася ўжо пасьмяротна ў 1980 г.

Памёр Міхал Канстанцінавіч раптоўна, у ноч на 14 сакавіка 1979 г. — схапіла задыха. Пакуль «хуткая» прыехала, яго ўжо ня стала. Праз колькі год памерла жонка сп.Раіса. Мне паведамілі, што некаторую частку мастацкай спадчыны прыдбаў Нацыянальны мастацкі музэй, нешта забралі блізкія сябры з Баранавіч, астатняе захоўваецца ў кватэры-музэі мастака на Садовай вуліцы.

## «Натура забірае кампазыцыю»

Быў летні дзень, расчыненае акно, за ім — кветкі ў загародцы, кусты. Сп.Міхал выносіць з майстэрні невялічкую рамачку ў драўлянай акантоўцы зь цёмным зашклёным тлом:

— А цяпер паглядзіце на адлюстраваньне аконнага пэйзажу ў цёмным шкле».

Чысьціня колераў, мяккасьць адценьняў уразіла мяне. Папраўдзе, падобны эфэкт я назіраў і раней, але цяпер ён набываў асобны сэнс.

— Гэта «вэнэцыянскае люстэрка». Трэба ўзяць чорную глухую тканіну, напрыклад, аксамітавую, каб добра пагльнала сьвятло, і накрыць яе шклом. Прымітыўная рэч, ці ня праўда? Яе прыдумалі вэнэцыянскія мастакі. Дарэчы, найлепшыя каларысты Рэнэсансу.

Сапраўды, адны глядзяць праз прызму, іншыя — праз ружовыя акуляры, кожны стварае свой штучны сусьвет. І ніхто не зьвяртае ўвагі на кавалак шкла зь невыразнай шэраньню ў адлюстраваньнях. Маўляў, такое бачыць увесну кожная руплівая гаспадыня, прамываючы вокны ў хаце. Бачыць, але не асэнсоўвае. У яе іншая мэта.

Сам Сеўрук так пісаў мастацтвазнаўцу В.Шматаву: «Я мала карыстаўся натурай, толькі рабіў на ёй праверку ўжо зробленага. Натура — я пераканаўся ў гэтым — адразу забірае кампазыцыю, пачынаеш «ахалоджвацца» да сваёй працы. Прападае прыгожая лінія, і выходзіць зусім ня тое, што ты задумаў».

Аблічча мастака з празрыстай яснасьцю трымаецца ў маёй памяці. А мінула ўжо тры дзесяцігодзьдзі — цэлае пакаленьне. Засталіся не ўспаміны — гэта нават ня ў памяці, — а нешта большае, бо яно ўлілося ў мяне і стала маім нутром. Для мяне сустрэчы зь Сеўрукам былі школай інтэлігентнасьці першых яе будаўнікоў, сапраўдных беларусаў. І хоць ніякіх занатовак не было, пісалася лёгка. Заставаліся толькі дзьве цяжкасьці. Першая — адсутнасьць пісьменьніцкага спрыту. Другая — адсутнасьць альбому з творамі мастака. Чвэрць стагодзьдзя таму зьявіўся буклецік Віктара Шматава на 32 старонках з 35 рэпрадукцыямі, зь якіх толькі дзьве каляровыя, — і ўсё! На гэтае лета быццам абяцаюць вялікую выставу ў Менску.

# Мабільныя вершы

## АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ

### Вільнюс і Вільня

Усё проста, як тостэр. Хочацца паветра.
Трэба выйсьці і пабачыць неба.
Мо тады я зразумею, што ня рэтра
«нашаніўская пара» і Вільня. Глеба
пад нагамі ўжо ня тая. Колькі сьмецьця,
колькі бруду. Калі вочы не ўздымаць угору,
дык нічога ў сэрца не ўварвецца,
не палоніць ужо душу. Няма прасторы
беларускай тут — адно астанкі,
рэшткі Гораду, якога не ўтрымалі,
выпусьцілі з рук увечары, а зранку
тут ужо другой дзяржавы сьцяг узьнялі.
У прадмесьцях мкне жыцьцё, бы ў тунэлі
едзе трактар «Беларусь» з чужымі нумарамі.
Вільня ў тэлевізары ці праз акно гатэлю —
проста Вільнюс, які больш ня з намі.
Але калі адчуваеш Вострай Брамы
блізкасьць,
калі крочыш паўз старыя сходы
ці гартаеш у кнігарні вершаў нізку,
ты глядзіш на Вільню, як на стода.
Зноў рамантык, і хоць гэта так наіўна,
мроіцца, што яшчэ будзем разам.
І, у Беларусь вярнуўшыся, актыўна
ты змагаешся за волю і ня верыш у паразу.

### Зіма. Прадмесьце Бэрліна

У далечы блішчэецца Бэрлін,
У шыбу дзьме балтыйскі вецер.
Сяджу адзін у хаце між ялін.
І ад сябе ня ведаю, куды
Падзецца.

Надвор'е кепскае ўжо каторы дзень.
Абрыдла ўсё — і дэпрэсьняк ў навінах,
І шмат разоў прачытаны Вэрлен,
І нават шчэ ня вызначаны кандыдат
Адзіны.

Такая хэнць зьмяніць гэты настрой,
Паверыць, мабыць, што ня ўсё так дрэнна,
Альбо калі так кепска, дык хаця б парой
Хай неба разьвіднеецца і не грыміць
Страшэнна.



**АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ** — паэт, аўтар «НН» з 1993 г. Жыве ў Глыбокім. Працуе кампутаршчыкам.

### Сядзячы верш

Сяджу ў карчме, гляджу на сьцяну.
Па ёй паўзе прусак.
Бяру газяцёнку ў руку і б'ю:
«Здохні, маленькі мудак!»

Сяджу на вакзале, гляджу на таблё:
Цягнік свой я прапусьціў.
Спаць толькі лёг, але ё-маё —
Мянцяра разварушыў.

На лаўцы сяджу ў парку. Калі
Ты ўрэшце прыйдзеш, мая
Адзіная і непаўторная. Ты
Склеротык, такая ж, як я.

У U-bahna вагоне я «зайцам» сяджу,
Ды хто тут купляе білет?
Калі кантралёр, дык проста скажу,
Што «дзеняг в кармане нэт».

Ва ўнівэры на пары сяджу,
Нат не адкрыўшы канспэкт,
Пасьля ўчорашняга рандэву,
Са сьветам у мяне дысканэкт.

«Дамашняя кухня», Кіеў. Сяджу,
ты кажаш пра нешта — я ем.
Ты ўсё пра «Пару» або КВУ.
Гэй, льга кулінарных тэм?

Сядзім тут утрох. Проста сядзім,
Мысьлім, як бавіць час.
Гарэлкі мы маем на лык адзін,
Як маеш, дык просім да нас.

У «Weeklies» сяджу. Стакгольм начны
Амаль што такі, як Менск.
Толькі замест «Спасіба, нет» ты
Кажаш мне міла «No, thanks».

Глыбокая ноч. Глыбокае. Я
Сяджу, уключыўшы ноўтбук.
Пішу гэты верш. Змрок, цішыня.
І толькі па кляве стук.

### Падарожныя імпрэсіі

Наступны прыпынак — Навадруцак.
Дзе гэта? Халера яго ведае.
У тэрмомэтры ўверх іртуць
Уздымаецца. Тэмпэратуру мераю.

Катар, кашаль — грып няйнакш.
Люты за акном лютуе.
Інтэрнэт. «Velcom». «Белпаку» fuck
На экране манітора пакажу я.

Сёньня чэцьвер. Сьнег. «НН» яшчэ
Не дайшла да скрынкі, а я не даехаў.
«Не дайшла» НН да тых, хто ля мяне
Вочы пагрузіў у «Саўбелію».

Паазер'е белае, як сон.
Той, каторы йграе так па-беластоцку.
Ды ня тую музыку наш паўпусты вагон
Слухае. Гучаць Піліп і Стоцкая.

Ну непаэтычна гэта, не?
Неяк ну зусім ня вяжацца з настроем.
Адчыняю ноўтбук, і гучыць цяпер
Для ўсяго вагона Воюш.

Тыя, хто «Саўбелію» чытаў, і то
Вочы адарвалі, каб услухацца ў словы.
Мо і іх працяне веліч і цяпло
Самай пекнай у сьвеце мовы!

## АДАМ ГЛЁБУС



### Сучасьнікі

#### 1994. Арлоў і формула

Скажы, з кім п'еш, і я скажу, хто ты. У Гур'я Арлова, камэрцыйнага дырэктара маскоўскага выдавецтва «Радуга», формула вызначэньня людзей была падобная, але грунтавалася выключна на асабістым вопыце. «Я — чалавек гарэлачны. Я — расеец, і, як кожны сапраўдны расеец, люблю водаўку. А ты які напой любіш?» «Гарэлку!» — сказаць расейцу, што не люблю гарэлкі, я ня змог. Ну-у-у, я яе люблю, паважаю і не ўжываю, апошнім часам. Толькі пра гэта я ня стаў казаць Гур'ю Арлову. Гур'я ўсьцешыў мой ілжывы адказ. «Вінныя, піўныя, джынавыя людзі — таксама людзі, але я паважаю гарэлачных. Я сам чалавек гарэлачны і люблю да сябе падобных. А больш за ўсё я не паважаю цьвярэзьнікаў. Я іх проста ненавіджу…» Гуры піў астуджаную ў маразілцы «водаўку», заядаў чырвонай ікрой з блінамі і кляў цьвярэзьнікаў. Я піў чыстую ваду, слухаў Гур'я і прымерваў ягоную тэорыю на прысутных… Вось чалавек кававы, а той — кісельны, гэты — гарбатны, тая — малочная, побач — вяршковая…

#### 2004. Дэлёз і перамовы

Улада пэрыядычна патрабуе ад літаратараў і мастакоў апраўданьня і вытлумачэньня сваіх агрэсіўных дзеяньняў. Самае простае для творцаў — пагадзіцца на супрацоўніцтва з уладамі, але гэткія пагадненьні адразу ж касуюць свабоду творчасьці, а праз нейкі час і самога творцу, ператвараючы яго ў чыноўніка ці рамесьніка. Першы зь вялікіх мастакоў, хто выйшаў з поля зроку ўладаў, а дакладней, ніколі не ўваходзіў у небясьпечнае поле, — Вінцэнт Ван Гог. Я ня ведаю, хто кіраваў Галяндыяй у часы напісаньня карціны «Бульбаеды», як ня ведаю, які генэрал ці палкоўнік цараваў на высьпе Таіці, калі там маляваў Поль Гаген… Больш за тое, я і ведаць не хачу. Мне настолькі абрыдлі ў падручніках па гісторыі кепскія партрэты рознакалібэрных чалавеказабойцаў у вайсковай форме, што я не магу пагадзіцца нават з даволі разумнай ідэяю Жыля Дэлёза пра неабходнасьць весьці з уладаю нейкія там перамовы. Пераканаены, людзі культурныя мусяць грэбліва ставіцца да заўсёды лжывай улады.

*Напісаў 3.01.2005, 14:00.*

### НОВЫЯ КНІГІ

**Беларуская нацыянальная валюта: праблемы й пэрспэктывы: Матэрыялы канфэрэнцыі 30 лістапада 2003 г.** / Рэд. В.Вячорка. — Менск: Цэнтар «Супольнасьць», 2004. — 144 с. 299 ас.

**Голуб Ю. Брама зімы** / Рэд. Н.Семашкевіч. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 120 с. 1200 ас.

У чацьвёрты зборнік паэзіі зэльвенскага літаратара акрамя вершаў уключана паэма «Знакі».

**Ермашкевіч Б. Навучаньне зямлёй** / Рэд. і прадм. Ю.Голуба. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 135 с. 300 ас.

**Здановіч І. Рупліўцы зь Беларускага нацыянальнага адраджэньня Пружаншчыны: Грамадзка-літаратурны даведнік.** — Пружаны, 2003. — 144 с.

Кніжка-даведнік складаецца з артыкулаў пра людзей, чый жыцьцёвы лёс так ці інакш зьвязаны з Пружаншчынай.

**Климов А. Тени,** — Санкт-Петербург: Амфора, 2005. — 186 с. 500 ас.

**PROдизайн: Сборник. Вып 13. Rzecz Pospolite** / Аўт.-уклад. З.Сурскі, В.Голубеў. — Менск: ГА «Беларускі саюз дызайнэраў», 2004. — 84 с., іл. 1200 ас.

Нумар прадстаўляе ўсе падзеі ў сьвеце дызайну летась, а таксама аналітычныя артыкулы па прафэсійных, адукацыйных і юрыдычных аспэктах дызайн-дзейнасьці.

**Сяргей Лескець**

## АЛЯКСАНДАР ВОРВУЛЬ



# Слоўнік скептыка

**Раб** — чалавек, які марыць не пра свабоду, а пра ўласных рабоў.

**Радыкал** — кансэрватар, які страціў працу.

**Раззлаванасьць** — гэта калі ты ня толькі ня маеш рацыі, але і разумееш гэта.

**Размова ў сьне** — самы верны спосаб прымусіць жонку слухаць вас уважліва.

**Разьведчык** — чалавек, які лепей адзін раз падслухае, чым сто разоў пачуе.

**Раіцца** — шукаць пацьвярджэньня прынятай лініі паводзін.

**Рай** — месца, дзе няма будзільнікаў, панядзелкаў і начальнікаў.

**Рак** — найшырэйшы кругагляд пры найвузейшым сьветапоглядзе.

**Рамантык** — чалавек, які лічыць, што ў яго няма ворагаў.

**Раніца** — частка сутак, калі зайздросьціш беспрацоўным.

**Расея** — там, дзе сканчаецца асфальт.

**Раскаяньне** — боязь помсты.

**Распрацоўка** — стварэньне рэчаў, якія склада на вырабляць і амаль немагчыма абслугоўваць.

**Распуста** — сэкс, у якім ты ўдзелу не бярэш.

**Ратвэйлер** — сабака, тупейшымі за якога могуць быць толькі яго гаспадары.

**Рахунак банкаўскі** — рэч, якая замінае любіць падатковую інспэкцыю.

**Рацыяналізм** — гэта калі ня траціш сілы на іх аднаўленьне.

**Рашэньне жаніцца** — апошняе рашэньне мужчыны, якое ён прымае самастойна.

**Робат** — поўны ідыёт з фэнамэнальнай памяцьцю.

**Роды** — найлепшы выхад з становішча.

**Розум** — гэта калі вочы трымаеш расплюшчанымі, а рот — закрытым.

**Розум жаночы** — сродак схаваць свой характар.

**Рок-н-рол** — вясёлы блюз.

**Рулетка беларуская** — расейская рулетка без патронаў.

**Рэвалюцыя** — намаганьні пакончыць з дрэнным урадам, каб атрымаць яшчэ горшы.

**Рэкляма** — сродак прымусіць людзей мець патрэбу ў тым, пра што яны раней і ня чулі.

**Рэкляма тэлевізійная** — мастацтва ствараць у разумных людзей рэфлексы ідыётаў.

**Рэха** — апошняе слова ў спрэчцы з жанчынай.

# Чужыя на сьвяце лятучых лыжнікаў

Агляд падзей тыдня

З 5 па 13 сакавіка ў аўстрыйскім Гахфільцэне пройдзе чэмпіянат сьвету па біятлёне. Беларускім мужчынам-біятляністам, якіх няма нават у дваццатцы наймацнейшых, дасцца шанец вярнуць страчаныя за год пазыцыі. Аляксандар Сыман, трыюмфатар спрынту ў славенскай Паклюцы, займае 28 радок, Алег Рыжанкоў — 44-ты, а перабежчык-вараг Уладзімер Драчоў — толькі 66-ты. У Кубку нацый мужчынская зборная разьмясьцілася на шостым месцы, а былі залатыя часы, калі беларусаў нельга было сагнаць з п'едэсталу. Так што сусьветнае першынство ў Аўстрыі для нас зноў як апошні бой у логаве ворага.

На мінулым тыдні «беларускія» віды спорту адпачывалі. Аціхла нават хакейная ліхаманка вакол матчу Латвія—Беларусь. Ужо ніхто не выказвае думак выгнаць латвійскія клюбы з Адкрытага першынства Беларусі. 2 сакавіка скончыўся першы этап чэмпіянату, яго выйграла менскае «Юнацтва», і цяпер пачынаецца самае цікавае: ад 6 сакавіка пойдуць чвэрцьфінальныя паядынкі плэй-оф. Айчынным клюбам даецца шанец даказаць латышам на лядовай пляцоўцы, што беларускі хакей лепшы. Напрыклад, магілёўскае «Хімвалакно» сустрэнецца з «Рыгай-2000», што паставіла ў латвійскую зборную цэлых сем гульцоў.

Павісла ў паветры і адстаўка галоўнага трэнэра Міхаіла Захарава. Пастаноўлена, што ягоны лёс вырашыць выканкам фэдэрацыі хакею, пасяджэньне якога пройдзе пасьля 8 сакавіка. Хоць большасьць і спэцыялістаў, і заўзятараў сыходзяцца на тым, што трэба даць трэнэру магчымасьць дапрацаваць да чэмпіянату сьвету-2005, а там — у выпадку чарговага пралёту — прыгадаць усё.

На сусьветнай арэне цягам апошніх двух тыдняў галоўнай падзеяй былі чэмпіянаты сьвету па лыжных гонках і скачках на лыжах з трампліну, якія прайшлі ў нямецкім Абэрсдорфе. Беларусы тут не парушалі спакою — выдзяляецца хіба допінг-скандал зь Дзянісам Вараб'ёвым — і выступілі ціха ды непрыметна. Вылучаецца хіба шостае месца Сяргея Далідовіча ў дуатлоне (каньковы + клясычны ход) на 30 км.

У скачках з трампліну мы таксама на задворках. У мінулую суботу ў камандных спаборніцтвах на вялікім трампліне беларуская зборная заняла апошняе 16-е месца. «Золата» — у зборнай Аўстрыі. Аднак аматараў гэтага відовішчнага віду спорту цікавіла толькі адно пытаньне: ці здолее датэрміновы пераможца этапаў Кубку сьвету Ян Аханэн заваяваць свой другі тытул чэмпіёна сьвету (першы быў у далёкім 1997 г. у нарвэскім Трангайме)? На «малым» трампліне два тыдні таму Аханэн быў трэці, а «золата» заваяваў юны славенскі «конік» Рок Бэнкавіч. Затое ў спаборніцтвах на вялікім трампліне (К-137) фінскаму лыжніку роўных не было. Здавалася, што ў пятніцу ўвесь стадыён хварэў за Аханэна. Трымаў заціснутыя кулакі і аўтар гэтых радкоў.

Але Ян і не сумняваўся ў перамозе: «Меў добрае самаадчуваньне перад спаборніцтвамі і зусім не нэрваваўся. Быў упэўнены, што ўсё будзе добра», — заявіў фін прэсе. Ён нават усьміхнуўся перад другой спробай. Журналісты дзівяцца перамене, што здарылася зь вечна панурым фінам. Па сканчэньні спаборніцтваў ён ахвотна размаўляў з карэспандэнтамі і вельмі часта ўсьміхаўся. Таксама навіной для ўсіх стала запрашэньне Аханэнам на чэмпіянат сьвету жонкі і маленькага сына. Раней Ян слушна лічыў, што жонка на спаборніцтвах — быць бядзе. Цяпер усё па-іншаму: «Вельмі цешыўся, што сям'я назірала за мной».

Захапляючыся трыюмфам фінскага спартоўца, журналісты не шкадуюць эпітэтаў. «Ян высока ўзьняўся па-над лепшымі», — зазначае фінская газэта «Ільта-Санамат». «Аамулехці» так апісвае стан фіна пасьля чэмпіёнскага скачка: «Ян не хаваў эмоцый пасьля перамогі. Пасьля ўручэньня залатога мэдаля ў яго сталі сьлёзы ў вачах, а яшчэ за некалькі дзён да гэтага ён быў заўсёды вельмі паважны і спакойны». Фінскай прэсе можна прыпісаць ура-патрыятызм, але захапляюцца фінам і нямецкія масмэдыя. Мюнхенская «А-Зэт» узнагародзіла яго прозьвішчам «Finnair», праводзячы паралелі ягонага палёту з палётамі фінскае авіякампаніі з аналягічнай назвай. А «Зюдкур'ер» назваў рэпартаж са спаборніцтваў у Абэрстдорфе проста і ляканічна: «Лятаючы фін. Кароль паветра».

Апроч беларусаў, чужымі на гэтым сусьветным сьвяце моцных духам выглядаюць палякі. Па той бок Буга — жалоба. Найлепшыя часы двухразовага чэмпіёна сьвету і нацыянальнага героя Польшчы Адама Малыша мінулі. Ня спраўдзіў надзей ён і гэтым разам, нават не ўзышоўшы на п'едэстал ні на малым, ні на вялікім трампліне. Прычым найбольшыя шанцы былі ў Адама якраз на найбольш прэстыжным 120-мэтровым: ён пасьля першай спробы ішоў трэцім, але самаўпэўнена вырашыў абысьці Аханэна ды нарвэжца Роара Лёкельсоя і жорстка паплаціўся. Пры прызямленьні дапусьціў памылку, якая адкінула яго на 11-е месца. Малыш з тых, хто ўмее прызнаваць свае памылкі: «У другой спробе я вельмі многа захацеў… Цяпер я страшэнна злы. Вельмі шкада сябе».

Зрэшты, праз год на турынскай Алімпіядзе ў Адама будзе шанец вярнуць былую славу. Толькі вось беларусаў мы зноў убачым у найлепшым выпадку ў кваліфікацыі.

**Алег Раявец**




TUX.KABI.SI

**ВОСЕНЬ СПАРТОВАГА БОСТВА. Любоў палякаў да Адама Малыша шчыра можна было назваць словам «культ». Беларусы ніколі так ня ставіліся ні да Вольгі Корбут, ні да Максіма Мірнага. Пасьля шэрагу параз Малыш імкліва траціць пазыцыі і ў спартовай эліце, і ў сэрцах палякаў.**

## СЬЦІСЛА

### Футбольны сэзон пачнецца ў красавіку

Беларускі футбольны сэзон-2005 пачнецца 3 красавіка — так вырашыла Беларуская фэдэрацыя футболу. У гэты дзень пройдуць першыя матчы чвэрцьфіналу Кубку Беларусі. Першы тур чэмпіянату ў вышэйшай лізе запляваны на 16—17 красавіка. Зазначым, што сёлета старт бяруць не шаснаццаць, як у 2004 г., а чатырнаццаць камандаў. Менскае «Тарпэда-СКА» і «Ведрыч-97» не пацягнулі лямкі вышэйшай лігі праз фінансавую нэндзу.

### Польскі «Оскар»

У панядзелак 6 сакавіка ў Польскім тэатры ў Варшаве будзе ўручана прэмія «Футбольны «Оскар»-2004». Узнагарода, заснаваная тэлевізійнай станцыяй «Канал+» і Польскім футбольным саюзам, будзе ўручацца ў 12 катэгорыях: найлепшы гулец, адкрыцьцё году, гол, судзьдзя, найлепшы галкіпэр, абаронца, паўабаронца, форвард, трэнэр, прэзыдэнт клюбу, найлепшы журналіст-газэтчык, найлепшы спартовы камэнтатар году. Самы пачэсны тытул — футбаліст году. За яго будуць змагацца Томаш Франкоўскі і Мацей Жураўскі з кракаўскай «Віслы», гульцы якой маюць найбольшую колькасьць намінацый, а таксама Яцак Кшынувэк зь левэркузэнскага «Баеру». У Інтэрнэце Кшынувэк па-за канкурэнцыяй: за яго кандыдатуру прагаласавалі 78 адсоткаў наведнікаў сайту «Газэты выборчай».

### Кутузаў зачапіўся за п'едэстал

Атрымаўшы перамогу ў гасьцявым матчы над «Брэшыяй», «Сампдорыя» форварда беларускай зборнай Віталя Кутузава паднялася на трэцяе месца ў італьянскім футбольным чэмпіянаце. Генуэскі клюб пасьля 26 тураў мае 44 пункты. Дагнаць дуэт лідэраў — «Мілян» і «Ювэнтус», што за дванаццаць тураў да фінішу вырваўся наперад на 13 пунктаў, — ужо немагчыма. Тут бы трэцяе месца захаваць, на якое таксама паклалі вока «Інтэр», «Палерма» ды «Ўдынэзэ». Бронзавыя мэдалі, апроч грашовага і маральнага задавальненьня, дадуць магчымасьць «Сампдорыі» паспрабаваць увосень свае сілы ў Лізе чэмпіёнаў.

### На Брашаў

З 4 па 6 сакавіка ў Брашаве пройдзе тэнісны матч 1/8 фіналу Кубку Дэвіса паміж зборнымі Румыніі і Беларусі. Асноўныя надзеі беларусаў ускладаюцца на Максіма Мірнага і Ўладзімера Валчкова, другімі нумарамі ў Брашаў адправіліся юныя Ягор Пунтус, Аляксандар Буры ды Аляксей Бяссонаў. Капітан каманды — Андрэй Бяссонаў.

У панядзелак вызначыліся са складам румыны. У адзіночным разрадзе згуляюць Андрэй Павэл і Віктар Ханэску, а парным — Павэл і Разван Сабаў. У пятніцу гульня пачнецца а 13-й па-беларускім часе, у суботу — а 15-й, у нядзелю — а 13-й. АНТ абяцае паказаць усе матчы ў жывым этэры.

Пераможца згуляе ў чвэрцьфінале зь пераможцам пары ЗША—Харватыя.

### Супэр-Марыё сыходзіць

Найвялікшы хакеіст XX стагодзьдзя і ўладальнік «Пітсбург Пінгвінз» Марыё Лем'ё, хутчэй за ўсё, ня будзе браць удзелу ў чэмпіянаце сьвету-2005, што пройдзе ў Вене і Інсбруку з 30 красавіка па 15 траўня. Лем'ё сьцьвярджае, што ня мае аптымальнай формы, тым больш, што сёлета праз лакаўт у Нацыянальнай хакейнай лізе не згуляў ніводнага матчу. «Ня думаю, што для мяне ці зборнай Канады будзе добра, калі ў гэтай зборнай будзе выступаць хакеіст, што не гуляў цэлы год. Я пачуваюся менавіта так. Можа, я яшчэ памяняю рашэньне, але паказаць дастойны хакей ня здолею», — кажа супэрлегенда сусьветнага хакею.

**AP, gazeta.pl/sport, nhl.com, daviscup.org**

ІНФАРМАТАР

# Як выбраць мэблю для дзіцячага пакою

**Тэме абуладкаваньня дзіцячага пакою не надаецца шмат увагі. Але ў нейкі момант яна неспадзявана выклікае цікавасьць і мноства бацькоўскіх пытаньняў. Як правільна падысьці да ўладкаваньня дзіцячага пакою і ў які момант трэба пачаць гэта рабіць, каб потым не было праблем, расказвае прафэсійны дзіцячы псыхоляг АКСАНА СЬВІРЫДАВА.**



— Розныя спэцыялісты па-рознаму глядзяць на дзіцячы пакой. Інжынэры-будаўнікі, напрыклад, зважаюць на слушнасьць падбору мэблі ў пакоі: ёсьць распрацаваныя патрабаваньні да таго, як павінен стаяць і асьвятляцца дзіцячы стол, дзе павінен стаяць ложак ды іншае. Калі ёсьць мажлівасьць зьвярнуцца да такога спэцыяліста, то гэтыя веды будуць вельмі карысныя для бацькоў. У мэдыкаў на першым месцы бясьпека — адсутнасьць таксычных матэрыялаў у аздобе пакою (абавязкова варта ўлічваць, што дзеткі ўсё паспрабуюць ня толькі на колер, але і на смак), вострых рагоў. Любы пэдыятар досыць кампэтэнтна можа пракансультаваць па гэтым пытаньні. Псыхоляг ацэніць пакой з пункту гледжаньня яго ўплыву на разьвіцьцё дзіцяці, бо гэта першы сьвет, дзе ваша малое спазнае і сябе, і навакольле.

**— Што галоўнае — адзін раз падабраць правільны колер пакою або, скажам, купіць 20 ролек шпалераў у запас і пэрыядычна іх мяняць?**

— Галоўнае — ва ўсім кіравацца прынцыпам разумнасьці. Пакой павінен быць створаны менавіта для вашага дзіцяці. Ня варта ў аздобе захапляцца выкарыстаньнем насычаных колераў, бо пасьля вы ўсё роўна напоўніце пакой яркімі цацкамі, кнігамі, адзеньнем. Калі ўсё будзе «мільгаць», гэта можа стамляць, раздражняць малое. Дзіцяці павінны быць дасягальныя яго дзіцячыя рэчы: цацкі, кнігі трэба пакласьці на адным узроўні зь ім, а вось усё, што можна зламаць, сьцягнуць, павінна знаходзіцца вышэй, асабліва калі гэта пакой хлапчука.

Большасьць бацькоў жадаюць стварыць тое, чаго ў іх саміх не было ў дзяцінстве. Галоўнае, чаго ня ўлічваюць бацькі, — тое, што любы дзіцячы пакой перш-наперш прызначаны для дзяцей. Запытайцеся ў настаўнікаў, асабліва пачатковых клясаў, якія часта бываюць дома ў сваіх вучняў, ці шмат дзетак маюць свой пакой? Па маім вопыце, да 30% пазбаўленыя нават дзіцячага кута. А гэта няправільна. Зноў жа, вельмі мала ёсьць бацькоў, якія бяруць дзяцей у краму, каб купіць якую-небудзь мэблю, — а ўжо як мінімум гадоў зь сямі гэта рабіць варта.

**— На што абавязкова трэба зьвярнуць увагу пры ўладкаваньні дзіцячага пакою?**

— Першым чынам трэба ацаніць, якім разьвіваючым патэнцыялам для вашага дзіцяці валодае яго пакой. Малому ўсё роўна, наколькі дарагія і добрыя шпалеры вы паклеіце, галоўнае — мажлівасьць на іх памаляваць. Для гэтага можна прыляпіць на сьцяну лісты ватману, танныя шпалеры, павесіць дошку з крэйдай. Ці ёсьць у пакоі месца, дзе дзіця можа працаваць з плястылінам, фарбамі без пагрозы, што мама яго «ўспушыць» за сапсаваную падлогу?

Дзецям падабаецца «будаваць хаткі». Калі бацькі могуць паспрыяць і зладзіць якія-небудзь хаткі, міні-палаткі, паставіць вялікую скрынку ў пакоі, будзе вельмі добра. І наогул дарослым ня варта забываць, што дзьверы шафаў існуюць для таго, каб на іх катацца, а на шторах вельмі класна вісець. Вядома, трохі пазьней вы растлумачыце дзіцяці прызначэньне гэтых рэчаў, але пакуль яно маленькае, прыйдзецца зьмірыцца з гэтым.

Непажадана ў дзіцячым пакоі пакідаць асабістыя рэчы бацькоў: да некаторага ўзросту гэта нармальна, але чым большае дзіця, тэм больш яго раздражняе бацькоўскае «ўварваньне» ў пакой.

Па вопыце скажу, што чым вышэйшы дастатак бацькоў, тым звычайна большая загрувашчанасьць пакою. Але гадоў да 13 дзіця не ацэніць грашовую вартасьць рэчаў, і на гэтай глебе могуць узьнікаць канфлікты.

Калі ў сям'і двое ці болей дзетак, абавязкова трэба падзяліць «тэрыторыі ўплыву».

**Гутарыў Іван Ідрыдзэ**

## Цэны на мэблю ў Менску

Двухпавярховы драўляны ложак з хвоі, дубу — ад $100.
Высокапавярховы драўляны ложак, з «гарой» — $500—800.
Жалезныя імпартныя ложкі — $500—1300 і вышэй.
Матрац артапэдычны на какосе — $90—130.
Матрац спружынны — ад $100 да 300.
Крэслы — ад $20 за штуку.
Пісьмовы стол — самы просты $50, самы «наварочаны» — $250.
Шафа з паліцамі, шафа для адзеньня — ад $100.
Паліца навясная — каля $70.

KAICA

# Трыюмф казачніка з Клічава

У шахклюбе трактарнага заводу надоечы прайшоў беларускі этап першага ў сьвеце інтэрнэт-чэмпіянату рашальнікаў шахматных кампазыцый. Аўтарытэтнае журы прапанаўвала шэсьць тыпаў заданьняў — двуххадовыя задачы, трохходоўкі, шматхадоўкі, задачы на зваротны і каапэратыўны мат, этуды. За чатыры гадзіны канкурсанты, што зьехаліся з усёй краіны, мусілі разгадаць як мага больш задумак, укладзеных замежнымі аўтарамі ў галаваломкі на 64-клетачнай дошцы.

Спартовае рашальніцтва — даволі маладое адгалінаваньне шахмат. Ставіць рашальнікаў у жорсткія часавыя рамкі даўмеліся гадоў трыццаць таму. Хоць яшчэ ў XIX ст. легендарны амэрыканскі кампазытар Сэмюэл Лойд ішоў у заклады, што разьвяжа любую задачу за некалькі хвілін. Над задачамі ж самога Лойда біліся чэмпіёны сьвету — Вільгельм Стэйніц, Эмануіл Ласкер…

Найлепшымі рашальнікамі, як правіла, аказваюцца самі кампазытары, якія трымаюць у галаве ідэі і тэмы, экстрапалюючы іх на прапанаваныя заданьні.

Вось і ў менскім конкурсе перамог слынны праблеміст, аўтар арыгінальных твораў у сфэры «казачных шахмат» Аляксандар Булаўка. Нарадзіўся і жыве ён у Клічаве; летась ужо выйграваў нацыянальны чэмпіянат па рашэньні шахматных задач і этудаў, а сёлета паказаў амаль фантастычны вынік — 56 балаў з 60. Дастаткова сказаць, што майстар спорту Аляксандар Міхалап, які мае большы досьвед удзелу ў спаборніцтвах (увосень выпраўляўся ў Грэцыю на 47-мы кангрэс шахматных кампазытараў і рашальнікаў), гэтым разам ледзь перакрочыў 50-адсоткавы бар'ер з 33 баламі.

Экспэрты адзначаюць незвычайную інтуіцыю 36-гадовага А.Булаўкі, яго ўпэўненасьць ва ўласных сілах. «Ён многа часу аддае рашэньню шахматных кампазыцый, і вынік гаворыць сам за сябе», — заўважае ягоны зямляк, міжнародны арбітар А.Міхалап.

Пры абмежаваных сродках, адсутнасьці апекі з боку фэдэрацыі шахмат ды спартовых уладаў аматары кампазыцыі зь Беларусі занялі свой «пачэсны пасад між народамі». Паводле рэйтынгу, сп.Булаўка ўваходзіць у сьпіс сямідзесяці найлепшых рашальнікаў сьвету.

**ВР**

## Рашыце задачу

**Ход белых. Мат за 2 хады.**



**Двуххадоўка Gevers'а была адным з заданьняў, прадстаўленых канкурсантам. Паспрабуйце і вы праявіць фантазію (рашэньне можна даслаць на адрас «Каісы» ў тыднёвы тэрмін з дня выхаду газэты). Падказка: чорных трэба паставіць у стан цугцвангу.**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

**7—8 сакавіка** ў клюбе «Вясьнянка» (Менск, пр.Машэрава, 83, 3-і паверх) будзе шахматны оўпэн-турнір для дзяўчынак 1991 г.нар. і маладзейшых. Турнір будзе складацца зь дзевяці партый па швайцарскай сыстэме. Бяз прызу або падарунку ніводную ўдзельніцу з клюбу ня пусьцяць. Запіс — да 18:00 6 сакавіка па тэл. (0172) 50-79-70 (Руслана Іванаўна Мачалава).

ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ

Большасьць чытачоў — за актыўны выступ у цэнтры: 8…e7-e5. Гросмайстар завяршае разьвіцьцё 9. Cf1-e2. Чакаем адказаў на e-mail (nn@ promedia.by, з пазнакай «Kaica»), SMS на нумар 754-04-53 або лістом на адрас «НН». Партыя on line: bychess. narod.ru.

**З.Лыбін — чытачы «НН». Ход чорных.**



ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

## Пятніца, 5 сакавіка

**АНТ, 21.05**

«Жыцьцё як цуд».
Францыя — Сэрбія і Чарнагорыя, 2003, рэж. Эмір Кустурыца.

Трагікамэдыя.

Сэрб Лука марыць пабудаваць чыгунку і дзеля гэтага зьяжджае ў Босьнію. Жонка пакідае яго, а сын трапляе ў палон. Мясцовая міліцыя прапануе абмяняць сына на выратаваную Лукой мусульманскую дзяўчыну Сабаху, але галоўны герой і Сабаха закахаліся адно ў аднаго.

Мэр гарадка, які нюхае какаін на рэйках, шэрая асьліца, што марыць кінуцца пад цягнік ад няшчаснага каханьня, Шэксьпір як кандыдат у першую футбольную лігу — і музыка ад самога Кустурыцы, які зьняў у фільме ўвесь свой «No Smoking Orchestra».

Карціна была прадстаўлена на апошнім Канскім фэстывалі. Па леташніх выніках — найлепшы фільм у беларускім пракаце.

Некаторыя называюць стужку стомлена-паўторнай, большасьць — геніяльнай, а сам Кустурыца ведае, што паміраць лёгка, а жыць складана і што жыцьцё — гэта цуд.

**НТВ, 22.35**

«Шаленства каханьня».
Гішпанія, 2000, рэж. Вісэнтэ Аранда.

Гістарычная мэлядрама.

Вісэнтэ Аранда менш вядомы ў нас, чым Пэдра Альмадовар і Алехандра Амэнабар. Але калі Альмадовар здымае іранічныя постмадэрнісцкія жарсьці, а Амэнабар зь «Іншымі» асвойвае Галівуд, то Вісэнтэ Аранда вырашыў зьвярнуцца да гішпанскай гісторыі.

Любімая гішпанскім народам каралева Хуана здаўна выклікала спачуваньне. Яе каханьне да караля Філіпа Прыгожага здавалася настолькі празьмерным, што яе празвалі Хуанай Шалёнай (пасьля сьмерці мужа Хуана трымала ля сябе ягоны труп — з 1506 па 1509 гады).

Прэміі «Гоя» за найлепшыя касьцюмы, найлепшы грым і найлепшай актрысе Піляр Лопес дэ Аяле. Актрыса таксама атрымала срэбную ўзнагароду Міжнароднага кінафэстывалю ў Сан-Сэбасьцьяне.

## Субота, 5 сакавіка

**СТВ, 20.15**

«Уласнасьць д'ябла».
ЗША, 1997, рэж. Алан Дж.Пакула.

Палітычны трылер, баявік.

Тэрарыст IРА (Брэд Піт) пасьля бою з брытанскімі жаўнерамі хаваецца ў доме амэрыканскага паліцэйскага, ірляндца па паходжаньні (Гарысан Форд). Герой Брэда Піта мусіць набыць ракеты для абстрэлу верталётаў. Паліцэйскі, годны й выдатны сем'янін, не падазрае пра сапраўдную дзейнасьць госьця. Але пасьля таго, як у ягоны дом урываюцца людзі ў масках, сытуацыя мяняецца.

Алан Пакула вядомы сваімі моцнымі і прафэсійнымі карцінамі «Клют» і «Ўся прэзыдэнцкая раць». Нават ня вельмі ўдалыя яго карціны («Справа аб пэліканах») не апускаюцца ніжэй за сярэдні ўзровень.

Брэд Піт і Гарысан Форд — някепская пара, здольная адным сваім удзелам забясьпечыць камэрцыйны патэнцыял фільму. А няпростыя акалічнасьці сюжэту дазваляюць праявіць і акторскія якасьці.

**СТВ, 00.05**

«Асаджаныя».
Італія—Вялікабрытанія, 1998, рэж. Бэрнарда Бэрталючы.

Драма.

Бэрнарда Бэрталючы — прызнаны майстар і геній кіно.

Маладая афрыканка (Тандзі Ньютан) уцякае ў Рым ад палітычных рэпрэсій у сваёй краіне. Яна знаходзіць прытулак у багатым доме музыкі-англічаніна, дзе працуе прыслугаю. Музыка (Дэйвід Цьюліс) жыве замкнёна, толькі дае ўрокі. Для яго існуюць толькі Моцарт, Бах, Грыг. Гаспадар і служанка-госьця амаль што не размаўляюць — але паміж імі зьяўляецца нешта…

## Нядзеля, 6 сакавіка

**АНТ, 21.05**

«Легенды восені».
ЗША, 1994, рэж. Эдвард Цьвік.

Мэлядрама.

Стары бацька (Энтані Хопкінс) расказвае гісторыю пра трох сыноў, іхняе каханьне, вайну і жарсьці. Адна жанчына (Джулія Армонд) сталася нявестаю малодшага брата, каханкай сярэдняга (Брэд Піт) і жонкай старэйшага.

Апэратар Джон Тол надае мэлядраме, дзеяньне якой адбываецца на пачатку XX стагодзьдзя, эпічныя інтанацыі. «Оскар» — апэратару. Намінацыі за гук і працу мастакоў.

## Аўторак, 8 сакавіка

**СТВ, 9.15**

«Тры таўстуны».
Расея, 1967, рэж. Аляксей Баталаў, Іосіф Шапіра.

Казка.

Казачны раман Юрыя Алешы на экране ня толькі не згубіў сваёй захапляльнасьці, дасьціпнасьці і глыбіні, але й набыў новыя якасьці. Злачынна-гратэскная ўлада, дзяўчынка, якую нясуць на эшафот і карнавал вызваленьня — гэта вобразы ня толькі казачныя, але й рэальныя. І фільм ня толькі для дзяцей, але й для дарослых.

**Склаў Андрэй Расінскі**

# 6 сакавіка, 19:00

**Дом літаратара**
(пл.Перамогі, вул.Фрунзэ, 5)

Даведкі:
6490888, 7662425, 4006774



Вялікі сьвяточны сольны канцэрт
# Зьмітра Вайцюшкевіча
прысьвечаны 70-годзьдзю народнага паэта Беларусі
# Рыгора Барадуліна
Таксама удзельнічае Алесь Камоцкі

**Сьпяваем разам з Рыгорам Барадуліным!**

## ВЫСТАВЫ

### Скульптура Беларусі
**Да 13 сакавіка** ў сталічным Палацы мастацтваў (Казлова, 3) працуе найбуйнейшая за апошнія гады выстава скульптуры.

### Прадукты, напоі, упакоўкі
**З 15 па 18 сакавіка** ў НВЦ «Белэкспа» (пр.Машэрава, 14) працуе выстава «Прадукты харчаваньня, алькагольныя і безалькагольныя напоі, абсталяваньне для рэстаранаў, крамаў, бараў». Тамсама ў гэтыя ж дні — выстава «Ўпакоўка і этыкетка — вясна-2005».

### З краіны Зіты і Гіты
**Да 16 сакавіка** ў Нацыянальным мастацкім музэі (вул. Леніна, 20) працуе выстава «Мастацтва Індыі».

### Пра сьвет
**Да 16 сакавіка** ў мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) праходзіць выстава сучаснага беларускага мастацтва «Пра сьвет». Удзельнікі выстаўкі — майстры і вучні катэдры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту культуры і мастацтваў і прафэсара Ўладзімера Рынкевіча.

### Наркевіч-Ёдка
**Да 22 сакавіка** ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры (вул. К.Маркса, 12) працуе выстава, прысьвечаная 100-годзьдзю з дня сьмерці Вітольда Наркевіча-Ёдкі.

### Таўна Кангра
**Да 26 сакавіка** ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Ф.Скарыны, 48) — выстава скульптуры эстонскага мастака Таўна Кангра.

### Нацыянальная бібліятэка
**Да 4 сакавіка** ў аддзеле мастацтваў Нацыянальнай бібліятэкі (вул. Чырвонаармейская, 9) працуе выстава, прысьвечаная 165-годзьдзю Клёда Манэ.
**Да 7 сакавіка** на другім паверсе першага корпусу працуе выстава, прымеркаваная да 70-годзьдзя Рыгора Барадуліна.

### Interbeat. Issue 1
**Да 17 сакавіка** ў кінатэатры «Перамога» (вул.Інтэрнацыянальная, 20) працуе выстава сучаснай фатаграфіі «Interbeat. Issue 1».

## СПАБОРНІЦТВЫ

### Хакей
**3 сакавіка** (чц) у Палацы спорту а 16-й гадзіне адбудзецца матч па хакеі паміж зборнай МУС Беларусі і Расеі. Т.: 203-77-19; 226-99-75.

### Фігурнае катаньне
**4—5 сакавіка** ў Лядовым палацы спорту, што на Прытыцкага, пройдзе Кубак Беларусі па фігурным катаньні (жанчыны, мужчыны).
**4** (пт) пачатак у 16.45.
**5** (сб) пачатак а 13-й.
Даведкі па тэл.: 200-78-29.

## ТЭАТРЫ І КАНЦЭРТЫ

### К/з «Менск»
**3** (чц), 16.00 — рок-опэра для дзяцей і дарослых «Казка пра памерлую царэўну і сем багатыроў».
**3** (чц) — рок-опэра «Юнона і Авось» санкт-пецярбурскага тэатру «Рок-опэра».
**4** (пт) — «Новае рэтра». Канцэрт Ірыны Разумоўскай.
**12** (сб) — канцэрт гурту Стаса Наміна «Цветы».

### ДК Чыгуначнікаў
**4** (пт) — мюзыкл «Капітанская дачка» санкт-пецярбурскага тэатру «Рок-опэра».

### Палац спорту
**5** (сб) — канцэрт гуртоў «Чайф» і «Би-2» «Дагрукацца да нябёсаў».

### Палац Рэспублікі
**8** (аўт) — канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага харэаграфічнага ансамблю «Бярозка».

### Опэра
**3** (чц) — сьвяточны канцэрт «Сусьветныя шлягеры».
**5** (сб) — «Кармэн».
**10** (чц) — «Князь Ігар».
**12** (сб) — «Хаваншчына».
**13** (нд) — «Вясельле Фігара».

### Балет
**4** (пт) — «Карміна Бурана», «Балеро».
**6** (нд) — «Спартак».

### Моладзевы тэатар
**3** (чц) — «Банкрут».
**4** (пт) — «Хітрыкі Скапэна».
**5** (сб) — «Шкляны зьвярынец».

### Моладзевы тэатар эстрады
**3** (чц) — гумарыстычнае шоў «Клоўнстрафобія».
**4** (пт), **5** (сб) — сьвяточная эстрадная праграма «Для вас, каханыя!».

### Музычны тэатар
**3** (чц) — музычнае шоў «Галяктыка каханьня».
**5** (пт) — «Цыганскі барон».
**6** (сб) — «Ноч у Вэнэцыі».

### Тэатар беларускай драматургіі
**4** (пт) — «Мальер».
**5** (сб) — «Чакаецца прэм'ера».
**6** (ндз) — «Чорны квадрат».
**11** (пт) — «Валянціна».

### Тэатар імя Горкага
**3** (чц) — рок-опэра «Анджэла ды іншыя».
**4** (пт) — «Адзіны спадчыньнік».
**5** (сб) — «Перад захадам сонца».
**6** (ндз) — «Опэра жабракоў».
**9** (ср) «Тата, тата, бедны тата…».
**11** (пт) «Сунічная паляна».
**13** (ндз) «Тэрмінова патрабуецца самагубца».

### Тэатар імя Янкі Купалы
**3** (чц) — «Эрык XIV».
**4** (пт) — «Таполевая завея».
**5** (сб) — «Ромул Вялікі».
**6** (ндз) — «Каханьне ў стылі барока».
**7** (пн) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**9** (ср) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**11** (пт), **12** (сб) — «Тутэйшыя».
**13** (ндз) — «СВ».

**Малая заля**
**4** (пт) — «НаЛу».
**10** (чц) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

### Тэатар беларускай драматургіі
**4** (пт), **5** (сб) — «Мальер».
**6** (ндз) — «Чорны квадрат».

### Тэатар-студыя кінаактора
**3** (чц), **4** (пт) — «Выкраданьне Алены».
**5** (пт) — творчая вечарына кінарэжысэра Ўладзімера Арлова.
**6** (сб) — вечар рамансу «Зь любоўю да жанчыны».

### Дом афіцэраў
**11** (пт) — «Забаўны хлус».

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

### Белая вежа (284–69–22)
**3** (чц), 23.00 — «White Tower Party»: dj Top, dj Grizzly.
**4** (пт), 23.00 — dj Mihel, dj Dee.
**5** (сб) 23.00 — dj Mihel, dj Dee.

### Бліндаж (219–00–10)
**3** (чц), 23.00 — dj Egor.
**4** (пт), 23.00 — «Fluorescent Blind Rave».
**5** (сб), 23.00 — «Blind Saturday»: dj Dasha Pushkina, dj Top.

### Bronx (288–69–22)
**3** (чц), **5** (сб), 23.00 — dj-bar.
**4** (пт), 22.00 — жывая музыка.

### Графіці (251–87–54)
**3** (чц), 20.00 — вечар аўтарскай песьні. Канцэрт Аляксандра Баля.
**4** (пт), 20.00 — вечар рокавай музыкі. Канцэрт групы «Ворацень».
**9** (сер) 20.00 — вечар джазавай музыкі. «Яблычная гарбата».
**10** (чц) 20.00 — вечар аўтарскай песьні. Мікалай Анісімаў.
**11** (пт) — канцэрт гурту «Калахары».

### Гудвін (226–13–06, 626–13–03)
**3** (чц), 20.00 — жывая музыка.
**5** (сб), 21.00 — жывая музыка.

### Лео
**11** (пт) — канцэрт гурту «Індыга».

## КІНО Ў МЕНСКУ

### Нямецкія рэжысэркі
**З 1 па 11 сакавіка** ў менскім кінатэатры «Перамога» праходзіць кінапраграма «Нямецкія жанчыны-рэжысэры», прымеркаваная да сьвята 8 Сакавіка.
Да паказу заяўлены наступныя карціны: «Нідзе ў Афрыцы», «Па той бок цішыні» Караліны Лінк, «Прасьвятленьне гарантавана» Дорыс Дзёры, «Салямон — чалец гітлерюгенду» Агнэшкі Холанд, «Сьвінцовыя часы» Маргарэт фон Троты, «Дэйлі Чыкен» Лілі Гротэ.
Пачатак фільмаў а 19-й.

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Авіятар» (прэм'ера, 2с) **4—6** (пт—ндз) 13.30 (іл), 16.50, 20.00.
«12 сяброў Оўшэна»: **4** (пт) 16.30, 18.50, 21.10; **5, 6** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30, 18.50, 21.10.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Прафэсіяналы»: **4** (пт) 21.10; **5, 6** (сб, ндз) 14.00, 16.30, 21.10.
«Выбух на досьвітку»: **4** (пт) 15.00, 19.00 (іл); **5, 6** (сб, ндз) 19.00.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Нью-ёрскае таксі»: **4** (пт) 17.00, 21.00; **5** (сб) 17.00 (іл), 21.00; **6** (ндз) 19.00, 21.00.
«Паглядзі на мяне»: **4, 5** (пт, сб) 19.00; **6** (ндз) 17.00 (іл).
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Авіятар» (прэм'ера, 2с): **4** (пт) 14.00, 17.10, 20.30; **5, 6** (сб, ндз) 14.00 (іл), 17.10, 20.30.
**«Масква»** (203-14-48)
«Авіятар» (прэм'ера, 2с): **4** (пт) 17.30, 20.30; **5, 6** (сб, ндз) 14.10 (іл), 17.30, 20.30.
**«Мір»** (288-22-33)
«12 сяброў Оўшэна»: **4** (пт) 16.50, 19.00, 21.10; **5, 6** (сб, ндз) 14.30 (іл), 16.50, 19.00, 21.10.
«Нью-ёрскае таксі»: **4—6** (пт—ндз) 16.00, 18.20, 20.20.
**«Перамога»** (203-77-66)
«Нью-ёрскае таксі»: **4** (пт, сб) 17.00, 19.00; **5, 6** (сб, ндз) 17.00 (іл).
«Пракляцьце»***: **4** (пт) 21.10; **5**, **6** (сб, ндз) 19.00, 21.00.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Прывід Опэры» (2с): **4** (пт) 18.30; **5**, **6** (сб, ндз) 14.10, 18.30.
«Эўратур»***: **4—6** (пт—ндз) 21.00.
«Падводная братва»: **4** (пт) 12.40, 16.40; **5**, **6** (сб, ндз) 10.20, 16.40.
**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«12 сяброў Оўшэна»: **4** (пт): 13.30, 18.30; **5**, **6** (сб, ндз) 11.00 (іл), 18.30, 21.00.
«Апантанасьць»: **4** (пт) 11.00, 15.50, 21.00; 5, 6 (сб, ндз) 13.30, 15.50.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

### Белдзяржцырк
**Ад 29 студзеня** — «Унікальныя жывёлы з Аўстраліі».

### Опэра
**6** (нд), 11.30 — «Кот у ботах».

### Тэатар юнага гледача
**5** (сб), **13** (нд) «Папялушка».
**6** (нд) «Паліяна».
**10** (чц) «Тарас на Парнасе».
**11** (пт) «Маленькія трагедыі».
**12** (сб) «Маленькі лорд Фаўнтлерой».

### Тэатар імя Янкі Купалы
**13** (ндз), 11.30 — мюзыкл «Афрыка».

### Тэатар імя Горкага
**13** (ндз), 11.00 — «Джэльсаміна ў краіне лгуноў».

### Кіно для дзяцей
**«Аўрора»**
«Агент Кодзі Бэнкс»: **4** (пт) 14.30; **5, 6** (сб, ндз) 12.00.
**«Берасьце»**
«Два браты»: **5, 6** (сб, ндз) 11.50.
**«Дружба»**
«Бэйб-2: парася ў горадзе»: **4** (пт) 12.00; **5, 6** (сб, ндз) 11.00.
«Мур-р-лі»: **4** (пт) 14.00; **5, 6** (сб, ндз) 13.00.
**«Масква»**
«Гарэзы» («Выхадны — усёй сям'ёй!»): **6** (ндз) 12.30.
**«Мір»**
«Тайная крэпасьць»: **5, 6** (сб, ндз) 13.30.
**«Піянер»**
«Карлік Нос»: **4** (пт) 11.00.
«Чатыры таксісты і сабака»: **4** (пт) 14.30; **5, 6** (сб, ндз) 12.10.

«MASTER RECORDS»
**Кіно на DVD**

### «Чароўная краіна»
Драма, ЗША—Вялікабрытанія, 2004, рэж. **Марк Форстэр.**
У ролях: **Джоні Дэп, Кейт. Уінсьлет, Джулі Крысьці**
Джэймс Бары піша «Пітэра Пэна» і не жадае сталець, удава з трыма дзецьмі, раўнівая жонка — і адна чароўная краіна на ўсіх…

### «Мадыльяні»
Драма, ЗША—Францыя—Нямеччына—Італія—Вялікабрытанія—Румынія, 2004, рэж. **Мік Дэйвіс.**
У ролях: **Эндзі Гарсіа, Эльза Зільбэрштэйн, Уда Кір.**
Драма жыцьця, каханьня і сьмерці знакамітага мастака.
Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08

*Творчая гасьцёўня "Маладзік"*
**12 сакавіка 2005**
**16:00**
Вялікі канцэрт барда
**ЗЬМІТРА СІДАРОВІЧА**
**ВЯРТАНЬНЕ Ў КРАІНУ ТАЛЕРАЎ**
*Менскі Палац дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41)*
*Кіналекцыйная заля*
*Праезд трамваямі № 3,4,5,10 да прыпынку "Палац моладзі"*
**кошт квітка- 3000р.**
Даведкі і квіткі па тэл. 262-02-90

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Хлопчык, лётчык, мільярдэр




**«Авіятар»** («Aviator»)
ЗША—Японія—Нямеччына, 2004, каляровы, 170 хв.
**Жанр:** Біяграфічная драма
**Адзнака:** 7 (з 10)

Калі беларускі хлопчык марыць палятаць зь лётчыкам, убачыць зоркі і небажыхара Сталіна, то амэрыканскі хлопчык сам сабе лётчык, зорка і рэжысэр.

Марціна Скарсэзэ заўжды цікавілі «сьвятыя апантаныя», якія выпадаюць з грамадзтва — і сьцьвярджаюць гэтым грамадзкія правілы. Галоўны герой «Авіятара» — Говард Х'юз — легенда Амэрыкі, яе «найвялікшы палюбоўнік». Мільярдэр, лётчык, кінапрадусар, які кінуў выклік карпарацыйнай студыйнай сыстэме і самастойна здымаў фільмы, у тым ліку клясыку — батальных «Анёлаў апраметнай» і гангстэрскі фільм «Па-за законам». Апантаны авіятар, які імкнуўся рабіць самалёты ўсё лепшымі і лепшымі. Параноік, які баяўся мікробаў і запіраўся ў пакоях.

Галівуд дараваў дзікунскі выклік правілам — і на стагодзьдзе Х'юза адгукнуўся «Авіятарам» зь Леанарда Ды Капрыё ў галоўнай ролі.

Актор грае існасьць, вобраз, гіганта думкі, летуценьніка з воўчаю хваткай, пасьпяховага рызыканта, камяк энэргіі. Зорка «Тытаніка» дэманструе, што здольная ня толькі прыгожа танцуць, але й зьзяць акторскай няўрымсьлівасьцю, выбухаць нэрвовым неспакоем і быць сталёвай спружынай.

У фільме героі мала нагадваюць сваіх прататыпаў, але фільму гэта не замінае. Так, Кейт Бланшэт сыграла зорку 1930-х Кэтрын Хэпбэрн. Актрыса спачатку была напалоханая такой прапановай, бо паўтарыць міт вельмі няпроста. Але яна яго й не паўтарала — яна іграла пачуцьці, думкі й жарсьці сваёй гераіні — і гэтаму верыш.

Скарсэзэ палемізуе з «Грамадзянінам Кейнам» — найлепшай амэрыканскай карцінай і квінтэсэнцыяй амэрыканскага духу. Калі грамадзянін Кейн — апантаны бізнэсовец, які прагне ўлады й грошай, здраджвае дзіцячым марам і набівае палац антычным мастацтвам, то Говард Х'юз — бескарысьлівы рызыкант, згодны паставіць на карту ўсё дзеля сваёй мары, чалавек, які будуе будучыню, а не кланяецца мінуламу, шалёнец, якому дастаткова бутэлькі малака.

«Авіятар» — біяграфічны фільм і «батальны» жанр («Анёлы апраметнай»), «салённае» эстэцтва галівудзкіх вечарынак і мюзыкл сьпеваў, і «страшылка» параноі. А замеры жаночых грудзей цыркулем у цэнзурным камітэце — зьдзеклівая камэдыя нораваў.

Карціна намінавалася на адзінаццаць «Оскараў», атрымала прэміі ў наступных намінацыях: за найлепшую жаночую ролю другога пляну — Кейт Бланшэт, за мантаж — Тэльма Скунмэйкер. «Оскарамі» адзначаны мастакі і дэкаратары (Дантэ Фэрэці і Франчэска Лая Ск'ява) ды мастак па касьцюмах (Сэндзі Паўэл).

Фільм таксама атрымаў тры «Залатыя глёбусы» за найлепшую драму, галоўную мужчынскую ролю і музыку (кампазытар Говард Шор).

Беларускі верш «Хлопчык і лётчык» мае мала каму вядомы працяг. Хлопчык просіцца на вайну і з асалодай расказвае, як ён будзе трушчыць варожыя косьці і праліваць драпежную кроў, бо «дарослы ўжо». Амэрыканскі хлопчык завяршае стомлены эпас кінакарціны назойлівай фразай пра будучыню і палахлівымі дзіцячымі ўспамінамі.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Уваходзіць і сыходзіць



Пад электаральную кампанію Казуліна трэба ствараць новую гістарычную школу, піша фэльетаніст **Лёлік Ушкін**.

Цягам апошніх гадоў у Беларусі панавалі дзьве канцэпцыі сучаснай гісторыі — апазыцыйная і афіцыйная.

Апазыцыйныя Плютархі разглядаюць сёньняшні рэжым як аўтарытарны зыгзаг, які ў выніку ўнутраных супярэчнасьцяў і замежнага націску раней ці пазьней хрэсьнецца. Пасьля гэтага Беларусь падключыцца да ўнівэрсальнага працэсу, якім крочыць усё чалавецтва.

«Дэбілы! — кажуць афіцыйныя гісторыкі. — Беларусы даўно ў тых працэсах. Прычым ня хто іншы, як прэзыдэнт, вярнуў нас у гэтую каляіну пасьля дэмакратычнага зыгзагу пачатку 1990-х». Што да міжнароднай ізаляцыі Менску, то гэта часовыя праблемы стыкоўкі, амаль як «Windows XP» ня бачыць сканэра «Epson-1250». Аднак вы ж ня выкінеце праз гэта сваё жалеза. Проста пачакаеце, пакуль знаёмы Біл Гейтс сумясьціць сыстэмы.

Пакуль згаданыя школы грызьліся, набрала моц новая — «школа эфэктыўнасьці». Калюмбамі яе сталі лукашэнкаўскія тэхнакраты, якія перабеглі ў апазыцыю.

Тыповым адэптам новай плыні зьяўляецца сп.Казулін. У сваім нашумелым інтэрвію «Народнай волі» ён прапануе разглядаць эру Лукашэнкі ня комплексна (дыктатура або вэртыкальнае народаўладзьдзе), а як дзьве цалкам розныя фазы.

Першая фаза — калі Лукашэнка праводзіў эфэктыўную палітыку на карысьць грамадзтва. Зразумела, што ў гэты час Казулін быў разам з бацькам. Другая — калі Лукашэнку перакліналава на тое, каб праводзіць неэфэктыўную палітыку. Таму Казуліна «папрасілі».

Гэта цікавае і вельмі пэрспэктыўнае слова ў гістарычнай навуцы.

Як дэманструе прыклад Грузіі і Ўкраіны, лідэрамі аксамітных рэвалюцый становяцца былыя саноўнікі. Так што кожнае пасяджэньне Саўміну Рыгоравіч можа сьмела пачынаць біблійнай цытатай: «Адзін з вас (добра яшчэ, калі адзін) здрадзіць мне».

Аднак перад тым як беларускі Ючанка атрымае Сахараўскую прэмію за скіданьне апошняга дыктатара Эўропы, яму прыйдзецца трымаць базар, чаму ён нейкі час верай і праўдай прыслужваў гэтаму самаму тырану.

Якраз тут на дапамогу і павінна прыйсьці тэорыя эфэктыўнасьці. Адпаведна ёй, дыктатура настала ня ўвосень 1996 г., як наіўна лічылі раней, а сэкунда ў сэкунду ў той момант, калі згаданы мэнэджэр атрымаў пендаля з Карла Маркса, 38.

Пакуль, праўда, канцэпцыя вельмі рыхлая і мае свае слабыя месцы. Ахілесава пята «эфэкцыянізму» — пункты біфуркацыі парадыгмаў учынкаў Лукашэнкі ад эфэктыўных да неэфэктыўных.

Тое, аб чым сёньня вяшчуе Казулін, раней казалі Чыгір, Віньнікава і нават Ціцянкоў: яны таксама паверылі маладому прэзыдэнту, таксама прыйшлі ў ягоную каманду і супрацоўнічалі зь ім да таго часу, пакуль прэзыдэнта не пацягнула ў неэфэктыўную палітыку. Пасьля чаго раптам яны пачалі бачыць, што ў краіне каюк з дэмакратыяй.

Праблема ў тым, што кожны са згаданых палітыкаў трапляў у бацькаву апалу ў розны час. Адпаведна, кожны лабіруе свае храналягічныя каардынаты рубікону «эфэктыўнасьць—неэфэктыўнасьць».

Так, напрыклад, паводле Чыгіра згаданы рэсурс вычарпаўся ў бацькі яшчэ ў 1996 г., паводле Лябедзькі яшчэ раней — у 1995 г., а паводле Казуліна — аж у 2003 г., калі Лукашэнка ліквідаваў у БДУ факультэт нетрадыцыйнай мэдыцыны.

Як бачым, супярэчнасьцяў у прыхільнікаў «эфэкцыянізму» ня менш, чым у вядучых БТ, якія намагаюцца давесьці, што РБ — аазіс славянства, хаця большасьць славянскіх нацыяў — сябры ЭЗ.

Аднак да 2006 г. часу шмат, і ніхто не замінае нам распрацаваць мэтадычную базу тэорыі эфэктыўнасьці.

Па-першае, трэба ўвесьці новы гістарычны фактар — катэгорыю «эфэктыўнасьць». Што гэта — гліст, вірус накшталт ВРЗ, форма люнатызму або актывізацыя мозгу пасьля гульні ў хакей? Я асабіста бачу эфэктыўнасьць у духу гумілёўскай тэорыі пасіянарнасьці. Эфэктыўнасьць — згустак энэргіі ў космасе, які трапляе ў цялесныя контуры таго ці іншага палітыка.

Чаму — гэта пакуль няважна. Фішка тэорыі — прапіска файлу эфэктыўнасьці ў целе палітыка мае не статычны, а дынамічны характар.

Цяпер усё становіцца на свае месцы. У 1994 г. флюід эфэктыўнасьці ўсяліўся ў цела АРЛ і ён узяў у каманду Лябедзьку, потым флюід сышоў і Лябедзьку звольнілі, аднак пасьля ён зноў усяліўся — старшынёй праўленьня Нацбанку стала Віньнікава, а рэктарам БДУ прызначылі Казуліна… І гэтак далей — то ўваходзіць, то сыходзіць.

Так што з дэмакратычным алібі ў Казуліна ўсё о'кей. Пачынайце кампанію. Жадаю перамогі, прынамсі дзеля таго, каб убачыць у будучых падручніках гісторыі разьдзел «Закрыцьцё факультэту нетрадыцыйнай мэдыцыны як знак усталяваньня ў краіне рэжыму асабістай дыктатуры».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Эўразьвяз не пакіне адкрыцьцё спадарожнікавага каналу «Беларусь-ТБ» без адказу. Старонка 3.**

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**З форуму «НН»**
Павал | 28.02.2005 | 18:03

**У мінулым нумары пісалі пра лазанкі. Я заблытаўся ў пастаноўцы націску: л*А*занкі ці лаз*А*нкі? І хацелася, каб наступным разам улічвалі такія акалічнасьці.**

Лаз*А*нкі. За падказку дзякуй.

**Уладзіславу Ж.** Заўвагі ўлічым.

**Зьмітру П.** Аб «Прессболе»: падпісвайцеся на выданьні, якія цэніце, купляйце іх. Гэта галоўнае ў нашым становішчы. Пра сытуацыі з выданьнем пастараемся напісаць.

Наступны нумар «НН» выйдзе 18 сакавіка. Віншуем нашых мілых чытачак зь вясною!

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ВІТАНЬНІ

**Дзякуй** Галіне Арцюховай, магазіншчыцы зь менскай крамы «Тарты», за цудоўную беларускую мову. АЛ

КАНТАКТЫ

**Мянчук** (43/170/55), в/а, бяз шкодных звычак, пазнаёміцца зь беларускамоўнай мянчанкай. Магчыма стварэньне сям'і. А/с 6, 220012, Менск

**Беларуская салідарнасьць** — прапаную сумеснае гаспадараньне на зямлі. Уладзімер Хахлун, в.Кавалі, Шаркаўшчынскі р-н, 211926

**Зьменены адрас збору фан-клюбу** беларускай музыкі. Штодацьвер а 18-й чакаем усіх аматараў беларускай музыкі па адрасе: вул.Варвашэні, 8, Менск, (ст.м. «Плошча Перамогі»).

**10 сакавіка** на фан-клюбе беларускай музыкі адбудзецца сустрэча з гуртам «Indiga», а таксама прэзэнтацыя ягонага фан-клюбу. Менск, Варвашэні, 8. Пачатак а 18-й. Уваход вольны.

ПРАЦА

**Пошук працы**: набор, пераклад, выкладаньне, выдавецкія праекты, падрыхтоўка рукапісу, рэдактура, дызайн, распаўсюд, журналістыка, адміністрацыйная дзейнасьць. E-mail: alesknigi@mail.ru

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя, пасьля 17:00. Т.: 235-18-72. Юры

**Прапануем супрацоўніцтва** распаўсюднікам беларускай музыкі. Зьвяртайцеся: т. 649-08-88, 766-24-25 або на адрас а/с 5, 220085, Менск; e-mail: w1979@tut.by

**Запрашаем у падарожжа**

**13 сакавіка** (нядзеля)
**Менск—Сынкавічы—Слонім—Жыровічы—Ружаны—Косава—Менск**. 22000 руб.

**18—20 сакавіка**
**Вільня—Коўна—Трокі**. 38 эўра (уваходзіць праезд, гатэль, віза, страхоўка, інфармацыйнае забесьпячэньне).

**6 сакавіка** (нядзеля)
**Замкі Беларусі: Мір—Наваградак—Любча—Ліда—Ліпнішкі—Іўе—Дуды**. 21000 руб.

Тэл. 279-05-85, 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
карэктарка — Настасься Мацяш
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 3578.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 22.30 2.03.2005.

Замова № 1245.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а